**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ**

**Кафедра перыядычнага друку і вэб-журналістыкі**

РОЎДА
Анастасія Алегаўна

# ЖАНРАВА-ТЭМАТЫЧНЫЯ ДАМІНАНТЫ І СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ СУЧАСНАЙ АРТ-ЖУРНАЛІСТЫКІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА» І ЧАСОПІСА «МАСТАЦТВА»)

Дыпломная работа

Навуковы кіраўнік:
доктар філалагічных навук,
прафесар Галіна Казіміраўна Тычко

Дапушчана да абароны
«____» __________2024 г.
Загадчык кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі,
доктар філалагічных навук, дацэнт С. В. Харытонава

Мінск, 2024

# ЗМЕСТ

**РЕФЕРАТ** ........ 3

**РЭФЕРАТ** ........ 4

**ABSTRACT** ........ 5

**УВОДЗІНЫ** ........ 6

**ГЛАВА 1 АРТ-ЖУРНАЛІСТЫКА Ў СУЧАСНЫМ НАВУКОВЫМ ДЫСКУРСЕ** ........ 8

**1.1. Арт-журналістыка – сутнасць паняцця: тэарэтыка-метадалагічны аспект** ........ 8

**1.2. Жанрава-тэматычныя дамінанты сучаснай беларускай арт-журналістыкі** ........ 15

**ВЫВАДЫ ПА ГЛАВЕ 1** ........ 23

**ГЛАВА 2 СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АРТ-ПУБЛІКАЦЫЙ У БЕЛАРУСКІХ СМІ** ........ 24

**2.1. Стылістычная арганізацыя публікацый культурнага напрамку** .... 24

**2.2. Стыль літаратурна-мастацкай крытыкі ў сучаснай беларускай арт-журналістыцы** ........ 30

**ВЫВАДЫ ПА ГЛАВЕ 2** ........ 35

**ГЛАВА 3 ЖАНРАВА-ТЭМАТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АРТ-ПУБЛІКАЦЫЙ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ ВЫДАННЯЎ** ........ 37

**3.1 Жанрава-тэматычная спецыфіка газеты «Літаратура і мастацтва»** 37

**3.2 Жанрава-тэматычная адметнасць часопіса «Мастацтва»** ........ 50

**ВЫВАДЫ ПА ГЛАВЕ 3** ........ 62

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** ........ 63

**СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ** ........ 66

**ДАДАТКІ** ........ **Ошибка! Закладка не определена.**

# РЕФЕРАТ

**Структура и объем дипломной работы:** 81 страница, 50 источников, 10 приложений.

**Ключевые слова:** АРТ-ЖУРНАЛИСТИКА, ПЕЧАТНЫЕ СМИ, ЖАНРЫ, СТИЛИ, ТЕМАТИЧЕСКИЕ ДОМИНАНТЫ, СПОСОБЫ ОСВЕЩЕНИЯ.

*Объект исследования* – арт-публикации газеты «Літаратура і мастацтва» и журнала «Мастацтва».

*Предмет исследования* – жанрово-тематические доминанты и стилистические особенности арт-журналистики.

*Цель дипломной работы* – выявить темы и жанры, доминирующие в газете «Літаратура і мастацтва» и журнале «Мастацтва», определить их особенности, а также рассмотреть стилистические особенности арт-публикаций.

В дипломной работе были использованы такие *методы исследования,* как контент-анализ, сравнение, индукция, наблюдение, аналогия, описание.

*Полученные результаты и их новизна:* в данной работе представлен анализ текстов современных специализированых арт-изданий – газеты «Літаратура і мастацтва» и журнала «Мастацтва», определены их стилистические особенности, жанровые и тематические предпочтения. Результаты проведенного контент-анализа наглядно иллюстрируют актуальные темы, жанровую и стилевую специфику арт-публикаций и их востребованность аудиторией.

*Область возможного практического применения:* полученные в ходе исследования результаты могут быть использованы при углубленном изучении арт-журналистики Беларуси, для развития данной сферы и повышения её уровня.

Автор работы подтверждает, что изложенный в ней материал правильно и объективно отражает состояние экспериментального процесса, а все теории, методические предписания и понятия, заимствованные из литературы и других источников, сопровождаются авторскими ссылками.

# РЭФЕРАТ

**Структура і аб’ём дыпломнай працы:** 81 стронка, 50 крыніц, 10 дадаткаў.

**Ключавыя словы:** АРТ-ЖУРНАЛІСТЫКА, ДРУКАВАНЫЯ СМІ, ЖАНРЫ, СТЫЛІ, ТЭМАТЫЧНЫЯ ДАМІНАНТЫ, СПОСАБЫ АСВЯТЛЕННЯ.

*Аб’ект* даследавання – арт-публікацыі газеты «Літаратура і мастацтва» і часопіса «Мастацтва».

*Прадмет* даследавання – жанрава-тэматычныя дамінанты і стылістычныя асаблівасці арт-журналістыкі.

*Мэта дыпломнай працы* – выявіць тэмы і жанры, якія дамінуюць у газеце «Літаратура і мастацтва» і часопісе «Мастацтва», вызначыць іх асаблівасці, а таксама разгледзець стылістычныя асаблівасці арт-публікацый.

У дыпломнай працы былі выкарыстаны такія *метады даследавання*, як кантэнт-аналіз, параўнанне, індукцыя, назіранне, аналогія, апісанне.

*Атрыманыя вынікі і іх навізна:* у дадзенай працы прадстаўлены аналіз тэкстаў сучасных спецыялізаваных арт-выданняў – газеты «Літаратура і мастацтва» і часопіса «Мастацтва», вызначаны іх стылістычныя асаблівасці, жанравыя і тэматычныя перавагі. Вынікі праведзенага кантэнт-аналізу наглядна ілюструюць актуальныя тэмы, жанравую і стылявую спецыфіку арт-публікацый і іх запатрабаванасць аўдыторыяй.

*Галіна магчымага практычнага прымянення:* атрыманыя ў ходзе даследавання вынікі могуць быць выкарыстаны пры паглыбленым вывучэнні арт-журналістыкі Беларусі, для развіцця гэтай сферы і павышэння яе ўзроўню.

Аўтар працы пацвярджае, што выкладзены ў ёй матэрыял правільна і аб’ектыўна адлюстроўвае стан эксперыментальнага працэсу, а ўсе тэорыі, метадычныя прадпісанні і паняцці, запазычаныя з літаратуры і іншых крыніц, суправаджаюцца аўтарскімі спасылкамі.

# ABSTRACT

**Structure and scope of the diploma work:** 81 pages, 50 sources, 10 applications.

**Key words:** ART JOURNALISM, PRINT MEDIA, GENRES, STYLES, THEMATIC DOMINANTS. WAYS OF COVERAGE.

*The object of the research* – art publications of of the newspaper «Literature and art» and the magazine «Art».

*The subject of the research* – genre-thematic dominants and stylistic features of art journalism.

*The purpose of the research* – to identify the dominant themes and genres of Belarusian specialized art publications, to determine the features of their coverage, to analyze the topics of publications about the culture of socio-political publications, to consider their genre diversity.

Such *research methods* as content analysis, comparison, induction, observation, analogy, description were used in the diploma work.

*The results obtained and their novelty:* this paper analyses the texts of modern specialised art publications – the newspaper «Literature and art» and the magazine «Art», identifying their stylistic features, genre and thematic preferences. The results of the content analysis clearly illustrate the topical themes, genre and style specificity of art publications and their demand of the audience.

*The area of possible practical application:* the results obtained in the course of the research can be used for in-depth study of art journalism in Belarus, for the development of this sphere and raising its level.

The author of the work confirms that the material presented in it correctly and objectively reflects the state of the experimental process, and all theories, methodological prescriptions and concepts borrowed from literature and other sources are accompanied by the author's references.

# УВОДЗІНЫ

Развіццё перыядычнага друку ў Беларусі аказала значны ўплыў на станаўленне літаратуры і мастацтва. Са з'яўленнем спецыялізаваных выданняў асвятленне працэсу развіцця культуры набыло паслядоўнасць і сістэмнасць: у перыёдыцы шмат месца адводзілася аналізу літаратурнага жыцця, крытычным артыкулам аб творчасці асобных пісьменнікаў, разгляду новых твораў. Друкаваліся дыскусійныя матэрыялы, у якіх аналізаваліся розныя бакі мастацкай творчасці. Такім чынам, развівалася крытыка.

Кожная галіна мастацтва (кінематограф, тэатр, музыка, літаратура і інш.) мае свой непаўторны шлях развіцця, які адлюстроўваўся ў крытычных матэрыялах газеты. Але ўжо прыкладна з 1980-х гадоў вядзецца гаворка пра крызіс мастацкай крытыкі, з кожным годам усё больш абвастраюцца праблемы духоўнасці і захавання культурнай спадчыны. Адбываюцца пэўныя мадыфікацыі, звязаныя з уплывам культуры постмадэрнізму, арыенцірам на заходнія тэндэнцыі, далёкія ад нашага культурнага вопыту, памяншэннем попыту на грунтоўныя крытычныя работы. Жанр рэцэнзіі з кожным годам усё больш трансфармуецца, адасабляецца задача рэкламавання як асноватворная.

Спажывец, у сваю чаргу, незалежна ад вонкавых змен, будзе цікавіцца меркаваннем іншых людзей, экспертаў ці аматараў, бо сённяшні рынак перанасычаны ўмоўнымі «што паглядзець, пачытаць, паслухаць». І ўжо ад аўтараў выдання залежыць, атрымае чытач дакладную інфармацыю пра сучасны стан культурнага працэсу, артэфакты, экспертны аналіз твора мастацтва ці дзейсную натыўную рэкламу.

**Актуальнасць** даследавання. Аналіз матэрыялаў арт-журналістыкі дазволіць вызначыць ролю прэсы ў асвятленні сучасных культурных працэсаў, матывацыю аўтараў і крытыкаў, дакладнасць і правільнасць мовы, распазнаць недарэчнасці і маніпуляцыі. Гэта дапаможа выправіць памылкі і недахопы, удасканаліць агульны ўзровень літаратурных выданняў як неад'емнай часткі сучаснай перыёдыкі.

**Мэта** – выявіць тэмы і жанры, якія дамінуюць у газеце «Літаратура і мастацтва» і часопісе «Мастацтва», вызначыць іх асаблівасці, а таксама разгледзець стылістычныя асаблівасці арт-публікацый.

Для дасягнення пастаўленай мэты ў дадзенай дыпломнай рабоце пастаўлены і вырашаны наступныя **задачы**:

1) прааналізаваць гісторыю развіцця беларускай журналістыкі культурнага напрамку;
2) вызначыць сутнасць паняццяў «арт-журналістыка» і «жанрава-тэматычныя дамінанты»;
3) апісаць дамінантныя плыні ў сучаснай беларускай арт-журналістыцы;

4) вызначыць жанравыя і тэматычныя дамінанты публікацый у выданнях, якія асвятляюць культурную праблематыку;
5) даць аналітычную ацэнку стылістычным асаблівасцям матэрыялаў культурнага напрамку;
6) разгледзець генезіс і тэматычна-змястоўную структуру газеты «Літаратура і мастацтва» і часопіса «Мастацтва».

**Аб’ект** даследавання – арт-публікацыі газеты «Літаратура і мастацтва» і часопіса «Мастацтва».

**Прадмет** даследавання – жанрава-тэматычныя дамінанты і стылістычныя асаблівасці арт-журналістыкі.

У дыпломнай працы выкарыстаны наступныя **метады** даследавання: кантэнт-аналіз, параўнанне, індукцыя, назіранне, аналогія, апісанне.

**Тэарэтычнай** базай даследавання з’яўляюцца вучэбныя дапаможнікі і артыкулы такіх аўтараў, як А.Г. Слука, Г.В. Лазуціна, А.А. Цяртычны, В.М. Крылоў, Т.М. Калядзіч, Ф.С. Капіца, Т.Д. Арлова, Л.П. Саянкова, Г.К. Тычко і інш.

**Эмпірычным матэрыялам** для выканання дыпломнай працы сталі газета «Літаратура і мастацтва» і часопіс «Мастацтва», нумары якіх выйшлі ў перыяд з 1 студзеня 2020 года па 1 мая 2024 года.

# ГЛАВА 1

# АРТ-ЖУРНАЛІСТЫКА Ў СУЧАСНЫМ НАВУКОВЫМ ДЫСКУРСЕ

## 1.1. Арт-журналістыка – сутнасць паняцця: тэарэтыка-метадалагічны аспект

Культура стварае сэнсы, потым гэтыя сэнсы функцыянуюць у культуры, падвяргаюцца інтэрпрэтацыі, у тым ліку праз прэсу. На попыт аўдыторыі на інфармацыю пра сферу мастацкага жыцця СМІ адказалі прадстаўленнем крытычных матэрыялаў на спектаклі, пачалі фарміравацца жанры артыкула і рэцэнзіі, больш шырока і разнапланава сталі адлюстроўваць тэму мастацтва на сваіх старонках спецыялізаваныя выданні. Такім чынам, такі напрамак журналістыкі, як ***культурная журналістыка***, вызначыўся праз яе тэматычную накіраванасць, а фокус пайшоў на мастацтва і творчасць, а таксама на асоб, устаноў і палітыкаў, якія займаюцца пытаннямі культуры, спрыяюць іх развіццю.

Гісторыю развіцця беларускай журналістыкі культурнага напрамку можна ўмоўна размежаваць на два перыяды: да 1990-х гадоў і з пачатку 1990-х па цяперашні час. Першы перыяд характарызаваўся дамінантным становішчам літаратурна-мастацкай крытыкі, у газетах друкаваліся творы беларускіх пісьменнікаў. Асобныя выданні выпускалі літаратурныя дадаткі. У «Савецкай Беларусі» друкаваліся літаратурна-мастацкі часопіс «Радавая рунь» (1924 г.), «Беларуская вёска» – «Чырвоны сейбіт» (1926–1928 гг.). Сярод супрацоўнікаў рэдкалегій было нямала паэтаў і празаікаў: К. Крапіва, П. Глебка, К. Чорны, М. Лужанін, а пазней М. Чарот, А. Дудар, М. Зарэцкі, П. Галавач, У. Гурскі, А. Куляшоў, П. Броўка, М. Чарот, А. Александровіч, Ц. Гартны. Як сцвярджае даследчык Г. Багданава, у XX стагоддзі адбыўся даволі стабільны падзел друкаваных перыядычных выданняў на грамадска-палітычныя (грамадскія) і спецыялізаваныя. На старонках грамадска-палітычных выданняў пра выяўленчае мастацтва пісалі журналісты (крытыкаў толькі зрэдку запрашалі), у спецыялізаваных выданнях часцей друкаваліся крытыкі і мастацтвазнаўцы [2, с. 455].

Першымі сваю патрэбу ў спецыялізаваным выданні закрылі менавіта літаратары: часопіс «Полымя» пачаў выдавацца ў 1922 годзе. На думку навукоўцаў А. Г. Слукі і Н. А. Зубчонак, большасць твораў беларускай літаратуры і літаратурна-мастацкай крытыкі ўпершыню была надрукавана іменна ў «Полымі» і менавіта яно закладвала падмурак выдатных традыцый у нацыянальнай літаратуры, публіцыстыцы, літаратурна-мастацкай крытыцы, выдавецкай дзейнасці. У рубрыцы «Хроніка беларускай культуры», што

звычайна знаходзілася ў канцы часопіса, рэдакцыя распавядала пра творчыя распрацоўкі вядомых паэтаў, пісьменнікаў і мастакоў, пра падзеі ў беларускіх тэатрах, пра даследаванні вучоных-гісторыкаў, пра развіццё выдавецкай справы. Кожны нумар часопіса меў рубрыку «Кнігапіс», у якім чытачы знаёміліся з новымі выданнямі – зборнікамі паэзіі, кнігамі прозы, часопісамі, альманахамі. Значную частку зместу часопіса займала паэзія, ніводны нумар часопіса не выйшаў без крытычнага артыкула [37, с. 160]. Прафесар Г. К. Тычко характарызуе творы літаратурна-мастацкай крытыкі ў «Полымі» як «навуковыя прафесійна выверАныя літаратуразнаўчыя артыкулы вядомых даследчыкаў, у якіх аналізавалася гісторыя нацыянальнай літаратуры, сучасны літаратурны працэс, яго тэндэнцыі і эстэтычныя напрамкі, знакавыя аўтары і творы» [44, 208 - 209].

У жніўні 1923 года пачаў выдавацца часопіс «Маладняк». На яго старонках друкавалася шмат вершаў, п’ес, літаратурных кампазіцый, а таксама артыкулаў, дзе асвятляліся і абмяркоўваліся праблемы гаспадарчага і культурнага жыцця. Тэксты маладнякоўцаў маглі не вылучацца высокім мастацкім узроўнем, але з’яўляліся карысным метадычным матэрыялам для працы камсамольскіх арганізацый. Акрамя паэзіі і прозы ў часопісе пісалі – часта ў вострых і спрэчных артыкулах – пра працу моладзі ў вёсцы і горадзе, дзейнасць і жыццё камсамольскіх ячэек. Працэс згуртавання літаратурных сіл працягнулі часопіс «Узвышша», які пачаў выходзіць у сакавіку 1927 года; літаратурна-мастацкі і грамадска-публіцыстычны часопіс «Нёман» выдаецца на рускай мове з 1945 года; часопіс «Маладосць», што выдаецца з 1953 года.

Па сутнасці, першым спецыялізаваным выданнем, прысвечаным розным галінам мастацтва (не толькі літаратуры), стала газета «Літаратуры і мастацтва». Яна пачала выходзіць 26 лютага 1932 г. Газета з’яўлялася органам Федэрацыі аб’яднанняў савецкіх пісьменнікаў БССР (з чэрвеня 1932 — Аргкамітэта Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР) і Галоўмастацтва БССР. Факт выдання газеты адзначаецца прафесарам А. Г. Слукой як важная з’ява ў грамадскім жыцці рэспублікі, бо сведчыў аб высокім узроўні развіцця беларускай культуры (літаратуры, тэатра, выяўленчага мастацтва і г. д.) [36, с. 173]. У склад рэдакцыі ўваходзілі А. Александровіч, В. Вольскі, І. Гурскі, М. Лынькоў, К. Чорны і іншыя, у той час ужо вядомыя пісьменнікі, вопытныя публіцысты і рэдактары. Рэдкалегія аналізавала ўсе бакі дзейнасці беларускага грамадства і высвятляла месца мастацтва ў савецкай рэчаіснасці, адзначаючы, што яно аказвае ўсё большы ўплыў на насельніцтва, на духоўны стан асобы. Газета мела дакладную пазіцыю: пабудова творчасці пісьменнікаў павінна адбывацца на з’явах і фактах сацыялістычнай рэчаіснасці.

Пасля 1953 г. у савецкай краіне адбыліся значныя змены ў палітычнай і эканамічнай сферах: былі адноўлены разбурэнні, якія засталіся пасля вайны,

быў здзейснены прарыў грамадства на аснове значных дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу таго часу, пра што пісалі і гаварылі ў перыядычным друку штодзённа і вельмі шмат, у тым ліку ў «Літаратуры і мастацтве». А калі ў 1960-х гг. адукацыя ў Беларусі пачала пазбаўляцца нацыянальных рыс, фактарам захавання нацыянальных традыцый і беларускай мовы стала беларускамоўная прэса.

У 1986–1991-я гг. справа дэмакратызацыі і пашырэння нацыянальнай свядомасці беларусаў працягвалася. Як падкрэслівае прафесар А.Г. Слука, перад дзеячамі культуры «ставілася задача абудзіць у беларусаў зацікаўленасць сваім лёсам на аснове гістарычных нацыянальных каштоўнасцей і асваення рэчаіснасці ў адпаведнасці з эпохай перамен, якая пачалася ў Еўропе і СССР» [36, с. 350]. У газеце «Літаратура і мастацтва» ў гэты час на пастаяннай аснове публікаваліся артыкулы пра развіццё нацыянальнай культуры і беларускай мовы, а таксама аб спасціжэнні гуманістычных каштоўнасцей.

У другі перыяд з 1991 па 2005 гг. пасля абвяшчэння суверэнітэту Беларусі СМІ апынуліся ў складаным становішчы. Па-першае, грамадства мела неабходнасць у пабудаванні эфектыўнай камунікатыўнай прасторы, але спажывецкія магчымасці аўдыторыі былі несуадносныя з коштам выданняў, тыражы скараціліся. Як выйсце з крызісу апрабаваны працэс інтэграцыі беларускіх СМІ, новай з’явай у якім з’явілася стварэнне ў пачатку 2000-х медыяхолдынгаў. У літаратурна-мастацкім аб’ядналіся часопісы «Полымя», «Маладосць» і газета «Літаратура і мастацтва». Першае аб’яднанне кантралявалася ўладнымі ідэалагічнымі структурамі, пасля чаго надышла неадназначная рэакцыя грамадства, асабліва творчай інтэлігенцыі. Як піша А.Г. Слука, «кароткі тэрмін дзейнасці літаратурна-мастацкага холдынгу яшчэ не даў чакаемага выніку: тыражы літаратурных выданняў пакуль застаюцца вельмі нязначнымі, і нават традыцыйныя і гістарычна-каштоўныя нацыянальныя часопісы і газеты не могуць выйсці з працяглага крызісу» [36, с. 376–390].

Па-другое, у 1990-я перад спецыялізаванымі выданнямі паўстала задача выжывання ва ўмовах рынку. Так, часопіс «Мастацтва» (раней – «Мастацтва Беларусі») пачаў сваю гісторыю ў 1983 годзе і на той час, у 1980-х гадах, амаль поўнасцю складаўся з навуковых і навукова-папулярных публікацый, мова знаходзілася строга ў межах навуковага стылю, сучасныя праблемы мастацтва абмяркоўваліся рэдка. Таму многімі выданнямі (не толькі «Мастацтвам») быў зроблены акцэнт не на мастацтвазнаўства і мастацкую крытыку, а на больш мабільную арт-журналістыку, як сцвярджае Г. Багданава [2, с. 455].

Для характарыстыкі сучаснага этапу развіцця журналістыкі культурнага напрамку і яе дамінуючых плыняў, даследчыкі звяртаюцца менавіта да

тэрміну ***«арт-журналістыка»***, хаця на сённяшні дзень адназначнай трактоўкі гэтага паняцця не існуе. Вядома, што арт-журналістыка – від творчай журналісцкай практыкі, які аформіўся на мяжы ХХ–ХХI стст. Як сцвярджае навуковец Н. Тачыцкая, «і арт-журналістыка, і літаратурна-мастацкая крытыка рэпрэзентуюць мастацтва, але з той розніцай, што крытыцы ўласцівы грунтоўны аналіз мастацкага або літаратурнага твора, у той час як у журналістыцы аналіз зводзіцца да мінімуму або ўвогуле адсутнічае» [42, с. 61]. Даследчык А. А. Навікова дае азначэнне арт-журналістыцы як вельмі разнастайнаму набору фарматаў, які ўключае ў сябе як традыцыйны рэпартаж з выставы, рэцэнзію на фільм ці кнігу, інтэрв'ю з мастаком, крытычны артыкул ці акадэмічнае эсэ, так і сучасныя фарматы тлумачальнай журналістыкі (рознага роду «карткі», таймлайны, інтэрактыўныя карты, інфаграфіку, папулярныя лекцыі і інш.) [25, с. 85].

Выдзяленне арт-журналістыкі ў асобую творчую галіну звязваюць з росквітам інфармацыйных жанраў, наяўнасць агрэсіўна-рэкламнага кампанента, «азнакамляльны» характар публікацый. Даследчык Н. Тачыцкая піша, што «сёння матэрыялы на культурную тэму ў беларускім друку зводзяцца да таго, каб пазнаёміць чытача з культурнымі падзеямі, дапамагчы сарыентавацца ў тым, куды пайсці і што паглядзець» [42, с. 60]. У сучаснай беларускай арт-журналістыцы можна выдзеліць наступныя плыні згодна з аб'ектам асвятлення і аналізу:

А) **Тэатр.** Таццяна Арлова пісала, што да 90-х гадоў ХХ стагоддзя тэатральная крытыка развівалася ў кантэксце расійскай і ўсесаюзнай, але пры гэтым не згубіла сваю ідэнтычнасць. Тэатральны крытык, асэнсоўваючы і апісваючы тэатральныя факты, тлумачыў чытачу, што атрымалася ў выніку працы сцэнічнага калектыву і ці варта чытачу стаць гледачом [26, с. 54-55].

Што датычыцца сучаснага становішча, даследчык сцвярджае, што тэатральная журналістыка грунтоўна пацясніла на старонках СМІ прафесійную тэатральную крытыку. Журналісцкая ацэнка ўбачанага часам моцна адрозніваецца ад меркавання прафесійнага крытыка, адпаведна рэцэнзаванне спектакля становіцца разнавіднасцю маскультуры. Новае жанравае напаўненне нашай прэсы з перавагай матэрыялаў інфармацыйнага характару цалкам выключае грунтоўны прафесійны аналіз тэатральнага твора і магчымасць зірнуць на сучасны мастацкі працэс ваш шырокім гістарычным кантэксце. Таксама навукоўца акрэслівае шэраг праблем са спецыяльна аплачанымі матэрыяламі: тэатральны водгук ператварыўся ў прадмет куплі-продажу. Больш таго, дарагоўля камандзіровак амаль поўнасцю пакінула без увагі спецыялістаў тэатральную правінцыю [29, с. 37-48].

Сёння тэатральная арт-журналістыка сканцэнтравана ў часопісе «Мастацтва» (галоўны рэдактар Клютчэня Вераніка Іванаўна) і газеце

«Культура» (галоўны рэдактар Кузняцова Наталля Васільеўна), а таксама газеты featured rознага профілю прадстаўляюць сваіх аглядальнікаў. Пасля з'яўлення Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі ў 1957 стала магчыма сістэматычна рыхтаваць нацыянальных тэатральных крытыкаў. Выбітнымі даследчыкамі крытыкі тэатра з'яўляюцца А. Сабалеўскі, Т. Арлова, Л. Ратабыльская, Р. Смольскі. Актыўнымі практыкамі з'яўляюцца Л. Брандабоўская, Т. Абакумоўская, Т. Катовіч, Т. Арлова, Л. Грамыка [26, с. 54-55]. Таксама тэатральныя рэцэнзіі часта друкуюцца ў «ЛіМе» (галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч Чарота).

Б) **Кіно.** Кінакрытыка з'явілася амаль адразу пасля нараджэння кінематографа. Першыя водзывы на кіно ў 90-я гады XIX стагоддзя былі падобныя да анонсаў, іх публікавалі ў газетах. Як сцвярджаюць даследчыкі Л.П. Саянкова і А.В. Сідарэнка, кінакрытыка адразу стала неад'емнай часткай журналістыкі. Першыя ўражанні ад убачанага адлюстроўвалі намер зразумець прызначэнне, сацыяльную знанасць новага віду творчасці. Пра кіно пісалі журналісты, тэатральныя дзеячы, рэжысёры, мастацтваведы, пісьменнікі [32, с. 71].

У Беларусі кінематограф стаў адной з праяў тэхнічнага прагрэсу. У пракаце сталі з'яўляцца фільмы, прывезеныя з Заходняй Еўропы. Е.Л. Бондарава пісала, што тагачасныя газеты расказвалі пра паказ стужак у электратэатрах і пра ўсеагульнае здзіўленне і ўражанне гледачоў [5, с. 56]. Пачатак айчыннага кінавырабу ў 20-х гадах XX стагоддзя спрыяў развіццю спачатку журналісцкай, а пасля і прафесійнай кінакрытыкі. Сёння кінарэцэнзіі рэгулярна публікуюцца ў газетах «ЛіМ» і «Культура», часопісе «Мастацтва». Адзіным спецыялізаваным выданнем пра кіно ў Беларусі з'яўляецца часопіс «На экранах» (галоўны рэдактар Перагудава Людміла Іванаўна). У ім публікаваліся Народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў, Наталля Агафонава, кіназнаўцы Анатоль Красінскі, Нэлі Крывашэева, Антон Сідарэнка, Людміла Саянкова, тэатразнаўца Таццяна Арлова.

В) **Музыка.** Як адзначаецца ў даследаванні кандыдата мастацтвазнаўства А. А. Карпілавай, вытокі беларускай музычнай крытыкі знаходзяцца ў фальклорна-даследчай дзейнасці П. Шэйна, М. Янчука, Е. Раманава, М. Чуркіна, артыкулах М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, прысвечаныя нацыянальнай культуры. Надалей яна развівалася ў двух напрамках – прапаганда музычнага мастацтва і музычнага фальклору. Нараджэнне эстраднай музыкі абумовіла фарміраванне новых напрамкаў у музычнай крытыцы. Каб удасканальваць прафесіяналізм у стварэнні прадукту была створана секцыя крытыкі пры Саюзе кампазітараў Беларусі і спецкурса «Музычная рэцэнзія» ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі [14, с. 56].

У сваёй працы «Музычная критика в пространстве культуры» А. А. Карпілава пісала, што колькасны фактар дамінуе ў сучаснай музычна-інфармацыйнай прасторы, выяўляецца параўнальна невялікая, нават мінімальная наяўнасць цікавых аналітычных публікацый, якія адлюстроўваюць складаны, маргінальны стан нашай культуры. Маладыя музыказнаўцы не ўзнімаюцца ў сваіх артыкулах вышэй за ўзровень прафесійна выкананага, але ўсяго толькі тэарэтычнага аналізу канкрэтнага твора, так і журналісты, якія пішуць пра музыку толькі як пра інфармацыйны аб’ект. Колькасны фактар аб’ёму публікацыі не мае вырашальнага значэння – можна і ў кароткай анатацыі акрэсліць кола аднастайных з’яў, вызначыць месца і значэння канкрэтнага факта ў дадзенай культурнай сітуацыі. З’яўленне бесстаронніх публікацый – досыць рэдкая з’ява ў агульным струмені «добразычлівай рэкламы» і сведчыць аб прафесійным патэнцыяле і асабістай мужнасці асобных прадстаўнікоў музычнай крытыкі. Аднак палемічны запал некаторых матэрыялаў не суправаджаецца дастатковай аргументацыяй і пераканаўчай факталогіяй.

Сучасная музычная практыка ў цэлым звязана з развіццём чатырох відаў музычнай культуры, кожны з якіх атрымлівае асвятленне прафесіі.

Даследчык сцвярджае, што агляд новых з’яў у акадэмічнай музыцы звязваецца з фестывальным рухам, з канцэртамі. Іншых падстаў для з’яўлення матэрыялаў аб новых творах беларускіх кампазітараў становіцца ўсё менш і менш. Прычынай таму з’яўляецца не толькі паступовы «сыход» тэмы сур’ёзнай музыкі са старонак масавых выданняў у «тоўстыя» навуковыя часопісы, але і агульны стан кампазітарскай творчасці. Менавіта апісальнасць пераважае зараз у публікацыях, прысвечаных акадэмічнай музыцы, і тут функцыя крытыка часта бярэ на сябе сам музыкант. У «фестывальнай» тэме ставяцца рознага роду праблемы, напрыклад, статусу такой з’явы, як фальклярызм, у прыватнасці аб замене-падмене аўтэнтычных форм фальклору арганізаваным фальклорным рухам.

На думку вучонага, у працэсу рэстаўрацыі і адраджэння беларускай духоўнай музыкі зусім іншая дынаміка развіцця. Гэтая галіна музычнай культуры наўпрост суадносіцца з маральна-эстэтычнымі пошукамі нашых дзён, але пакуль не знаходзіць адэкватнага па глыбіні і значнасці асвятлення ў крытыцы. У асноўным пераважае інфармацыя пра падзеі штогадовага фестывалю хрысціянскай духоўнай музыкі «Магутны божа» ў Магілёве і пад.

Масавая музычная культура ў сучасным свеце заняла дамінантнае становішча ў сітуацыі стылявога шматмоўя. Яе складаная, разгалінаваная жанрава-стылёвая сістэма (поп- і рок-музыка, джаз і шансон, сцэнічныя і аўдыёвізуальныя формы) прадугледжвае дыферэнцыраваны і прафесійны падыход да апісання і ацэнкі. Тэма масавай культуры займае дамінуючае

месца ў айчыннай прэсе ў параўнанні з іншымі відамі музычнай культуры, што адпавядае рэальнай практыцы. Усе масавыя выданні друкуюць мноства матэрыялаў, напісаных у асноўным журналістамі, а не музыказнаўцамі. І гэта цалкам справядліва, бо ў такога роду матэрыялах важная праява сацыялагічнага і культуралагічнага падыходу. Іншая справа, што не кожны журналіст можа «падняцца» вышэй за канкрэтны факт на ўзровень абагульненняў.

Развіццё сучаснай музычнай крытыкі ў цэлым звязана з ініцыятывай асобных спецыяльных выданняў, а таксама з індывідуальнымі намаганнямі шматлікіх таленавітых аўтараў. А. А. Карпілава асабліва падкрэслівае важнасць арганізавання крытыкі як цэласнага сістэмна арганізаванага музычна-публіцыстычнага асяроддзя, бо неабходны шырэйшыя кантакты з музычнай навукай і найноўшымі яе галінамі, спрашчэнні пазіцый крытыкі ў сістэме вышэйшай адукацыі, сувязь сталічных і мясцовых органаў друку, наяўнасць паўсядзённай аператыўнай публіцыстыкі і, вядома, кантакт з аўдыторыяй [15, с. 57-67].

Г) **Выяўленчае мастацтва.** Даследаваннем мастацкай крытыкі займалася Г. Багданава. У сваім артыкуле «З гісторыі мастацкай крытыкі», яна піша, што сёння беларускае мастацтвазнаўства, у тым ліку мастацкая крытыка, адна з самых перспектыўных і запатрабавальных галін культуры ў грамадстве. Калі Беларусь стала суверэннай краінай, прыйшлося пераглядаць многія старонкі гісторыі культуры, а таксама збіраць і асэнсоўваць мастацкія скарбы, чаго не рабілі ўжо шмат дзесяцігоддзяў. Сёння высокапрафесійных мастацкіх крытыкаў рыхтуюць у Беларускай акадэміі мастацтваў, Беларускім універсітэце культуры, на факультэце журналістыкі БДУ, а таксама ў многіх недзяржаўных ВНУ. Такія выданні, як газеты «Літаратура і мастацтва» і «Культура», часопісы «Полымя», «Нёман», «Маладосць», сталі не толькі летапісам развіцця беларускага выяўленчага мастацтва і архітэктуры, але і школай выхавання мастацтвазнаўцаў і мастацкіх крытыкаў [3, с. 98].

Д) **Літаратура.** Этапы станаўлення і развіцця прафесійнай беларускай літаратурнай крытыкі аналізавала і даследавала Н. Кузьміч. Яна адзначае, што беларуская літаратурная крытыка прайшла дастаткова складаны шлях у сваім развіцці. Але на жаль, напрыканцы XX стагоддзя крытыка паступова страчвае сваю актыўнасць, а ў той час літаратуразнаўства набірае моц. Крытыка на старонках друкаваных выданняў саступае месца літаратуразнаўчым артыкулам, асветніцкім артыкулам і нататкам да пэўных юбілейных мерапрыемстваў. У сучасных умовах у нашай літаратуры роля крытыка зніжана ці проста знікае. Літаратурная крытыка ўжо не ў такой ступені аналізуе і ацэньвае пэўны твор мастацтва, як проста спрабуе прыцягнуць увагу чытача да кніжнай прадукцыі [20, с. 32]. Матэрыялы, якія ўтрымліваюць

крытычныя ацэнкі, змяшчаюцца ў выданнях «Літаратура і мастацтва», «Мастацтва», «Культура», «Полымя».

Можна сцвярджаць, што ў сферы арт-журналістыкі знаходзяць сваё адлюстраванне ўсе акрэсленыя плыні мастацкага жыцця, і што прынцыпова важна, з выкарыстаннем усіх жанраў і форм падачы матэрыялу.

## 1.2. Жанрава-тэматычныя дамінанты сучаснай беларускай арт-журналістыкі

Галоўнае прызначэнне культуры – спрыяць духоўнаму ўзбагачэнню асобы. Як сцвярджае даследчык В. М. Самусевіч, вялікае значэнне набывае працэс інкультурацыі пры дапамозе журналістыкі – культурнай журналістыкі, – якая абавязана забяспечваць культурнай інфармацыяй грамадства, культываваць неабходныя для існавання і духоўнага развіцця нацыі каштоўнасці, фарміруючы ў беларускага соцыуму пэўныя культурныя арыенціры і мадэлюючы сучасную нацыянальную карціну свету, захоўваючы тым самым багацце нацыянальнай культуры. І менавіта праз тэкст чалавек уключаецца ў сетку культурных асацыяцый, уласцівых той ці іншай нацыі, а сэнсам тэкстаў культурнай тэматыкі з’яўляецца выражэнне нейкага *культурнага феномену* [34, с. 24]. Г.В. Лазуціна разглядае *артэфакт* як спецыфічны прадмет і тэму культурна-асветніцкіх тэкстаў. Артэфакт — прадукт чалавечай дзейнасці, які мае духоўнае значэнне, імі могуць з’яўляцца творы мастацтва, навукі, палітыкі, ідэалогіі [22, с. 228].

Спектр культурных фактаў і падзей, а таксама феноменаў і артэфактаў, якія разглядаюцца ў выданнях культурнага напрамку, дастаткова шырокі: сярод іх літаратура, жывапіс, тэатр, кіно, архітэктурная спадчына і многае іншае. **Тэматыка** пры гэтым разнастайная. Гэта і агульныя пытанні культуры (дзяржава і культура, культурная палітыка муніцыпальнай улады і рэгіянальных утварэнняў, праблемы культурнай спадчыны, кадравыя прызначэнні ў сферы культуры, дабрачыннасць), і знамянальныя даты, і ўласна падзеі культурнага жыцця (у абласцях: літаратура, музычнае мастацтва, опера і балет, драматычны тэатр, кіно, тэлебачанне і радыё, архітэктура, выставы, узнагароды і прэміі і інш.). Такім чынам, у культурнай медыяпрасторы актуалізуецца шэраг рэгулярна ўзнаўляльных тэм, вакол якіх факусіруецца ўвага ў дадзены час. Т. В. Шмелёва падкрэслівае, што жыццёвы цыкл падзеі залежыць ад яе грамадскай значнасці, роўна як і амплітуда водгукаў на яе. На падставе гэтага можна казаць аб фармаванні **тэматычных дамінант**, якія актуалізуюцца сродкамі масавай інфармацыі ў цяперашні момант [50, с. 200-207].

Як піша Г. В. Лазуціна, уласцівасць артэфакта аказвацца ў розных сітуацыях, на розных стадыях свайго жыцця абумоўлівае жанравую дыферэнцыяцыю ўнутры культурна-асветніцкай журналістыкі, яе **жанравыя дамінанты**. Першай ідзе сітуацыя яго падрыхтоўкі і прэзентацыі грамадству, другой – сітуацыя асваення яго грамадствам, трэцяй – сітуацыя, пры якой па тых або іншых прычынах актуалізуецца неабходнасць яго выкарыстання [22, с. 230]. Такім чынам, прадстаўляюцца тры напрамкі культурнай праблематыкі, кожны з якіх утвораны некаторым мноствам жанравых мадэляў.

Першая разнавіднасць служыць мэтам арыентацыі ў культурным пласце. Тэма журналісцкіх матэрыялаў у дадзеным выпадку – артэфакт у сітуацыі падрыхтоўкі яго да актыўнага асваення грамадствам. У гэтым выпадку разглядаюцца два жанры – анонс і анатацыя. Як адзначае даследчык Г.В. Лазуціна, **анонс** – гэта папярэдняя аб'ява, якая змяшчае ў сабе паведамленне аб будучай культурнай падзеі (адкрыцці выставы, фестывалю, пастаноўкі, кінапрэм'еры і інш.), каб паведаміць і зацікавіць аўдыторыю, а затым і прыцягнуць яе. Можа быць і кароткім паведамленнем, і самастойным тэкстам, за большым ці меншым праяўленнем аўтарскага «Я». **Анатацыя** дае папярэднія звесткі аб змесце твора. Аб'ектам яе асвятлення з'яўляецца ўжо не падзея, а сам твор, галоўная яе мэта не пераказ і не аўтарская ацэнка таго ці іншага твора, а падрыхтоўка да ўспрымання [22, с. 296].

Анонсы і анатацыі публікуюцца як у спецыялізаваных выданнях, так і ў грамадска-палітычных выданнях у рубрыках, прысвечаных культурнаму жыццю. Пры гэтым выдзяляюцца дамінантныя тэмы ў кожнага выдання. Напрыклад, газета «Літаратура і мастацтва» анансуе падзеі, звязаныя з Саюзам пісьменнікаў Беларусі, грамадска-палітычныя выданні – міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і падобныя буйныя мерапрыемствы, газета «Культура» – культурныя мерапрыемствы сталіцы і афіцыйныя ад Міністэрства культуры.

Другі напрамак працуе для асваення артэфактаў і звязана з сітуацыямі, калі грамадства знаёміцца з новымі прадуктамі творчай дзейнасці чалавека і выпрацоўвае свае адносіны да іх; у ім вылучаюць літаратурна–мастацкую крытыку. Тэма пры гэтым будзе суадносіцца з артэфактам. У залежнасці ад задач, якія ставіць перад сабой крытык, ад выдання, дзе будзе размешчана публікацыя і інш., кожная крытычны матэрыял будзе мець сваё прызначэнне і асаблівасці.

На думку Л. П. Саянковай, у сучаснай крытыцы тыя жанры, якія часцей за ўсё сустракаюцца на старонках спецыялізаваных выданняў аналітычныя элементамі мастацкай эсэістыкі, калі пад апошнім разумець высокі ўзровень аўтарска-асобаснага пачатку: артыкул, творчы партрэт, інтэрв'ю, радзей – рэцэнзія [31, с. 50]. Як адзначае Н. Кузьміч, крытыка, у першую чаргу

літаратурная, існуе ў асноўным у такіх жанравых формах, як аглядны артыкул, рэцэнзія, агляд кніжных навінак, анкетаванне пісьменнікаў [20, с. 32]. Г. В. Лазуціна вылучае рэцэнзію, агляд, мастацтвазнаўчы артыкул і творчы партрэт [22, с. 230].

**Рэцэнзія**. Слова «рэцэнзія» паходзіць з лацінскай мовы і перакладаецца як «прагляд, паведамленне, ацэнка, водгук пра што-небудзь». Вучоныя-літаратуразнаўцы Т.М. Калядзіч і Ф.С. Капіца сцвярджаюць пра дваісты характар рэцэнзіі, якая, з аднаго боку, паведамляе пра факт рэчаіснасці, а з другога – дае яго аналіз. Таму вельмі часта яе адносяць і да інфармацыйных, і да аналітычных жанраў журналістыкі [16, с.44]. Але згодна з традыцыйнай класіфікацыяй, якой прытрымліваецца большасць вучоных (А.А. Цяртычны, Б.В. Стральцоў і інш.), рэцэнзія – аналітычны жанр (ці як класіфікуе А.В. Калеснічэнка – жанр рацыянальнай журналістыкі).

У падручніку даследчыка Ю. А. Крыкунова «Рэцэнзія ў газеце» знаходзіцца наступнае азначэнне: «рэцэнзія – гэта жанр, аснову якога складае водгук (перш за ўсё – крытычны) аб творы мастацкай літаратуры, навукі, мастацтва, журналістыкі і т.п.» [18, с.4]. Прафесар В.М. Крылоў піша, што «рэцэнзія – гэта аналіз і ацэнка асобнага твора і яго праблем» [19, с. 21]. Рэцэнзентам можа быць спажывец – любы чалавек, які азнаёміўся з аб’ектам рэцэнзавання і мае дастаткова ведаў для аналізу твора мастацтва; эксперт – кампетэнтны спецыяліст, напрыклад, навуковец, выкладчык, тэатральны ці літаратурны крытык і пад. Таксама рэцэнзіі пішуцца на заказ аўтара ці рэалізатара для рэкламы і паляпшэння іміджу прадукту. Але асноўнай задачай крытыка з’яўляецца выражэнне адносін да даследчага твора.

Па аб’ёме рэцэнзіі падзяляюцца на міні-рэцэнзіі і гранд-рэцэнзіі. Міні-рэцэнзія характэрна для прэсы, невялікая па велічыні, сціслая, але насычаная па змесце. Яна пішацца на навінкі мастацтва, літаратуры, кіно, тэатра ці музыкі. Гранд-рэцэнзіі друкуюцца ў спецыялізаваных выданнях, пішуцца вопытнымі аўтарамі, якія глыбока і разгорнута аналізуюць аб’ект. Літаратуразнаўцы Т.М. Калядзіч і Ф.С. Капіца вылучаюць мікрарэцэнзію і калектыўную рэцэнзію. Мікрарэцэнзія прадстаўлена адным-двума (радзей трыма) сказамі, якія адрозніваюць па намінатыўнасці, абазначэнню пазіцыі, моўнай гульні. Гэта разнавіднасць прызначана для публікацыі ў інтэрнэт-выданнях, сацыяльных сетках ці, напрыклад, на адваротным баку кнігі. Калектыўная рэцэнзія больш эксперыментальная форма, якая аднак сустракалася ў часопісах, напрыклад, у «Континенте», «Вопросах литературы». Гэта састаўная публікацыя, якая змяшчае прэамбулу, асобныя водгукі крытыкаў і заключэнне. У такой рэцэнзіі некалькі аўтараў, але адзін аб’ект даследавання.

Рэцэнзія можа ўяўляць сабой ацэнку некалькіх прадметаў мастацтва. У монарэцэнзіі аўтар даволі дэталёва разбірае адзін твор, можа прыгадваць папярэднія работы аўтара ці добра вядомыя. У полірэцэнзіі разгорнута аналізуюцца і параўноўваюцца два і больш аб’екты.

А.А. Цяртычны сцвярджае, што рэцэнзія адрозніваецца ад іншых газетных жанраў перш за ўсё тым, што яе прадметам з’яўляецца не непасрэдныя факты рэчаіснасці, на якіх заснаваны нарысы, карэспандэнцыі, замалёўкі, рэпартажы і да т.п., а інфармацыйныя з’явы – кнігі, брашуры, спектаклі, кінафільмы, тэлеперадачы [43]. Рэцэнзія, як правіла, разглядае адзін-два творы і дае ім адпаведную адзнаку, не ставячы перад сабой іншых, больш складаных задач. У тым жа выпадку, калі журналіст на аснове глыбокага аналізу твора выстаўляе нейкія грамадска значныя праблемы, яго твор будзе хутчэй не рэцэнзіяй, а літаратурна-крытычным артыкулам.

Рэцэнзіі з’яўляюцца і ў грамадска-палітычных выданнях, як газеты «СБ» і «Рэспубліка», і ў спецыялізаваных. Дамінантнымі тэмамі пры гэтым будуць з’яўляцца прэм’еры спектакляў, напрыклад, у Вялікім тэатры оперы і балета, абласных і сталічных акадэмічных тэатрах.

**Агляд**. Прафесар В.М. Крылоў піша, што агляд разглядае сукупнасць твораў сучаснага мастацтва аднаго або некалькіх жанраў (напрамкаў), аналізуе сам працэс, яго заканамернасці і тэндэнцыі за пэўны перыяд. [19, с. 111]. Як адзначае Г. В. Лазуціна, аб’ектам агляду можа паслужыць ланцужок падзей аб’яднаных месцам ці часам, якія ўтвараюць пэўнае сэнсавае адзінства: конкурсы, фестывалі, гастролі творчых калектываў [22, с. 230].

**Артыкул.** Тэрмін «артыкул» паходзіць ад лацінскага «articulus». Першапачаткова яно значыла «сустаў», «член», «часть цэлага». Д. Бекасаў вызначае прызначэнне артыкула ў аналізе актуальных, грамадска значных працэсаў, сітуацый, з’яў і заканамернасцей, якія імі кіруюць [4, с. 33]. В. Крылоў жа дае абазначэнне артыкулу як шырокаму полю крытычных работ, якія маюць сваёй мэтай аналіз, абагульненне, ацэнку, тлумачэнне, выяўленне сувязі мастацтва і жыцця [19, с. 68].

В. Крылоў вылучае наступныя асноўныя разнавіднасці артыкулаў: манаграфічныя, тэарэтычныя, юбілейныя, эсэ, палемічныя. Таксама магчыма вылучэнне і іншых відаў, напрыклад, праблемнага артыкула.

а) Манаграфічны артыкул. Ён адрозніваецца ад рэцэнзіі тым, што ў ім даецца аналіз твора ці творчасці пісьменніка ў шырокім літаратурным і грамадскім кантэксце. У артыкуле аналіз вылучаецца аб’ёмам, разгорнутай аргументацыяй, складанай кампазіцыяй. Манаграфічныя артыкулы, аб’яднаныя адзінствам задумы, канцэпцыі і кампазіцыі, утвараюць жанр крытычнай манаграфіі.

б) Праблемны артыкул. Цэнтрам яго знаходзіцца актуальная ідэйная, эстэтычная, маральная праблема. Аўтар праблемнага артыкула не імкнецца з усіх бакоў ахарактарызаваць твор, на які ён абапіраецца, а выбірае аспекты, патрэбныя яму для галоўнай праблемы. Як сцвярджае В. Крылоў, праблемныя артыкулы могуць быць living рознымі па аб’екце, тыпе аргументацыі, форме. Гэта можа быць палемічны водгук на працы па эстэтыцы і тэорыі літаратуры, непасрэднае абгрунтаванне якой-небудзь праблемы. У праблемным артыкуле тэкст выкарыстоўваецца ў асноўным не як прадмет крытычнага даследавання, а як доказ поглядаў крытыка [14, с. 70].

в) Тэарэтычны артыкул. Яго асноўная задача – пастаноўка пытанняў тэорыі на сучасным літаратурным матэрыяле. Тэарэтычны артыкул у найбольшай ступені збліжае літаратурную крытыку з праблемамі тэорыі літаратуры.

г) Юбілейны артыкул абавязкова звязаны з якой-небудзь знамянальнай датай. Ён сканцэнтраваны на выкладанні пазітыўнага ўкладу дадзенага пісьменніка ў культуру або падкрэслівае значэнне дадзенай мастацкай падзеі. Юбілейны артыкул звязаны з традыцыяй пахвальнага слова, пахвальнай гаворкі. Па сваёй жанравай прагматыцы ён, як правіла, дае адзнаку добрых якасцей ушанаванага чалавека, падкрэслівае сучаснае значэнне той ці іншай падзеі.

д) Палемічны артыкул. Асноўным яго прадметам з’яўляюцца іншыя крытычныя выступы. Хоць палемічныя матывы могуць змяшчацца ў любых артыкулах, але нярэдка палеміка служыць і мэтай артыкула на вострым абвяржэнні тых канцэпцый, трактовак, з якімі аўтар спрачаецца.

Асобна вылучаецца літаратурна-крытычны артыкул, які нельга назваць «сучасным» жанрам. Як адзначае Н. Кузьміч, літаратурная крытыка існуе ў асноўным у такіх жанравых формах, як аглядны артыкул, рэцэнзія, агляд кніжных навінак, анкетаванне пісьменнікаў [20, с. 32]. Свайго росквіту літаратурны артыкул дасягнуў у XIX стагоддзі, калі публіка першапачаткова знаёмілася з крытычным артыкулам, а потым ужо чытала сам твор, а самі пісьменнікі актыўна крытыкавалі працы калег.

Г. В. Лазуціна выдзяляе мастацтвазнаўчы артыкул і апісвае яго як журналісцкую апрацоўку дадзеных мастацтвазнаўства. На думку навукоўцы, артыкулы могуць стаць база даных для развіцця гісторыі і тэорыі мастацтва, а літаратурна – мастацкая крытыка ў цэлым з’яўляецца сінхронным мастацкаму працэсу асэнсаваннем яго асноўных з’яў з пазіцый заканамернасцей мастацтва і літаратуры, вынікі якога стымулююць да рэфлексіі прафесійнай супольнасці [22, с. 332].

Артыкулы рэгулярна публікуюць спецыялізаваныя выданні – газета «Літаратура і мастацтва» і часопіс «Мастацтва», тэмы пры гэтым

разнастайныя. Так, газета больш спецыялізуецца на пытаннях літаратуры, у часопісе дамінуюць тэатральная і мастацкая тэматыкі.

**Творчы партрэт**. Як сцвярджае Г. В. Лазуціна, у творчым партрэце прадметам увагі становіцца не толькі творчасць, але і сама асоба мастака. Аўтар павінен адказаць на галоўнае пытанне: у чым сакрэт поспеху гэтага чалавека? На сённяшні дзень часцей за іншых сустракаюцца два віды творчага партрэта гэта ўласна творчы партрэт, у якім аўтар робіць акцэнт на творчай манеры, творчай пазіцыі асобы. Другі від імкнецца да аповеду біяграфіі героя, асоба вылучаючы падзеі, якія аказалі ўплыў на стварэнне ім тых ці іншых артэфактаў [22, с. 332]. В. Крылоў вылучае літаратурны партрэт, цэнтрам якога з'яўляецца ацэнка творчай індывідуальнасці пісьменніка. Існуюць тры кампаненты творчага шляху мастака:

1. Біяграфія
2. Створаны ім мастацкі свет
3. Рэальная рэчаіснасць (кантэкст эпохі і грамадства) [19, с. 113].

Творчыя партрэты публікуюцца толькі ў спецыялізаваных выданнях – у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Полымя» і «Мастацтва», тэмы – жыццё і творчасць дзеячаў розных плыняў мастацтва.

Трэці напрамак змяшчае жанры, «якія выкліканы да жыцця неабходнасцю па той ці іншай прычыне прыцягнуць увагу аўдыторыі да якіх-небудзь з артэфактаў, якія ўжо асвоены грамадствам, уключаны ў яго «культурны пласт» і ў патрэбны момант могуць быць запатрабаваны для выкарыстання» [22, с. 332].

Базавым жанрам у дадзенай плыні з'яўляецца **культурна-гістарычны нарыс**. Г. В. Лазуціна вылучае два найбольш распаўсюджаныя фарматы культурна-гістарычнага нарысу, якія адрозніваюцца адзін ад аднаго суадносінамі аб'ектыўнага і суб'ектыўнага пачаткаў у адлюстраванні артэфактаў. Першы – даведачна-бібліяграфічны нарыс, які часцей за ўсё ўяўляе сабой ужо вядомую інфармацыю. Другі – «пуцявы нарыс» («пуцявыя нататкі»), што нараджаецца ў выніку непасрэднага кантакту аўтара з пэўным пластом «культурнага слою» грамадскага жыцця. Ён змяшчае ў сабе, акрамя аб'ектыўных характарыстык культурных каштоўнасцей, непасрэдныя ўражанні ад кантакту, якія надаюць артэфактам навізну і суб'ектыўную значнасць, паколькі атрыманы менавіта аўтарам, менавіта «тут і цяпер» [16, с. 333 - 334].

У мадэлі трох стадый развіцця артэфакта, якую прапанавала Г. В. Лазуціна, не разглядаюцца некаторыя ўласцівыя для кантэнту газет інфармацыйныя жанры, якія, на думку С.В. Ушаковай, з'яўляюцца самымі рэпрэзентатыўнымі сярод жанраў у журналістаў, што асвятляюць культурную тэматыку. Тут менавіта адзначаюцца даследчыкам навіна, рэпартаж, інтэрв'ю

[45, с. 354]; таксама ў выданнях культурнага напрамку сустракаецца некралог. Як правіла, у матэрыялах інфармацыйных жанраў адлюстроўваецца *падзейны* пласт жыцця грамадства, таму менавіта падзея і выступае тэмай матэрыялу.

**Нататка**. А.А. Цяртычны сцвярджае, што нататка адрозніваецца невялікімі памерамі, у якім выкладаюцца вынікі вызначанага вывучэння прадмета выступу. Звычайна ў такіх не апавядаецца аб глыбіні і ходзе гэтага вывучэння, аўтарскіх эмоцыях і г.д. Галоўнае для нататкі – менавіта кароткі выклад выніку вывучэння, асноўных рысах нейкай з’явы, падзеі, чалавека, праблемы. Прычым гэтыя падзеі, з’явы, праблемы, бакі асобы чалавека павінны выступаць для аўдыторыі як «навіна» – патэнцыйная інфармацыя, якая перавышае тое, што ўжо вядома чытачам [43].

**Рэпартаж.** Даследчык А.А. Цяртычны адзначае, што своеасаблівасць публікацый, якія адносяцца да жанру рэпартажу, узнікае перш за ўсё ў выніку «разгорнутага» выкарыстання метаду назірання і фіксацыі ў тэксце яго ходу і вынікаў [43]. Пры гэтым, як падкрэслівае С. М. Гурэвіч, галоўная задача любога рэпарцёра заключаецца перш за ўсё ў тым, каб даць аўдыторыі магчымасць убачыць падзею, якая апісваецца, вачыма відавочцы (рэпарцёра), г.зн. стварыць «эфект прысутнасці» [9, с. 21].

Падзея як тэма матэрыялу разглядаецца ў нататках і рэпартажах усіх выданняў, якія закранаюць пытанні культуры. Так, буйныя грамадска-палітычныя выданні як «СБ », «Рэспубліка» і пад. сканцэнтраваны на падзеях рэспубліканскага маштабу, «Сельская газета» – на культурных падзеях рэгіёнаў, спецыялізаваныя выданні ахопліваюць падзеі ўсёй краіны, як рэгіянальныя фестывалі і святы, афіцыйныя мерапрыемствы, прэм’еры і г.д.

**Інтэрв’ю.** Часцей за ўсё ў СМІ культурнага напрамку публікуюцца менавіта інфармацыйныя інтэрв’ю – шэраг публікацый, падчас стварэння якіх быў ужыты метад інтэрв’ю, г. зн. у якім зафіксаваны рэальны працэс інтэрв’юіравання ці спецыяльна пабудавана ў пытальна-зваротная форма. Як падкрэслівае А.А. Цяртычны, у выпадку, калі аўтар публікацыі не проста паведамляе аўдыторыі звесткі (якія атрымаў ад субяседніка), а спрабуе каментаваць адказы, удакладняць і разгортваць іх пытаннямі чаму? якім чынам? што гэта значыць? і інш., можна казаць, што ён стварае аналітычны матэрыял [43].

Тэматыка інтэрв’ю ў беларускіх выданнях не заўсёды суадносіцца з нейкай падзеяй. Зразумела, што інтэрв’ю можа выйсці, напрыклад, пра жыццёвы ці творчы шлях асобы з нагоды нейкай знамянальнай даты, але ўсё ж тут вызначыць дамінантную тэматыку немагчыма.

**Некралог.** Жанравая своеасаблівасць некралога вызначаецца прадметам адлюстравання – фактам смерці нейкага чалавека, сэнс публікацыі якога – простае паведамленне аўдыторыі. На думку А.А. Цяртычнага, некралогі, як

правіла, змяшчаюць кароткую біяграфію памерлага, звесткі пра месца працы, аб яго дасягненнях, узнагародах. Часам у некралогу гаворыцца аб прычыне смерці, месцы пахавання. Завяршаецца некралог звычайна развітальнымі словамі, выразам смутку па памерлым [43]. Некралогі друкуюцца ў газетах «Літаратура і мастацтва», «Культура», значна радзей – у часопісе «Мастацтва».

Таксама на старонках газеты публікуюцца *літаратурныя творы*, а таксама *пераклады* твораў замежных аўтараў. У свой час у «ЛіМе» друкаваліся такія пісьменнікі, як Іван Мележ, Іван Шамякін, Васіль Быкаў, Яўгенія Янішчыц, Уладзімір Караткевіч, Мікалай Арочка, Алесь Разанаў. Сёння на старонках газеты публікуецца проза і паэзія сучасных беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Таксама публікацыяй арыгінальных твораў і перакладаў займаюцца часопісы «Полымя», «Нёман», «Маладосць».

Некаторыя даследчыкі могуць прадставіць свае меркаванні на аснове аналізу пра жанрава-тэматычныя дамінанты ў асобных спецыялізаваных выданнях. Так, Т. Арлова адзначае, што крытыка як тып тэксту амаль поўнасцю выключыла некалі традыцыйны жанр рэцэнзіі, папулярныя інтэрв’ю і простыя інфармацыйныя нататкі [29, с. 37]. А. А. Капілава пісала, што сучасная прэса пра музыку шырокая па тэматычных і жанравых напрамках. Але пры ўсёй паліжанравасці, якая прадугледжвае наяўнасць рэцэнзій, нарысаў аб музыкантах, аналітычных эцюдаў аб новым сачыненні, найбольш запатрабаваным застаецца самы «выбуховы» па палемічным зарадзе і самы непрадказальны па магчымых наступствах рознага роду жанр праблемнага артыкула. Такіх публікацый у апошні час няшмат, іх можна пералічыць па пальцах, і ўсе яны атрымалі шырокія грамадскі рэзананс.

Пераважнымі жанрамі, дзе асвятляюцца падзеі ў свеце акадэмічнай музыкі, сталі тыя, дзе гучыць голас самога аўтара, – гутаркі, інтэрв’ю, якія дазваляюць праявіцца эрудыцыі і маштабу мыслення музыканта. У такога роду матэрыялах асноўным крытэрыям, па якіх ацэньваецца крытычнае выступленне, становіцца апісанне або часткова ацэнка, а іншыя, больш складаныя і творчыя для крытыка кампаненты – такія, як аналіз і тлумачэнні – застаюцца не запатрабаванымі. Пошук цікавых аспектаў «духоўнай» тэмы прыводзіць да таго, што некаторыя аўтары адважваюцца на такі складаны жанр, як эсэ.

У цэлым пашырэнне тэматычнага дыяпазону суправаджаецца заўважным звужэннем жанравай сферы, у якой працуе наша музычная крытыка. Асвятленне падзей усё часцей абумоўліваецца «інфармацыйнай падставай», менш з’яўляецца аглядных і праблемных артыкулаў [15, с. 64-67].

## ВЫВАДЫ ПА ГЛАВЕ 1

Для характарыстыкі сучаснага этапа развіцця культурнай журналістыкі даследчыкі звяртаюцца да тэрміна «арт-журналістыка», аднак адназначнай трактоўкі гэтага паняцця сёння не існуе. Прадметамі асвятлення і аналізу сучаснай беларускай арт-журналістыкі з’яўляюцца тэатр, музыка, кіно, мастацтва і літаратура. Прадстаўнікі кожнай з дамінантных плыняў ствараюць свае артэфакты – творы мастацтва, якія маюць духоўнае значэнне. Менавіта артэфакты, а таксама шэраг культурных падзей, фактаў і феноменаў актуалізуюцца культурнымі выданнямі, найбольш грамадска значныя і ўзнаўляльныя становяцца тэматычнымі дамінантамі.

Уласцівасць артэфакта аказвацца ў розных сітуацыях, на розных стадыях свайго жыцця абумоўлівае жанравую дыферэнцыяцыю і жанравыя дамінанты ўнутры арт-журналістыкі. Вылучаюцца пяць напрамкаў арт-журналістыкі: з дапамогай інфармацыйных жанраў ажыццяўляецца прэзентацыя артэфакта грамадству і знаёмства з падзейным пластам культурнага жыцця; з дапамогай аналітычных – асваенне артэфакта грамадствам і актуалізаванне неабходнасці выкарыстання артэфакта; арыгінальныя творы мастацкай літаратуры непасрэдна знаёмяць з сучасным літаратурным працэсам.

Інфармацыйныя і аналітычныя жанры арт-журналістыкі прадстаўлены як у культурных раздзелах грамадска-палітычных выданняў, як газеты «СБ», «Рэспубліка», «Сельская газета» і інш., так і ў спецыялізаваных – газетах «Літаратура і мастацтва», «Культура», часопісе «Мастацтва». Арыгінальныя творы сучасных беларускіх пісьменнікаў і пераклады замежных аўтараў на беларускую мову друкуюцца толькі ў спецыялізаваных выданнях (газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Полымя», «Нёман», «Маладосць»).

# ГЛАВА 2

# СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АРТ-ПУБЛІКАЦЫЙ У БЕЛАРУСКІХ СМІ

## 2.1. Стылістычная арганізацыя публікацый культурнага напрамку

Тэксты арт-публікацый пішуцца ў публіцыстычным стылі. У стылі ў рознай меры праяўляюцца такія моўныя рысы і асаблівасці пісьмовай мовы, як наяўнасць папярэдняга прадумвання, маналагічны характар, адборачнасць, літаратурнасць; строгая адпаведнасць усіх форм мовы (сінтаксічныя канструкцыі, словаўжыванне) нормам нацыянальнай літаратурнай мовы; ухіленне ад «зніжаных» слоў; імкненне да дакладнасці выказвання думак без дапамогі пазамоўных сродкаў; цяга да традыцыйнасці некаторых моўных сродкаў. У сваім падручніку «Стилистика текста» даследчык Г. Я. Салганік пазначае, што прынцыповае адрозненне публіцыстычнага слова заключаецца ў вялікай ролі ў ім эмацыянальнага, якое набывае ў рамках газетна-публіцыстычнага стылю ацэначны характар [40, с. 204].

Даследчыкі А. Багамолава і Г. Семянькова адзначаюць наступныя асаблівасці публіцыстычнага стылю:

-лексічныя. Шырокае выкарыстанне грамадска-палітычнай лексікі; газетызмаў; гатовых устойлівых выразаў; адзінак, якія набываюць выразную публіцыстычную афарбоўку пры ўжыванні ў пераносным значэнні; нядаўна запазычаных слоў; складаных і складанаскарочаных слоў; эмацыянальна-ацэначнай лексікі; слоў з пераносным значэннем; нелітаратурных моўных сродкаў (дыялектызмаў, жарганізмаў, варварызмаў, экзатызмаў, размоўнай і прастамоўнай лексікі); аўтарскіх неалагізмаў; фразеалогіі; тэрміналагічнай лексікі ў тэкстах, прысвечаных пытанням навукі, тэхнікі, эканомікі, культуры; вобразных сродкаў мовы;

-марфалагічныя. Ужыванне адзіночнага ліку назоўнікаў у значэнні множнага; назоўнікаў, якія не паддаюцца лічэнню, у форме множнага ліку; формаў загаднага ладу; формаў цяперашняга і прошлага часу дзеясловаў; адмоўных часціц не, ні, часціцы ж (жа) ва ўзмацняльнай функцыі, а таксама часціц нават, усяго толькі; вытворных прыназоўнікаў больш частае, чым невытворных; займенніка мы са значэннем група, супольнасць людзей, у якую ўваходзіць і сам апавядальнік; таксама адзначаюць прадуктыўнасць формаў роднага склону назоўнікаў;

-сінтаксічныя. Функцыянуюць у адпаведнасці са зместам і жанрам твора ўсе тыпы сказаў, як простыя, так і складаныя; вялікая колькасць экспрэсіўных канструкцый (рытарычныя пытанні, форма «пытанне – адказ», клічныя сказы, градацыя, паўторы, парцэляваныя канструкцыі і інш.); інверсійны парадак слоў; інфінітыў у ролі галоўных членаў сказа; ужываюцца састаўныя іменныя выказнікі і адсутнічаюць дзеяслоўныя; цытаты, простая мова;

-граматычныя. Ужываюцца ўласныя імёны з суфіксамі –чын-, -шчын-; суб'ектыўна-ацэначныя фарманты ў назоўніках

Вучоныя падкрэсліваюць, што для мовы публіцыстыкі характэрна спалучэнне вобразнага і лагічнага, эмацыянальнага і рацыянальнага. Менавіта ў гэтым стылі, як ні ў якім іншым, праяўляецца індывідуальнасць аўтара як словатворца, як чалавека і як грамадзяніна. А кожны публіцыстычны твор – гэта адлюстраванне асобы аўтара, ілюстрацыя яго светабачання і светаразумення [1, с. 31-36].

Кожны з публіцыстычных жанраў павінен мець свае стылістычныя асаблівасці. Мы разгледзім адметнасці самых папулярных з іх – інфармацыйнай нататкі, рэпартажу, інтэрв'ю, артыкула і рэцэнзіі.

Зразумела, што большая частка нататкі – гатовыя ўстойлівыя выразы, таму там не знаходзіцца месца для праяўлення індывідуальнага стылю аўтара і вобразна-выразных адзінак. Аднак, прафесар М. Я. Цікоцкі падкрэслівае, што нельга і не вітаць імкненне журналістаў выйсці за строгія рамкі стылю з дапамогай паведамлення сваіх пачуццяў, ацэнак і ўражанняў ад падзеі, што праяўляецца, напрыклад, у выкарыстанні экспрэсіўных загалоўкаў ці элементаў гутарковага стылю [49, с. 102-106].

У рэпартажы, як і ў інфармацыйнай нататцы, ужываецца шмат тэрміналагічнай, спецыяльнай лексікі, уласных імёнаў; даволі строга вытрымліваецца тэндэнцыя да дакументальнасці, дакладнасці і канкрэтнасці выкладу. Самая галоўная стылістычная розніца паміж гэтымі двумя жанрамі заключаецца ў процілеглай арыентацыі на ступень выяўлення ***аўтарскага «я» журналіста***: рэпартаж жа з'яўляецца карцінай падзей, прапушчанай скрозь журналісцкае асабістае ўспрыманне. Больш таго, ад ступені праявы залежыць сам стылёвы строй матэрыялу: аўтарскае «я» можа ўваходзіць у падтэкст, тады атрымліваецца стрыманы па тоне рэпартаж. І наадварот, пры актыўным удзеле аўтарскага «я» моўная кампазіцыя рэпартажу ўзбагачаецца аўтарскімі адступленнямі, вобразнымі малюнкамі, ацэнкамі, меркаваннямі, разважаннямі.

Даследчык М. Я. Цікоцкі адзначае, што аўтарскае «я» ў рэпартажы праяўляецца на ўсіх моўных узроўнях, шырока выкарыстоўваюцца вобразныя сродкі мовы (метафары, перыфразы, параўнанні, эпітэты і інш.). Лексіка ў рэпартажах больш багатая, чым у нататках, назіраюцца стылістычныя

змяшэнні – ужыванне ў адным кантэксце слоў і выразаў рознай стылістычнай афарбоўкі. Марфалагічны ўзровень характарызуецца перавагай дзеяслова (перадае дынаміку развіцця апісваемай падзеі) і займенніка. Простая мова, выкарыстанне якой у рэпартажы мае свае асаблівасці, складае абстаноўку дакументальнасці, праўдзівасці, нагляднасці падзей, якія адбываюцца. Простая мова тут з'яўляецца сродкам перадачы інфармацыі, з яе дапамогай можна перадаць нефармальную, натуральную абстаноўку не дзелавога рэпартажу. Больш за тое, простая мова грае важную кампазіцыйную ролю [49, с. 106-112].

А. М. Цікоцкі вылучае наступныя асаблівасцей інтэрв'ю, якія ўплываюць на яго стылістычную арганізацыю. Па-першае, яно (выключна або пераважна) мае форму простай мовы. Па-другое, інтэрв'ю з'яўляецца вынікам творчасці двух асоб – інтэрв'юэра і інтэрв'юіруемага. М. С. Кусянкоў у сваёй працы «Нататкі пра стыль інтэрв'ю» сцвярджае, што пытанне суадносін лексічных кампанентаў, якія належаць самому журналісту і інтэрв'юіруемаму, з'яўляецца прынцыповым у стылістыцы жанру інтэрв'ю. Жывая мова субяседніка праходзіць апрацоўку журналіста, але ўсё ж захоўваецца стылістычная залежнасць ад першакрыніцы, таму арганічна ствараецца «сярэдняя», што належыць двум аўтарам [47, с. 88-89].

Даследчык Л. Я. Мароз сцвярджае, што інтэрв'ю – жанр размоўны, а ступень размоўнасці розная – ад штодзённай размовы да публічнага афіцыйнага выступлення (кожная з разнавіднасцей будзе мець свае стандартызаваная элементы). Журналіст мае багатыя магчымасці выбару неабходных варыянтаў сродкаў маўлення, якія павінны адказваць стылістычным устаноўкам размовы, дыктавацца яе сітуацыйна-тэматычным прымацаваннем, не супярэчыць яго характару. Менавіта моўныя сродкі абумоўліваюць стандартызаванасць, кніжнасць маўлення ці яго размоўнасць, эмацыянальнасць, яны ўплываюць на выкарыстанне тым, хто гаворыць, пэўнай функцыянальнай разнавіднасці мовы. А тэма размовы і абстаноўка абавязваюць выкарыстоўваць такія моўныя сродкі, якія складаюць адзінае стылёвае рашэнне. Так, журналіст для эфектыўнай камунікацыі імкнецца прытрымлівацца звычнага для субяседніка лексікону, захоўвае адзіную стылёвую структуру. Але пры гэтым пры неафіцыйнай размове журналіст павінен намагацца дабіцца ад субяседніка натуральнасці і непасрэднасці маўлення, бо выкарыстанне размоўнай лексікі, фразеалогіі, сінтаксічных канструкцый залежаць не толькі ад экстралінгвістычных сітуацый, а і ад індывідуальных моўных навыкаў таго, у каго бяруць інтэрв'ю. Простая мова складае ўражанне дакладнасці падзеі, перадае яе атмасферу. Вобразнасць і экспрэсіўнасць маўлення неабходныя для дадзенага жанру, лепшага ўспрымання тэксту, бо нівеліруюць абстрактнасць выказванняў [24, с. 65-78].

З трох асноўных жанраў крытыкі (рэцэнзія, артыкул, творчы партрэт) бліжэй за ўсё да навуковага дыскурсу стаіць артыкул, але адназначна ён не можа ствараецца ў навуковым стылі. Публіцыстычны стыль будзе з'яўляцца асноўным для ўсіх трох жанраў, асабліва для рэцэнзіі.

Кожны від крытыкі (літаратурная, музычная, тэатральная і інш.) мае свае асаблівасці, якія абумоўлены спецыфікай таго ці іншага віду мастацтва. Н. С. Гараніна пазначае: «Характар мастацтва ў значнай ступені вызначае своеасаблівасць метадаў яго аналізу, гэта знаходзіць адлюстраванне ў змесце і стылі крытычных твораў» [8, с. 173]. Аднак усё ж такі існуюць рысы, уласцівыя ўсім відам крытыкі, а наяўнасць агульных прыкмет дазваляе аб'яднаць крытыку розных відаў мастацтва і літаратуры ў адно паняцце літаратурна-мастацкай крытыкі.

Асноўнай стылістычнай прыметай крытычнага даследавання з'яўляецца сціслацсь элементаў даследавання ў невялікім адрэзку тэксту. У выніку аналізу ў аўтара складваецца меркаванне наконт твора, яно выражаецца ў ацэнке, якая не заўсёды выказваецца прама і катэгарычна. У сваім артыкуле «О стиле литературно-художественной критики» Н. С. Гараніна піша, што ацэначныя меркаванні крытыка суправаджаюцца рознымі пабочнымі канструкцыямі, мадальнымі словамі і словазлучэннямі, з дапамогай якіх аўтар аддзяляе свае ўражанні і рэкамендацыі, агаворвае меру іх адноснасці. Па колькасці агаворак можна судзіць пра ўзровень упэўненасці крытыка ў яго меркаваннях і дасведчанасці аб прадмеце, а таксама даведацца пра аўтарскі стыль. Так, некаторыя могуць выкарыстоўваць усяго некалькі мадальных слоў, дзеясловаў з мадальным значэннем ці пабочных канструкцый, іншыя ж – пры кожным звароце да прадмета [8, с. 182].

Тэрміны проста неабходныя ў крытычным матэрыяле для кароткага і дакладнага абазначэння з'яў, якія даследуюцца. Яны выконваюць не толькі назыўную, але часта і ацэначную функцыю для стварэння ў чытачоў пэўных адносін, тады яны набываюць эмацыйна-экспрэсіўную афарбоўку. Тлумачэнне тэрмінаў праблематычна, бо словы не перадаюць у поўнай меры спецыфіку, напрыклад, гука ці руха, а таксама ўдакладненні могуць быць прычынай змены афарбоўкі тэрміна. Таксама ўзаемаразуменне аўтара і чытача ўскладняецца, калі тэрмінам, спецыяльным словам і выразам надаецца неўласцівае ім значэнне.

Мова работ павінна дапамагаць рэалізацыі асноўных задач крытыка: інфармацыі, аналізу, ацэнкі і ўздзеяння. Асобую ролю іграе аўтарскае «я»: менавіта ад асобы залежыць адбор, арганізацыя і ацэнка фактаў. Шырока ўжываюцца ў літаратурна-крытычных працах такія лексіка-семантычныя сродкі стварэння выразнасці, як тропы: метафара, метанімія, іронія, гіпербала, перыфраза, эпітэт і інш. Індывідуальна-аўтарскія метафары і метаніміі

сустракаюцца нячаста. Выразным сродкам у крытыцы з’яўляецца іронія, у якой змяшчаецца ацэначна, часцей за ўсё адмоўная. Гэты сродак выказвання аўтарскай пазіцыі ў адносінах да аб’екта, які крытыкуецца, да самой рэчаіснасці. Прыёмы стварэння іроніі разнастайныя, можна выкарыстоўваць словы, якія маюць у слоўніку паметку іран., часцей за ўсё гэта кніжныя ці ж састарэлыя словы з адценнем рытарычнасці. Іранічнаму пераасэнсаванню можа падвергнуцца і нейтральная лексіка, іранічнае гучанне можа з'яўляцца ў пэўным кантэксце.

Тропы выконваюць індывідуалістычную, мастацка-выяўленчую і ацэначную функцыі. Дамінантай стылю вызначаецца і мова працы. Агульныя тэндэнцыі вызначаюцца накіраванасцю артыкула – пры перавазе інфармацыйнай задачы выкарыстоўваюцца агульнамоўныя і газетна-публіцыстычныя сродкі, пры пастаноўцы мастацкіх задач – назіраецца імкненне да абнаўлення мовы.

Экспрэсіўныя сінтаксічныя канструкцыі шматлікія і разнастайныя. Да выразных сінтаксічных сродкаў кніжнай прамовы належаць стылістычныя фігуры: анафара, градацыя, антытэза і інш. гутарковай прамовай звязаныя па паходжанні эліптычныя, сегментаваць і парцэляванай структуры. У літаратурна-крытычных працах могуць быць ужытыя інверсія, рытарычнае пытанне, паралелізм, антытэза, і іншыя сродкі сінтаксічнай выразнасці. Іх ужыванне вызначаецца стылістычнымі прынцыпамі крытыка. Фарміраванню ж стылю крытыка спрыяе вывучэнне гісторыі літаратурай крытыкі, прац класікаў.

Н. С. Гараніна робіць вывад, што ў крытыцы мэце пераканання падпарадкавана ўся сістэма разбору твораў мастацтва. Для яе дасягнення аўтар можа занімаць розныя «пазіцыі». Так, калі аўтар у лірычных адступленнях выражае свае думкі, пачуцці, ацэнкі і адчуванні, чытач адчувае атмасферу даверу, можа праводзіць паралелі паміж паміж выказваннямі і суджэннямі крытыка па розных нагодах. Таксама аўтар можа выяўляць сваю «прысутнасць», калі выражае ацэначныя меркаванні, індывідуальна-эмацыйныя назіранні, выказваецца ад першай асобы, у тым ліку пры дапамозе аўтарскага «мы». Яшчэ адной формай самавыяўлення з’яўляюцца словы, што называюць адрасата мастацтва (чытач, слухач, глядач) і замяняюць крытыка ці паказваюць яго асобаснае ўспрыманне. Аднак гэта сінанімія не выключае адрозненне паняццяў «крытык» і «астатняя аўдыторыя», і, залежна ад гаворкі ад свайго імя ці ад імя астатняй аўдыторыі, самавыяўленне асобы крытыка будзе ажыццяўляцца рознымі стылістычнымі спосабамі. Акрамя таго, у тэкст можа ўводзіцца «вобраз чытача»-апанента, калі аўтар чакае магчымасць супраціўлення яго поглядам. Такі тэкст можа пабудзіць чытача правесці самастойную аналітычную работу. Таксама да прыёмаў пераканання можна

аднесці «прадугадванне думкі», якая заведама можа разыходзіцца з меркаваннем крытыка, развенчванне «чужых меркаванняў» і «звароту» да памяці з дапамогай пабуджальных канструкцый замест аналізу аргумента, які пацвярджае канцэпцыю [8, с. 200-205].

Артыкул – адзін з распаўсюджаных жанраў публіцыстыкі. Даследчык А. М. Цікоцкі ў жанры артыкула вызначае дзве стылістычныя плыні:

1) прадметна-навуковая (апісанне навуковых або грамадскіх праблем) – кніжная абстрактная лексіка і фразеалогія, характэрныя граматычныя формы і сінтаксічная пабудова;

2) публіцыстычная (папулярызацыя, каменціраванне, публіцыстычнае абагульненне – тут побач з кніжнай лексікай і фразеалогіяй ёсць значныя ўкрапванні, гутарковых слоў, увогуле слоў стылістычна афарбаваных (метафары, параўнанні, устарэлая лексіка і г.д.).

Асаблівасці жанру газетнага артыкула вызначаюцца ўзаемадзеяннем гэтых дзвюх плыняў. Аналітычная складальная ў артыкуле значна прэваліруе над інфармацыйнай, аўтар павінен асэнсаваць узаемасувязь агульных культурных працэсаў і дадзенага твора. Таму ў крытычным артыкуле кампазіцыя шматкампанентная [47, с. 10].

Прафесар М. Я. Цікоцкі пазначае , што ў артыкуле найбольш поўна і выразна праяўляюцца асабістыя адносіны аўтара да рэчаіснасці, да тых фактаў і з’яў, якія складаюць змест яго твора. Таму тут мацней выражаецца аўтарскае «я», ярка выяўляюцца індывідуальныя асаблівасці стылю, усёй творчай манеры аўтара. У артыкулах шырока выкарыстоўваюцца агульнавядомыя і зразумелыя метафары, параўнанні, фразеалагічныя сродкі мовы. Вобразныя словы і словазлучэнні – эпітэты, метафары, ідыёмы, крылатыя словы і г.д. – таксама складаюць адну структуру слоўных вобразаў, іншай структурай вобразаў з’яўляюцца вобразныя малюнкі, дэталі, эпізоды, і нарэшце, вышэйшая структурная катэгорыя вобразаў – вобразы-сацыяльныя тыпы, вобразы-класы, вобразы-партрэты прадстаўнікоў розных грамадскіх груп і класаў і г.д. [49, с. 35-64].

Стыль рэцэнзіі залежыць ад мэт, якія ставіць перад сабой крытык. Так, стылем рэцэнзіі можна назваць публіцыстычны з элементамі навуковага. Для паведамлення і выражэння ўражанняў ад прачытанага ці прагледжанага выкарыстоўваюцца моўныя сродкі, уласцівыя публіцыстычнаму стылю. Увогуле жанр рэцэнзіі мае даволі строгія структурныя рамкі, павінны прысутнічаць усе элементы (паводле А. А. Сальнікавай):

1. паведамленне аб творы мастацтва (аўтар, назва, месца і час стварэння і публікацыі);
2. агульная характарыстыка-ацэнка твора;
3. аналіз зместу і формы твора;

4. вызначэнне месца твора ў творчасці аўтара або ў літаратурным працэсе ў цэлым (трэба сказаць, што без гэтага ўвогуле задачу крытыкі нельга лічыць выкананай);

5. прыцягненне ўвагі чытача да твора [33, с. 208].

Аднак на практыцы аўтары часта (наўмысна ці з прычыны няведання) апускаюць некаторыя з іх, што вядзе да жанравых адхіленняў і – як вынік сувязі жаналогіі са стылістыкай – стылістычных памылак.

Аналіз твора прадугледжвае наяўнасць тэрмінаў і стылістычна афарбаванай кніжнай лексікі, якія ўжываюцца ў навуковым стылі. Як адзначае прафесар В. П. Красней, што аўтары рэцэнзій звяртаюцца да спецыяльнай лексікі і шырока ўжываюць навуковыя тэрміны. Самі ж тэрміны на старонках газет выкарыстоўваюцца ў прамым значэнні і дакладна выконваюць сваю намінатыўна-дэфінітыўную функцыю (служаць сродкамі намінацыі і дэфініцыі адпаведных навуковых паняццяў). Тэрміны ў газетных матэрыялах, як правіла, ужываюцца без тлумачэння [17, с. 35]. Р. Я. Салганік абумоўлівае гэта тым, што тэрміны не супярэчаць прыродзе публіцыстыкі, наадварот, яны блізкія газетна-публіцыстычнаму стылю дакладнасцю намінацыі, глыбінёй абагульнення паняцця, адназначнасцю, лаканізмам выказвання, які складае адзін з важных кампанентаў эстэтычнага ідэалу газетна-публіцыстычнага стылю [40, с. 73].

Незалежна ад жанру, публіцыстычны тэкст дае магчымасць адшліфаваць мову, апрацаваць стылістычную маркіраванасць слова. Прафесар В. І. Іўчанкаў адзначае, што для газеты характэрна палемічнасць, высокая ступень ацэначнасці і пераканальнасці, уцягненне чытача ў публічны дыялог, а атрактыўнасць газетнай мовы адбіваецца на сінтаксісе газетнага тэксту, на ўсёй яго структуры (у асноўнай частцы тэксту ўзрастае колькасць мадальных і аўтарызаваных канструкцый), таксама навукоўца пазначае, што ў тэкстах вялікая колькасць празмерна насычаных, таўталагічных і плеанастычных словазлучэнняў [13, с. 78-86].

## 2.2. Стыль літаратурна-мастацкай крытыкі ў сучаснай беларускай арт-журналістыцы

Сучасны этап развіцця беларускай арт-журналістыкі характарызуецца як наяўнасцю істотных змен у стылістыцы тэкстаў, так і захаваннем у сабе і станоўчых момантаў. Што датычыцца агульнага становішча тэкстаў у арт-журналістыцы, то даследчык Н. А. Тачыцкая ў сваёй працы «Арт-журналістыка як паняцце і від творчай дзейнасці» піша: «Журналісцкія матэрыялы валодаюць ярка выражанай ацэнкай, ironіяй экспрэсіўнага характару, аўтары звяртаюцца да інтэртэксту, алюзій, перфарматыўных

выказванняў, выкарыстоўваюць камунікатыўныя стратэгіі маўленчага ўздзеяння: стварэнне іміджу, фарміраванне эмацыянальнага настрою, прыцягненне ўвагі і ўсталяванне дыялогу з чытачом. Для арт-журналістыкі ў большай ступені характэрны рэкламна-прэзентацыйныя падыходы ў прадстаўленні твора, пэўныя рэдакцыйныя ўстаноўкі і аўтарскія стратэгіі. Для гэтага віду журналісцкай практыкі ўласцівы эпатаж, персаналізацыя тэксту» [42, с. 62].

У сучасных умовах відавочна трансфармацыя літаратурна-мастацкай крытыкі. Даследчык А. У. Дуброўскі ў сваім даследаванні ахарактарызаваў сучасны стан рэцэнзіі ў беларускай журналістыцы. Вучоны адзначае, што жанр рэцэнзіі не такі просты: адносная жорсткасць структуры спалучаецца з багатымі магчымасцямі творчага самавыяўлення крытыка. Сучасныя жанравыя трансфармацыі мацней за ўсё закранулі менавіта рэцэнзію, і ў выданнях яна прысутнічае вельмі часта далёка не ў класічным сваім выглядзе, ператвараецца ў міні-рэцэнзію, усё больш набліжаецца да простага інфармацыйнага паведамлення. Часцей за ўсё жанр рэцэнзіі трансфармуецца па наступных параметрах:

1. адсутнічаюць неабходныя структурныя элементы (вызначэнне месца твора ў літаратурным працэсе або ў творчасці аўтара, аналіз зместу – калі не лічыць тэматыкі – і формы твора);
2. выкарыстаны неадпаведны функцыянальна-сэнсавы тып гаворкі (напрыклад, апавяданне замест разважання);
3. уключаюцца элементы іншых жанраў (звычайна творчага партрэта).

Вучоны акрэсліў, што грунтоўны аналіз асобнага твора стаў рэдкасцю менавіта ў літаратурна-мастацкай крытыцы на полі журналістыкі, ацэначныя элементы там застаюцца ў якасці так званага «рытуальнага» кампанента, не падмацаваныя эстэтычным аналізам. У беларускай літаратурнай крытыцы гэтая рытуальнасць пагаршаецца залішнім захапленнем станоўчымі водгукамі, выкананымі ў арнаментальным, пафасным стылі, які сёння ўспрымаецца як абсалютны анахранізм [10, с. 77-86].

Некаторыя даследчыкі таксама вылучаюць штампы як пастаянную праблему газетных рэцэнзій. Па-першае, штамп у рэцэнзіі можа быць больш шырокім, чым словазлучэнне, асобная метафара і г. д., тут характарыстыка і ацэнка цэлага твора можа атрымаць штампаванае моўнае ўвасабленне. Па-другое, штампы часта з’яўляюцца складнікам другой праблемы – арнаментальнага архаічнага стылю аўтараў, што часта злоўжываюць пафаснымі выразамі.

У сучаснай арт-журналістыцы аб’ём і спосабы падачы інфармацыі ў тэксце крытычнага твора ў значнай ступені вызначаюцца мерай знаёмства

аўдыторыі з дадзеным мастацтвам, яго стваральнікамі і суадносна з мерай магчымай зацікаўленасці яе ў прадмеце крытычнай размовы. Перш за ўсё чытачу прадстаўляюцца звесткі аб мастацтве і яго стваральніках. Даследчык І. Фралова ідэнтыфікуе такі пачатак у журналісцкай крытыцы як штамп, клішэ: [46, с. 10]. А далей суадносна са спецыфікай мастацтва складаецца характар рэпрадукцыі самога прадмета ў розных відах крытыкі. Так, у літаратурнай, тэатральнай і кінакрытыке магчыма «пераказваць» прадмет найбольш дакладна: ***цытата*** дае прадстаўленне пра частку твора, якая аналізуецца і разбіраецца, больш рэдка – пра невялікія творы, звычайна вершы. Цытаты ўводзяцца ў тэкст з дапамогай зваротаў з указальнай часціцай «вось».

Крытыцы іншых відаў мастацтва неабходна знаёміць чытача з канкрэтным абрысам твораў, якія ствараюцца спецыфічнымі для кожнага віду мастацтва сродкамі (фарбы, гукі, пластыка цела) з дапамогай слова. А ў сувязі са спецыфікай кіна- і тэатральнага мастацтва, апісанне ў гэтых відах крытыкі ўскладнена перадачай аўтарам унутранага сусвету вобраза (ходу яго думак, адценняў душэўнага стану, пачуццяў). Знешняя пазіцыя крытыка-назіральніка мяняецца на ўнутраную, гаворка ідзе быццам ад імя героя з дапамогай простай мовы. Рытм апісання адлюстроўваецца ў хуткай змене пазіцый аўтара (ад знешняй, з якой фіксуюцца жэсты, рухі, міміка, да ўнутранай – перадачы пачуццяў і думак героя).

Зразумела, што вербальны выклад мастацтваў заўсёды неадэкватны арыгіналу, а ступень іх блізкасці залежыць у значнай меры ад суадносін логіка-паняційных і прадметна-вобразных элементаў у тэкстах, што іх узнаўляюць. Тут на дапамогу прыходзіць ***наглядная апісанне***, якое з'яўляецца найбольш дзейсным спосабам узнаўляць мастацтва. Гэта рыса індывідуальна-аўтарскага стылю, форма славеснага мастацтва, літаратурнай творчасці ў крытыцы. Дзейснасць у ім другасная, для возбразна-стылістычнай спецыфікі ўласціва супадзенне з момантам маўлення (граматычная форма дзеясловаў – цяперашні час), а вось ужо разважанні з пазіцыі крытыка вядуцца ў любой граматычнай форме часу. Сам уводны тэкст часта ўтрымлівае славесныя формулы пабуджальнага характару. Пабуджэнне можа быць адкрытае (у форме загаднага ладу дзеясловаў) ці ўскоснае (прычынна-ўмоўныя канструкцыі, формы выражэння сумеснага дзеяння).

У музычнай крытыцы фактычна няма таго, што можна назваць наглядным апісаннем: прырода гэтага мастацтва абмяжоўвае слоўныя магчымасці для перадачы гукавых вобразаў, таму крытычныя апісанні не такія канкрэтныя. Так званы «тэрміналагічны бар'ер» пераадольваецца з дапамогай выкарыстання паняццяў, уласцівых іншым відам мастацтва.

У сучасных спецыялізаваных СМІ, як газеты «Літаратура і мастацтва», «Культура», часопіс «Мастацтва», рэгулярна публікуюцца мастацкія,

музычныя, тэатральныя, літаратурныя і кінарэцэнзій. На аснове матэрыялаў былі праведзены аналіз стылістычнай арганізацыі. Разам з тымі адметнымі рысамі, якія ўласцівы ўсім жанрам публіцыстычнага стылю, можна адзначыць стылістычныя асаблівасці, уласцівыя асобным відам рэцэнзій. Яны звязаны як з жанравай ідэнтычнасцю, са спецыфікай таго ці іншага віду мастацтва, так і з аўтарскім стылем канкрэтнага крытыка. Для сучасных рэцэнзій характэрны наступныя стылістычныя асаблівасці:

**Лексічныя**

1. Часта выкарыстоўваюцца нелітаратурныя моўныя сродкі (размоўная і прастамоўная лексіка, жарганізмы і дыялектызмы): *часцяком, мо, аўто, напоўніцу, наўпрост, шараговы, розгалас, маладзён, гопнік*. Разам з тым ужываецца дастатковая колькасць функцыянальна афарбаванай кніжнай лексікі, напрыклад, *парадаксальны, лапідарны, індыферэнтны*. Такое спалучэнне сродкаў двух відаў функцыянальна-стылістычнай афарбоўкі абумоўлена тым, што аўтар хоча выразіць сваё грунтоўнае меркаванне, пры гэтым ён імкнецца выразіць сваю кампетэнтнасць.

2. Нешырокае ўжыванне грамадска-палітычнай лексікі ў кінарэцэнзіях. Гэта звязана з тым, што крытыкі адыходзяць ад традыцыйных канонаў напісання кінарэцэнзіі і не аналізуюць грамадскія і палітычныя падзеі, якія адбываюцца і маглі б паўплываць на твор, не разглядаюць стужку як феномен у агульным развіцці беларускага кінематографа. У той жа час у тэатральных рэцэнзіях часта выкарыстоўваецца грамадска-палітычная лексіка, якая прадстаўлена назвамі палітычных, філасофскіх, сацыяльна-эканамічных напрамкаў, класавых партыйных, ідэалагічных паняццяў, грамадска-палітычных падзей і інш.: *дарэвалюцыйны, дыктат, камсамол, катарга, манаполія*.

3. Выкарыстанне слоў і тэрмінаў, якія датычацца той галіны мастацтва, пра якую непасрэдна ідзе размова, а таксама іншых сумежных відаў мастацтва. Апісанне, класіфікацыя, параўнанне і ацэнка – адметныя рысы крытычнага працэсу. Таму аўтар рэцэнзіі змяшчае інфармацыю, выражаную тэрмінамі, пра жанр, яго асаблівасці, працэс вырабу і інш.

Так, для кінарэцэнзій характэрны тэрміны *істужка, аб’ектыў, камера, фотаапарат, дакументаліст, памфлет, пастаральны, партрэт, эпітафія*. Тэатральнай рэцэнзіі ўласціва ўжыванне тэатразнаўчай тэрміналагічнай лексікі, як *інсцэніроўка, пастаноўка, авансцэна, амплуа.*

Для музычных рэцэнзій характэрна ў першую чаргу ўжыванне тэрмінаў-варварызмаў, напрыклад, *брытпоп, індастрыял, трып-хоп, трэк, пост-панк, хіп-хоп*. Яны абазначаюць музычныя напрамкі, якія з’явіліся ў апошнія дзесяцігоддзі і не маюць беларускамоўных аналагаў. Аўтары рэцэнзій часта

вызначаюць жанравую спецыфіку трэкаў, параўноўваюць іх, выдзяляюць гібрыдныя жанры. Гэтым абумоўлена іх вялікая колькасць.

4. Мова аўтараў, як правіла, не засмечана ўжываннем іншамоўнай лексікі, за выключэннем безэквівалентных тэрмінаў. Іншыя слоў накшталт *роўд-муві* (англ. road movie — літ. «дарожнае кіно». Фільм-вандроўка) у рэцэнзіях сустракаюцца даволі рэдка. Крытыкі аддаюць перавагу беларускамоўным аналагам варварызмаў. Часта ў сваіх рэцэнзіях аўтары разглядаюць выключна беларускія рэаліі, у якіх ствараецца той ці іншы прадмет мастацтва, айчынны прадукт часта не параўноўваецца з работамі замежных дзеячаў мастацтва.

5. Выкарыстанне фразеалагізмаў, напрыклад, *як на далоні, соль зямлі, мужчынская рука, аўчынка не варта вырабу, есці вачамі, мора па калена, пусціць слязу, пусціць пыл у вочы.*

**Марфалагічныя**

1. Перавага формы цяперашняга (*ведае ўсё, увасабляе вобраз, хочуць бачыць жыхары, выконвае працу, правярае асоб*) і прошлага (*вырашалася пытанне, атрымаў званне, змяніў пасаду, знайшла ўвасабленне, прайшло ў ложку*) часу дзеяслова. Так атрымліваецца, бо рэцэнзенты перадаюць сюжэт, калі ён ёсць, у цяперашнім часе для «эфекту прысутнасці», быццам мы глядзім стужку, спектакль, чытаем твор разам з імі. А форма прошлага часу патрэбна для апісання перадгісторыі.

2. Вялікая колькасць адмоўных часціц *не, ні, часціцы ж (жа)*, а таксама *нават, усяго, толькі*. Гэтыя часціцы выконваюць узмацняльную функцыю, надаюць адценне настойлівасці і пераканання выразу.

3. Прадуктыўнасцю формаў роднага склону: *адным з вобразаў стужкі, у перспектыве дрэваў, спакойныя да становішча, у пастку ўседазволенасці, душы гледача, адыходзіць ад жанру партрэта чалавека, прыём адхілення, партрэтам нацыі, смутак ад бяссілля, гераіні стужкі, аб'ектыў камеры, па-за межамі прасторы гераіні*. Гэта звязана са спосабам пабудовы азначэння ў сказе, дзе перавага аддаецца варыянту *прастора гераіні*, а не *гераічная прастора*.

**Сінтаксічныя**

1. У рэцэнзіях функцыяніруюць як простыя, так і складаныя тыпы сказаў. Але перавага аддаецца другому, бо простыя сказы больш уласцівы размоўнаму стылю маўлення. Складаныя дазваляюць перадаць думку разгорнута.

2. Шырока ўжываюцца пабочныя канструкцыі, з іх дапамогай крытыкі выказваюць сваё стаўленне да прадмета, асобы ці з'явы. Адносіны могуць быць розныя: упэўненасць, сумненні, меркаванне, здагадка, спасылка, спагада і г.д.

3. Выкарыстоўваюцца экспрэсіўныя канструкцыі, як клічныя сказы і паўторы. Але выкарыстанне паўтораў не заўсёды з’яўляецца выражэннем экспрэсіўнасці, у кінарэцэнзіях могуць прысутнічаць два віды паўтораў: стылістычна абумоўлены і таўталагічны. Так, сустракаліся словазлучэнні «*ўглядваецца ў далягляд*», «*пашыраецца да абшару*», якія з’яўляюцца таўталогіяй і могуць быць калькай з рускай мовы. Дадзеныя выразы можна замяніць на «*ўглядваецца ў далячынь*», «*пашыраецца да памеру*», напрыклад. Калі сустракаюцца паўторы аднакарэнных слоў суседніх сказах, то можна меркаваць пра няўважлівасць аўтара ці рэдактараў. Сустракаюцца ў кінарэцэнзіях штампы (*у паўсядзённым жыцці*) і канцылярызмы (*законапаслухмяны абывацель, атрымаў чарговае званне*).

Рэцэнзіі на твор мастацкай літаратуры характарызуюцца высокай ступенню экспрэсіўнасці, залішняй пафаснасцю і арнаментальнасцю, катэгарычнасцю выказванняў, якія выражаюцца ў выкарыстанні прыслоўяў, загаднага ладу дзеясловаў, дзеясловаў з экспрэсіўнай адзнакай, клічных сказаў. Прысутнічае вялікая колькасць пафасных і прагматычных выразаў.

Так выглядаюць агульныя рысы сучасных рэцэнзій, трэба адзначыць, што ў гэтым жанры высокая ступень праяўлення аўтарскага стылю, таму пры аналізе прац кожнага крытыка будуць выяўляцца свае асаблівасці. Не менш важным з’яўляецца тое, што некаторым крытыкам уласціва «памякчэнне» сваіх заўваг. Звязана гэта з задачай крытыка прарэкламаваць дадзены твор. Так, заўвагі часта суправаджаюцца формуламі абмежавання, як пабочныя, мадальныя словы і канструкцыі, аргументацыяй і дакладнымі фармулёўкамі. А катэгарычнасць згладжваецца з дапамогай выкарыстання слоў з няпэўным значэннем (у першую чаргу няпэўныя займеннік і прыметнікі), але ў некаторых выпадках яны граматычна не апраўданы, без сэнсавай нагрузкі ператвараюцца на штампы. Таксама нельга не адзначыць рэкламны кампанент, які стаў уласцівы стылю рэцэнзіі. Е.Ю. Жданава сцвярджае, што ў тэкстах рэкламы прэваліруюць метафары, гіпербалы, адухаўленне, неалагізмы, жарганізмы, няпоўныя, эліптычныя і назыўныя сказы, загадны лад дзеяслова ў клічным сказе [11, с. 83-84]. Крытык у рэцэнзіі выкарыстоўвае менш катэгарычныя і назойлівыя сродкі.

## ВЫВАДЫ ПА ГЛАВЕ 2

Можна зрабіць вывад, што тэксты арт-публікацый пішуцца ў публіцыстычным стылі. Для яго ў першую чаргу характэрна шырокае выкарыстанне газетызмаў; гатовых устойлівых выразаў; эмацыянальна-ацэначнай лексікі. У ім функцыянуюць усе тыпы сказаў; шмат экспрэсіўных канструкцый, цытат і простай мовы. Таксама прысутнічаюць элементы навуковага стылю – тэрміны і кніжная лексіка. Кожны жанр, які ўласцівы арт-журналістыцы, мае свае стылістычныя асаблівасці і ступень праяўлення

аўтарскага «я» журналіста, ад чаго будзе залежыць адбор, арганізацыя і ацэнка фактаў .

Самую вялікую стылістычную трансфармацыю за апошні час перажыла менавіта літаратурна-мастацкая крытыка. Спецыфічнай задачай для сучаснай рэцэнзіі з’яўляецца прыцягненне ўвагі аўдыторыі да твора. У гэтым жанры тавар прасоўваецца менш назойліва і агрэсіўна, чым у рэкламных тэкстах. Аўтар часта звяртаецца непасрэдна да чытача, таму будуе свой тэкст у форме апавядання ад 1-й ці 3-й асобы. Сустракаюцца мадальныя канструкцыі, рытарычныя пытанні і звароткі. Ацэнка выражаецца часцей за ўсё з дапамогай прыслоўяў, эмацыянальных часціц, выклічнікаў. Састаў лексікі разнастайны, вар’іруецца ад ад кніжнага да размоўнага. Звычайна пагранічная лексіка выкарыстоўваецца для ўзмацнення выказванняў. Перыядычна сустракаецца рэзкасць і прагматычнасць меркавання, а ў некаторых выпадках наадварот – памякчэнне катэгарычнасці суджэнняў.

# ГЛАВА 3

# ЖАНРАВА-ТЭМАТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АРТ-ПУБЛІКАЦЫЙ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ ВЫДАННЯЎ

## 3.1 Жанрава-тэматычная спецыфіка газеты «Літаратура і мастацтва»

«Літаратура і мастацтва» – беларускамоўны літаратурны штотыднёвік, заснавальнікамі якога з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Галоўны рэдактар – Аляксей Іванавіч Чарота.

Для арыентацыі аўдыторыі ў культурным пласце краіны ў газеце «Літаратура і мастацтва» публікуюцца анонсы мерапрыемстваў, у 2020 годзе быў размешчаны 31 анонс, у 2021 – 32, 2022 – 80, 2023 – 76, са студзеня па красавік 2024 – 21. Большасць з іх – кароткія паведамленні інфармацыйнага характару пра час і месца правядзення мерапрыемства, для больш маштабных падзей, якія ў сваю чарку з'яўляюцца тэматычнымі дамінантамі, друкуецца праграма, напрыклад, праграма Дня беларускага пісьменства ў Добрушы (№ 35 2 верасня 2022), XXIX Мінская міжнародная выстаўка-кірмаш (№ 11 18 сакавіка 2022), новы сезон у філармоніі «Ад неба да зямлі… і зноў у неба» (№ 36 10 верасня 2021), праграма Дня беларускага пісьменства ў Капылі (№ 35 3 верасня 2021), VI Міжнародны фестываль «Уладзімір Співакоў запрашае...» (№ 8 28 лютага 2020), праграма Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах (№ 33 4 верасня 2020). Перыядычна ў газеце з'яўлялася рубрыка «ЛІМ» – афіша» з падборкай самых чаканых культурных падзей, напрыклад, фестываль «Кінемо», выставачны праект «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры», выстава «Фелікс Гумен. Класіка і эксперыменты» і інш. («Культурны гід летняга сезона» № 24 18 чэрвеня 2021. Можна адзначыць, што назіраецца тэндэнцыя да павелічэння культурных падзей у краіне ў 2022 годзе, з іншага боку, магчыма, што рэдакцыя самастойна вырашыла друкаваць больш анонсаў.

За 2020 год у газеце было апублікавана 545 нататак, за 2021 – 486, 2022 –517, 2023 – 613, 2024 – 268, у большасці з якіх апавядаецца пра падзейны пласт культурнага жыцця Беларусі. Тэматычнымі дамінантамі з'яўляюцца юбілейныя творчыя вечары, міжнародныя семінары, вечары-прэзентацыі кніг, творчыя вечары/ сустрэчы, міжнародныя кніжныя выставы-кірмашы, міжнародныя семінары, літаратурныя імпрэзы, творчыя паездкі, музейна-

выставачныя экспазіцыі, конкурсы, фестывалі, круглыя сталы, прэс-канферэнцыі, акцыі (у тым ліку дабрачынныя), выхад кніг, паэтычныя спаборніцтвы. Таксама змяшчаюцца сціслыя навіны пра адкрыццё выстаў, арт-аб’ектаў і інш., звычайна публікуюцца ў падрубрыцы «млын навін». Напрыклад, нататка пра арт-аб’ект «МОВА», які ўсталявалі ў Брэсце («Сінь балот і зеляніна дрэў» № 3 22 студзеня 2021), пададзена як фотафакт, а суправаджальны тэкст не змяшчае ніякіх падрабязнасцей.

Нататкі друкуюцца пераважна ў рубрыках «Часапіс», «Кніжны свет» і інш.; у рубрыках, прысвечаных канкрэтным плыням мастацтва («Тэатр», «Кіно», «Кніжны свет» і г.д.), могуць сустракацца нататкі пра выбітныя навіны ў гэтых сферах, напрыклад, пра «пірацкі зліў» у інтэрнэт біяграфічнай драмы «Купала» («Кібератака на «Купалу» № 37 2 кастрычніка 2020). Звычайна маюць класічны змест: звесткі пра час і месца мерапрыемстваў, удзельнікаў, у больш рэдкіх выпадках – мэты, задачы і іншыя падрабязнасці. У 2020 годзе вялася практыка размяшчэння ў нататках каментароў удзельнікаў, арганізатараў, якія якраз тлумачылі матываванасць падзей («Пад зоркамі сяброўства», «Годнасць як шляхетнасць» № 6 14 лютага 2020). Напрыклад, у публікацыі «Штуршок да новага, крок да лепшага» (№ 11 20 сакавіка 2020) дададзена меркаванне дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Паўла Сапоцькі наконт здольнасці краязнаўчых імпрэз кансалідаваць навукоўцаў; у публікацыях змешчаны каментарыі звязаных з падрыхтоўкай прэм’ерных спектакляў: «Бытавая гісторыя і спектакль-інтэрактыў. Маладзёжны тэатр запрашае на прэм’еры сакавіка» (№ 10 13 сакавіка 2020) – рэжысёр спектакля «Дом пасярод вясны» Саўлюс Варнас; «Знайсці пункт адліку» (№ 1 10 студзеня 2020) – аўтар п’есы Сафіі Ворсы «Дзень настаўніка» і інш.

Сустракаліся нататкі, больш падобныя на справаздачу, са спробай асэнсаваць і заканспектаваць падзеі мерапрыемства. Так, у матэрыяле «Падарожжы праз кнігі» (№ 6 14 лютага 2020) не проста апавядалася пра XXVII Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш, а была спроба аўтара менавіта адзначыць і патлумачыць асноўныя моманты творчай сустрэчы з журналістам-міжнароднікам і публіцыстам Інесай Плескачэўскай, падзяліўшы нататку на тэматычныя блокі: «На старонках прэсы», «Пра эканамічныя тэндэнцыі», «Пра набыткі», «Пра самае незвычайнае ўражанне», «Пра наступны праект», «Пра тое, як нас успрымаюць».

Нячаста, але друкаваліся нататкі, якія не апавядалі пра сучасныя падзеі, а з’яўляліся ўрыўкамі з гістарычных артыкулаў пра здарэнні мінуўшчыны, перадрукоўкамі афіцыйных дакументаў, пісьмаў. Напрыклад, у матэрыяле «Якім планаваўся папярэдні скарынаўскі юбілей?...» (№ 33 19 жніўня 2022) расказвалася пра зварот Саюза пісьменнікаў БССР у ЦК КПБ з нагоды 500-

годдзя беларускага першадрукара Францыска Скарыны, былі прадстаўлены вытрымкі з яго.

Можна зрабіць вывад, што нататкі ў газеце «Літаратура і мастацтва» маюць «класічнае» для гэтага жанру напаўненне: гэта невялікія па памеры (да паловы газетнай паласы) паведамленні пра падзеі, якія яшчэ актуальны ў цяперашнім культурным кантэксце, з'яўляюцца «навіной» для аўдыторыі. Нататкі строга інфармацыйныя па сваім характары, журналіст не паглыбляецца ў сутнасць, важнасць, уплыў падзеі на ход культурных працэсаў, не выражае ніяк сваю аўтарскую пазіцыю. У большасці сваёй нататкі маюць кампазіцыйную структуру, якая ўключае асноўныя элементы – загаловак (звычайна лагічна тоесны ў адносінах да тэксту), лід-абзац (змяшчае галоўную інфармацыю) і асноўную частку. Падзагалоўкі не выкарыстоўваюцца, каментары з'яўляюцца апцыянальна.

Больш змястоўным інфармацыйным жанрам з'яўляецца рэпартаж, якому ў «ЛіМе» аддаецца значна меншая ўвага: за 2024 год (са студзеня па красавік) было апублікавана 4 рэпартажы, за 2023 год – 37, за 2022– 40, за 2021 – 39, 2020 – 24, у якіх апавядаецца пераважна пра выбітныя падзеі краіны. Дамінантнымі тэмамі за дадзены перыяд былі, напрыклад, навагодні баль у Вялікім тэатры Беларусі («Баль: новае вымярэнне № 3 21 студзеня 2022), XXVII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» («На мове кінасяброўства, № 48 3 снежня 2021), Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» («Салют, фестываль!» № 29 23 ліпеня 2021), Ноч музеяў («Жывая музыка, жывое слова, жывая цікаўнасць» № 21 28 мая 2021), фестываль да Дня беларускага пісьменства («Па кніжных сцяжынах Капыля» № 36 10 верасня 2021), фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Нясвіжская фартэцыя» («Нясвіжская фартэцыя», або Назад у мінулае» № 33 20 жніўня 2021) і інш. Публікуюцца ў рубрыках «Панарама», «Ракурс», «Рэпартаж».

Рэпартажы маюць складаную сюжэтна-кампазіцыйную пабудову, бо аўтары па-рознаму выбіраюць, якія адрэзкі падзей адлюстроўваць, адбіраюць і размяшчаюць фактычны матэрыял, яркія эпізоды, дэталі, уражанні расстаўляюць удзельнікаў падзей, некалі не згодна з храналогіяй, Важна адзначыць, што далёка не ўсе публікацыі якасна перадаюць атмасферу мерапрыемства і ствараюць эфект прысутнасці, у многіх ці не апісваюцца дэталі, ці не ў поўнай меры адлюстроўваюцца падзеі, ці аддаецца перавага выключна каментарам. У класічным варыянце рэпартаж павінен уключаць элементы і замалёўкі, і інтэрв'ю, і справаздачы, і карэспандэнцыі, але тут часта акцэнт робіцца на чымсьці адным. Напрыклад, у публікацыі «Няўмольная прага справядлівасці» (№ 36 9 верасня 2022) апускаюцца падрабязнасці і ход падзей, пераважваюць каментарыі. У публікацыях «Нішто не знікае бясследна» пра святкаванне 550-годдзя Жыровіцкага абраза Божай Маці (№ 39

16 кастрычніка 2020), пра святкаванне Дня беларускага пісьменства «Вераснёўскія дні натхнення» (№ 34 11 верасня 2020) адлюстроўваюцца выключна падзеі без дадатковых падрабязнасцей, тлумачэнняў і ўражанняў. Матэрыялы пра XLVII Міжнародны фестываль мастацтваў «Беларуская музычная восень» («Сімфонія халоднай восені» № 46 19 лістапада 2021), XVII Міжнародны кнігазнаўчыя чытанні ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі («У неабсяжны свет кнігі» № 17 30 красавіка 2021), выстаўку архітэктурных праектаў Школы архітэктурнага мыслення для дзяцей («На якім паверсе будзе «куфня»?» № 2 14 студзеня 2022) і інш. змяшчаюць у сабе даволі вялікую гістарычную даведку з датамі, імёнамі дзеячаў, а «Сімфонія халоднай восені» яшчэ і разгорнуты анонс будучых мерапрыемстваў фестывалю. Праз тое, што аўтары схільны рабіць рэпартаж з афіцыйных мерапрыемстваў падобным на справаздачу, матэрыял не атрымліваецца дынамічным, не перадае ні атмасферу, ні сутнасць мерапрыемства.

Часта каментары ўдзельнікаў падзей публікаваліся асобна, уяўляўшы сабой разнавіднасць жанру – рэпартаж-каментар, напрыклад, «Дзень, які злучае» (№ 36 9 верасня 2022), «Месца, дзе ў паветры разліта цеплыня…», «З любоўю да людзей і малой радзімы» (№ 34 26 жніўня 2022). Гэта дазволіла не расцягваць матэрыял і перадаць уражанні ўдзельнікаў, хаця пры гэтым яны і адчуваюцца адарванымі ад агульнага апавядання.

Больш папулярным жанрам у газеце «Літаратура і мастацтва», які адлюстроўвае сучасны культурны працэс, з'яўляецца інтэрв'ю. За 2020 год было размешчана 94 інтэрв'ю, за 2021 – 96, за 2022 – 88, 2023 – 60, 2024 – 9. У большасці сваёй інтэрв'ю пішуцца ў форме пытання-адказу, сустракаюцца інтэрв'ю ў форме маналога: тэкст не разбіты пытаннямі журналіста, адказ субяседніка выяўляе лагічны аповед. Напрыклад, інтэрв'ю са старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалаем Чаргінцом («Жыцця і лёсу сувязная ніць» № 40 23 кастрычніка 2020), акцёрам Андрэем Дударэнкам («Трапляеш у тэатр — радуйся. Ты ў мастацтве» № 40 23 кастрычніка 2020), кіраўніком кніжнай крамы Вольгай Глухоўскай («Вольга Глухоўская: «Людзі перастаюць быць летуценнікамі» № 10 13 сакавіка 2020), галоўным рэжысёрам Гродзенскага тэатра лялек Алегам Жугждам («Крыштальны шар мастацтва» № 42 6 лістапада 2020), з пісьменніцай Кацярынай Хадасевіч-Лісавай («Якім мне ўяўляецца чытач маіх кніг?», № 33 19 жніўня 2022). У незвычайнай форме было пададзена інтэрв'ю з супрацоўніцай Купалаўскага тэатра Марыяй Захарэвіч («Нарачанская Чайка» № 50 17 снежня 2021): значную частку матэрыялу складалі біяграфічныя звесткі з жыцця артысткі і каментары самога аўтара наконт яе творчасці.

Трэба адзначыць, што ў 2020 (3 апытанні) і 2021 (6 апытанняў) мела месца практыка праводзіць групавыя апытанні. Напрыклад, у матэрыяле

«Люстэрка беларускай культуры» (№ 47 26 лістапада 2021) задаваліся 3 пытанні да вядучых артыстаў і мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа з нагоды 95-годдзя са дня заснавання; у публікацыі «Літаратура са старых канвертаў» (№ 45 12 лістапада 2021) гучалі 2 пытанні да галоўных рэдактараў «Полымя», «Нёмана» і «Маладосці» з нагоды пераходу літаратурных часопісаў пад дах выдавецтва «Мастацкая літаратура»; у матэрыяле «Час дзівос і чараўніцтва» дырыжор Аляксандр Анімісаў, мастачка Анастасія Балыш, Народны мастак Беларусі Іван Міско распавялі пра свой Новы год (№ 1 10 студзеня 2020). Такая форма не дацягвае да паўнавартаснага поліінтэрв'ю, але сапраўды прэтэндуе на вялікую аб'ектыўнасць і характарызуецца плюралізмам інтэрпрэтацый, можа даць прадстаўленне аб спецыфіцы работы ў той ці іншай сферы, установе і пад.

Героямі інтэрв'ю за даследаваны час станавіліся дзеячы розных сфер культуры: скульптар Аляксандр Фінскі («У манументальнай скульптуры прадказальнасць неабходна», № 17 29 красавіка 2022), рэжысёр Іван Гапіенка («У царстве зорак» № 7 18 лютага 2022), мастачка Ганна Ціханава-Йарданова («Экслібрыс: таямніцы тэксту і выявы» № 5 4 лютага 2022), спявачка-блогер Марыя Біліда («Дзяліцца песнямі і думкамі» № 38 24 верасня 2021), кіраўнік ансамбля «Свята» Вячаслаў Статкевіч (№ 47 26 лістапада 2021), дырэктар Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея Алена Бобіна («Культурны код» № 16 22 красавіка 2022), кіраўнік галерэі Беларускага саюза мастакоў «Мастацтва» Павел Сапоцька («Галерэя «Мастацтва»: новыя ініцыятывы» № 14 8 красавіка 2022), пісьменнік Павел Гушынец («Гісторыі, што лечаць душу» № 26 30 чэрвеня 2023) мастацкі кіраўнік і дырыжор ансамбля салістаў «Класік-Авангард» Людміла Каліноўская («Успрыманне самай складанай авангарднай музыкі залежыць ад таго, як яе паднесці» № 41 13 кастрычніка 2023) і інш. Таму можна сцвярджаць, што ніводная плынь мастацтва не абмінаецца ўвагай.

У газеце аддаецца перавага інфармацыйным інтэрв'ю, аналітычныя амаль не сустракаюцца. Структура ўключае ўводзіны, у якіх расказваюцца звесткі пра героя і інфармацыйную нагоду; блок з пытаннямі і адказамі. Вывад ці заключнае слова аўтара з'яўляюцца апцыянальна, часцей у канцы журналіст проста развітваецца з суразмоўцам, як, напрыклад, у інтэрв'ю з пісьменнікам Казімірам Камейшам («Паэту павінна балець усё…» № 48 1 снежня 2023). Абавязкова размяшчаецца мінімум адзін фотаздымак героя. Звычайна інтэрв'ю публікуюцца ў рубрыках «P. S.», «Пісьменнік і час», а таксама прысвечаным плыням мастацтва – «Музыка», «Тэатр» і інш. з нагоды юбілеяў, выхаду новых артэфактаў, свят і пад., адлюстроўваюць меркаванні і погляды суразмоўцаў на сучасныя культурныя працэсы, таксама звяртаюцца і да культурных набыткаў мінуўшчыны, да пытанняў іх захавання, папулярызацыі і перадачы наступным пакаленням. Напрыклад, у інтэрв'ю з Мікалаем

Кузьмічом акцэнтуецца ўвага не колькі на самім аднаўленні майстрам крыжа Еўфрасінні Полацкай, колькі на самой асобе асветніцы і важнасці крыжа як артэфакта (Вогненнае мастацтва XII стагоддзя № 46 4 снежня 2020). У публікацыі Клопаты, трывогі (№ 19 14 мая 2021) змешчана інтэрв'ю Уладзіміра Ліпскага з Васілём Віткам, якое было ўзята ў маі 1991 г.

У падрубрыках «ЛіМ»-акцэнты» і «ЛіМ»-люстэрка» публікуюцца матэрыялы, якія пазіцыянуюцца самой рэдакцыяй як агляды. Такіх за 2020 год было апублікавана 100, за 2021 – 98, за 2022 – 94, 2023 – 101, 2024 – 32. Насамрэч гэтыя матэрыялы з'яўляюцца падборкай з 5-8 нататак, не аб'яднаных адной тэмай. Такія падборкі хаця і даюць уяўленне пра культурнае жыццё Беларусі ці замежных краін, але не змяшчаюць каментароў, аналітыкі аўтара матэрыялу. Можна адзначыць сапраўдныя («класічныя») агляды, гэта, напрыклад, матэрыялы «Страчанае і выратаванае. 5 пляцовак у сценах музеяў і пад адкрытым небам, якія варта наведаць напрыканцы гэтага лета» (№ 32 28 жніўня 2020), «З ідэяй інтэрактыўнасці. Пяць незвычайных выставачных лакацый Беларусі» (№ 20 29 мая 2020), якія не проста з'яўляюцца афішай ці прэзентацыяй мерапрыемстваў, а змяшчаюць ацэнку, спробу вызначыць гіпатэтычную важнасць дадзеных падзей для грамадства і культуры ў цэлым.

Некралог — жанр, які прызначаны выключна паведамляць пра факт смерці той ці іншай асобы, друкаваўся ў «ЛіМе» ў 2020 годзе 41 раз, у 2021 – 95, 2022 – 31, 2023 – 40, 2024 – 10. Пры гэтым варта адзначыць, што некралогі прысвячаліся не толькі непасрэдна дзеячам культуры, але і іх блізкім сваякам – сужэнцам, бацькам, дзецям і пад. Таксама прыкметна, што большасць некралогаў уяўляла сабой кароткія паведамленні, але некаторыя былі ператвораны ў іншыя жанры, як нататка, верш, артыкул. Так, з нагоды смерці Дзмітрыя Пятровіча друкаваліся вершы «Памяці Дзмітрыя Пятровіча», «Балада Дзмітрыя Пятровіча» (№ 45 27 лістапада 2020); нататкі прысвячалі галоўнаму рэдактару «Краязнаўчай газеты» Уладзіміру Пучынскаму («Жыццё, абарванае заўчасна» № 49 10 снежня 2021), гісторыку-міжнародніку Мечыславу Часноўскаму (№ 49 10 снежня 2021), артыкулы – Міхаілу Фінбергу («Пасіянарная асоба» № 50 17 снежня 2021), Алесю Жуку («Глыбокі рэаліст і псіхолаг» № 42 21 кастрычніка 2022), беларускаму і французскаму мастаку Барысу Забораву («Трывога сапраўднасці» № 4 29 студзеня 2021). Такім чынам, на падставе жанру, на які ператвараюць некралог, можна высветліць, якое значэнне мела тая ці іншая асоба для грамадства ў цэлым, ці для аўтара ў прыватнасці (бо часта падставай для пашырэння некралога з'яўляецца асабістае стаўленне аўтара, яго пачуцці і ўспаміны пра памерлага).

Жанрам, які спалучае ў сабе элементы журналістыкі і мастацкай літаратуры, можна назваць эсэ; яны публікуюцца ў газеце, аднак рэдка. У 2023 (5 эсэ), 2022 (2 эсэ) і 2021 (1 эсэ) гадах былі надрукаваны эсэ, якія хутчэй

маюць нахіл да мастацкай літаратуры. У 2020 Навумам Гальпяровічам былі прадстаўлены 2 эсэ: «Асалода чытання» (№ 46 4 снежня 2020) і «Носьбіты высокай духоўнасці» (№ 39 16 кастрычніка 2020), якія набліжаны да журналістыкі, бо ўздымаюць пытанні захавання культурнай спадчыны.

З дапамогай публікацыі арыгінальных твораў мастацкай літаратуры ў поўнай меры ажыццяўляецца непасрэднае (без меркаванняў і ацэнак літаратурных крытыкаў) знаёмства з сучасным літаратурным працэсам. Самым папулярным родам мастацкай літаратуры аказалася лірыка, жанр – верш. За 2020 год у газеце быў апублікаваны 691 верш, за 2021 – 745 вершаў, за 2022 – 595 вершаў, у 2023 – 858 вершаў, у 2024 – 222 вершы. Аўтары – сучасныя беларускія пісьменнікі, у тым ліку члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, творы якіх часта аб'ядноўваюцца ў рубрыкі «Мінскае абласное аддзяленне СПБ», «Віцебскае абласное аддзяленне СПБ» і г.д.

Вершы звычайна малыя па памеры і займаюць адну газетную паласу (радзей – дзве), чым могуць быць выкліканы такія вялікія лічбы. Напрыклад, аўтары перыядычна звяртаюцца да традыцыйнага японскага хайку, жанру, які складаецца з трох радкоў. У адной публікацыі можа знаходзіцца да 30 хайку (21 хайку Сані Малея было апублікавана ў № 4 29 студзеня 2021). Таму трэба адзначыць, што ў дадзеным выпадку значным і паказальным з'яўляецца факт наяўнасці пастаяннай рубрыкі «Паэзія» і рэгулярнасці публікацыі паэтычных твораў, а не іх колькасць.

У рубрыках «Дыпламатыя перакладу», «Мерыдыяны лучнасці» друкуюцца пераклады вершаў з чувашскай, польскай, украінскай, рускай, марыйскай, туркменскай, узбекскай моў; за 2020 год было перакладзена 145 вершаў, за 2021 – 54 вершы і 2 апавяданні («Гняздо ластавак», «На самалёце» Джумагельды Мулкіеў); за 2022 – 6 вершаў, за 2024 – 93 вершы і 2 урыўка з раманаў.

Тры разы аўтары звярталіся да ліра-эпічных твораў: 2021 годзе быў апублікаваны ўрывак з паэмы «Нясвіж» Ізяслава Катлярова (№ 42 22 кастрычніка 2021); у 2020 – таксама ўрывак з паэмы, у 2022 – басня.

Сярод эпічных жанраў часцей за ўсё публікаваліся замалёўкі – кароткія сачыненні або аповеды, дзе апісаны сцэны з жыцця, персанажы або ўражанні аб якой-небудзь гісторыі. За 2020 год на старонках газеты апынулася 140 замалёвак, за 2021 – 126, за 2022 – 69, за 2023 – 172, за 2024 – 43. Наступным жанрам па папулярнасці з'яўляецца апавяданне: у 2020 – 42, у 2021 – 27, у 2022 – 17, у 2023 – 24, 2024 – 5. За перыяд даследавання ў газеце друкаваліся такія пісьменнікі, як Антон Піліпчык, Маргарыта Латышкевіч, Алесь Марціновіч («Пацалунак у летнім лесе» № 24 18 чэрвеня 2021), Алесь Аляшкевіч («Чарныш» № 15 16 красавіка 2021), Таіса Сямёнава («Нуда зялёная» № 9 сакавіка 2021), Таша Шпакоўская («Дахі ўнутры» № 34 26 жніўня 2022) і інш.

Таксама ў рубрыцы «Проза» размяшчаюцца ўрыўкі з казак, навел, аповесцей і раманаў, хаця са значна меншай частатой. Так, у 2020 годзе было апублікавана 2 урыўкі з аповесцей, 3 з раманаў і 1 казка; у 2021 – 2 урыўкі з аповесцей, 5 з раманаў і 3 казкі («Жабін і каралеўна» Ганны Навасельцавай, № 48 3 снежня 2021; «Чаму Дукоры такую назву маюць», «Як Пухавічы сваю назву атрымалі» Генадзя Аўласенкі, № 25 25 чэрвеня 2021); у 2022 – 3 урыўкі з аповесцей («Высакосны год» Віктара Казько № 39 30 верасня 2022); («Лаліта з горада Р.» Валянціны Кадзетавай, № 35 2 верасня 2022) і 3 з раманаў («Хутар» Уладзя Прона, № 42 21 кастрычніка 2022); («Суры ці Белы бык залатыя рогі» Сяргея Трахімёнка, № 33 19 жніўня 2022); («Неаніла» Зінаіды Дудзюк, № 26 1 ліпеня 2022), 1 навела; у 2023 – 3 навелы, 3 казкі, 4 урыўкі з аповесці і 7 урыўкаў з раманаў («Каб не было позна» Уладзіміра Гаўрыловіча № 17 28 красавіка 2023); («Людзі з нашага пад'езда» Аляксандра Сакалова № 31 4 жніўня 2023); («Дзяцінства Георгія Марчука» № 35 1 верасня 2023); («Настаўнік» Уладзіміра Навумовіча № 43 27 кастрычніка 2023), у 2024 – 3 з аповесці і 2 з раманаў.

Нетыповы для газеты эпісталярны жанр быў прадстаўлены Уладзімірам Ліпскім («Душа крыляе ў днях памяці» – дзённік пісьменніка № 28 15 ліпеня 2022) і Віктарам Шніпам («Далёкае красавіцкае. Дзённікавыя нататкі» № 14 7 красавіка 2023). У 2020 годзе аўтарамі было прадстаўлена 14 афарызмаў, у 2022 – 21. Драматургічныя творы ў газеце «Літаратура і мастацтва» ў перыяд з 2020-2023 г.г. не публікаваліся.

Для знаёмства аўдыторыі з новымі артэфактамі і выпрацоўвання ў яе адносін да іх у газеце «Літаратура і мастацтва» друкуюцца рэцэнзіі і артыкулы. Артыкулы публікуюцца рэгулярна, па тэматыцы іх можна падзяліць наступным чынам.

Першая група – артыкулы, прысвечаныя розным плыням культуры і гісторыі, мовазнаўству. За 2020 год было надрукавана 73 такія артыкулы, за 2021 – 77, 2022 – 64, 2023 – 48, 2024 – 16. Шэраг тэм разнастайны. Напрыклад, асобная ўвага аддаецца гісторыі музеяў, бібліятэк, архіваў, выдавецтваў, навучальных устаноў і пад. Напрыклад, Полацкаму Музею беларускага кнігадрукавання («Ад бяросты да інфакіёска» № 35 18 верасня 2020), Мастацкаму музею імя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі ў Бялынічах («Жывапісны дом» № 20 29 мая 2020), Фундаментальнай бібліятэцы БДУ («Лесвіца векавой гісторыі» № 22 4 чэрвеня 2021), выдавецтву «Беларусь» («Выдавецтву «Беларусь» — 100 гадоў!» № 3 22 студзеня 2021) і інш. Адметнай рысай такіх артыкулаў з'яўляецца тое, што ў іх разглядаецца не толькі гістарычны пласт, але і сучасны стан устаноў, іх дзейнасць і г.д. У 2020 годзе ў нумарах 23, 24, 26, 27, 28 выйшаў цыкл артыкулаў рэжысёра, кандыдата мастацтвазнаўства Максіма Сохара да стагоддзя Беларускага

акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы («Здольнасць адлюстраваць жыццё»), у якім падрабязна разглядаецца гісторыя тэатра.

Выключна гістарычную інфармацыю (даты, выбітныя дзеячы і пад.) змяшчаюць артыкулы накшталт «Рытмы і рыфмы друкарскага станка» (№ 51 24 снежня 2021) пра значных асоб выдавецкай дзейнасці Францыска Скарыну і Марціна Кухту, «Аматары навук і дабрачыннасці. Так называлі філаматаў і філарэтаў тайнага студэнцкага таварыства» (№ 20 29 мая 2020) пра дзейнасць філаматаў і філарэтаў і інш.

Асобна вылучаюцца матэрыялы, прысвечаныя розным плыням мастацтва, як кінаіндустрыя, напрыклад, размешчаны артыкул «Не проста творы — кавалкі гісторыі» (№ 4 29 студзеня 2021) пра класіку беларускага кінематографа з нагоды рэстаўрацыі асобных стужак і размяшчэнню іх на YouTube; архітэктура, напрыклад, артыкулы «Страчаны геній» (№ 45 27 лістапада 2020), «Паўночны тропік Няміга» (№ 36 25 верасня 2020), у якіх паказана рэтраспектыва: гісторыя, архітэктурная своеасаблівасць, сённяшні стан будынкаў на праспекце Незалежнасці і на Нямізе і інш.

У газеце рэгулярна друкуюцца мовазнаўчыя артыкулы Пятра Жаўняровіча, як «Блішча(э)лі зоркі» (№ 29 23 ліпеня 2021), «У малацэ, на дварэ, у вядры…» (№ 4 29 студзеня 2021) пра граматычную варыянтнасць дзеяслоўных формаў, пра варыянты канчаткаў назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду ў месным склоне адзіночнага ліку, «Як быць з «рыскам»?» № 48 18 снежня 2020) і г.д. Таксама варта адзначыць яго літаратуразнаўчыя працы, напрыклад, «Хто гэта збіраецца мяне рэдагаваць?» (№ 45 27 лістапада 2020), у якім прадстаўлена даследаванне фрагментаў твораў У. Караткевіча, якія выразаліся Галоўлітам і іх класіфікацыя.

Нячаста, але сустракаліся на старонках газеты праблемныя артыкулы, напрыклад, «Ці патрэбна перабудова ў выкладанні літаратуры?» Таццяны Шамякінай (№ 48 1 снежня 2023), «Ці патрэбна нам цэнзура?» (№ 49 8 снежня 2023) і «Дзе вырошчваюць крытыкаў? » (№ 36 8 верасня 2023) Алены Кісель. Артыкулы ўтрымліваюць жанравыя прыметы, выведзеныя даследчыкамі. Так, праблема, якая ставіцца, актуальна не толькі для саміх аўтараў, а і для грамадства ў цэлым. Таксама ў тэкстах ёсць даследчыя асновы: аўтары выяўляюць прычыны ўзнікнення праблемы, спрабуюць прагназаваць далейшае яе развіццё, прапанаваць выйсце. Для раскрыцця тэмы прыводзяцца канкрэтныя факты, падзеі, з’явы, гістарычныя даведкі і статыстычныя дадзеныя. Больш таго, у прыведзеных праблемных артыкулах высокая ступень праяўлення аўтарскага «я», публіцысты даволі ярка выражаюць свае меркаванні, даюць ацэнкі культурным з’явам і працэсам, пра якія пішуць, і ў залежнасці ад схемы напісання ў пачатку ці ўжо напрыканцы тэксту

выражаюць сваю пазіцыю. Менавіта такія матэрыялы граюць вялікую выхаваўчую і пазнавальную ролю для аўдыторыі газеты.

Другая група – артыкулы, прысвечаныя жыццю і творчасці дзеячаў культуры, дзейнасці гістарычных асоб, змяшчаюцца ў рубрыках «Аўтарытэты», «Асоба», «Прызма часу», «Асоба ў гісторыі», «Дарагія імёны», «Кніжны свет», «Юбілей», «ЛіМ»-эксклюзіў», «Музыка», «Тэатр» і інш. Так, у 2020 годзе было апублікавана 119 артыкулаў, у 2021 – 113, у 2022 – 126, у 2023 – 98, 2024 – 29. Героі артыкулаў – пісьменнікі (Андрэй Макаёнак, «Эпоха Макаёнка» № 43 13 лістапада 2020), спевакі (Сяргей Франкоўскі), кампазітары (Уладзімір Солтан), фатографы (Ян Булгак, «Дух вечнай Айчыны» № 40 8 кастрычніка 2021, Вячаслаў Алешка № 52 31 снежня 2021), скульптары (Андрэй Бембель, «Міф у бронзе і камені» № 41 30 кастрычніка 2020), артысты («Юрый Траян. Кардынал-балет» № 40 23 кастрычніка 2020), заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Грушоў («Жыццёвая праўда — у сцэнічных вобразах» № 39 16 кастрычніка 2020), балетмайстар Валянцін Елізар’еў («Вялікі чалавек Вялікага тэатра» № 41 13 кастрычніка 2023) і інш. Як правіла, у такіх артыкулах змяшчаюцца біяграфічныя звесткі, некаторая інфармацыя пра творчасць, яе агляд, аналіз, вылучэнне асобных фактаў і момантаў. У некаторых выпадках акцэнт робіцца менавіта на творчай спадчыне дзеяча, як у артыкуле пра Віктара Гардзея («Засевак жывых астравоў» № 32 13 жніўня 2021). Дадзеныя артыкулы падобныя на жанр творчага партрэта, але ўсё ж такі ў іх прэваліруе інфармацыйная складальная: часта аўтары канцэнтруюцца толькі на біяграфічных звестках творцы, могуць рабіць агляд творчасці проста як часткі мастацтва, без аналізу прычын папулярнасці і ўплыву на культурны працэс, але часта з дадаткам асабістых уражанняў і меркаванняў наконт важнасці фігуры дзеяча. Але ў артыкулах часта прысутнічае ўласцівая творчым партрэтам аналітычная ацэнка ўплыву і сувязі падзей у жыцці творцы і створаных ім артэфактаў (асабліва кранае тэма пераезду ў іншую мясцовасць). Так, у цэлым матэрыяле можа апавядацца пра сувязь асобы з нейкім месцам, напрыклад, Багдановіча з Рыбінскам («Рыбінск — горад хлебны» № 47 26 лістапада 2021), Якуба Коласа з Палессем («Якуб Колас на Палессі: лунінецкія адкрыцці» 12 жніўня 2022).

Звычайна ў рубрыцы «Зямля пад белымі крыламі» публікуюцца артыкулы, прысвечаныя беларускім гарадам, вёскам і пад. За 2020 год было надрукавана 10 падобных артыкулаў, напрыклад, «Культурныя скарбы Магілёўскай вобласці» (№ 33 4 верасня 2020), за 2021 – 6 («Турыстычная карта Магілёўшчыны» № 38 24 верасня 2021), за 2022 – 7 («Морач — вёска талентаў» № 43 28 кастрычніка 2022), за 2023 – 2. Яны спалучаюць у сабе гістарычныя і этнаграфічныя звесткі, аповеды жыхароў і ўражанні аўтара.

Сітуацыя з літаратурна-мастацкай крытыкай у газеце вылучаецца сваёй неаднароднасцю і адыходам ад традыцый. Так, за даследаваны перыяд у газеце было 442 рэцэнзіі на творы мастацкай літаратуры, 289 – на выяўленчае мастацтва, 79 тэатральных рэцэнзій, 35 кінарэцэнзій, 13 музычных рэцэнзій.

<u>У 2024 годзе (са студзеня па красавік) было апублікавана рэцэнзій на (Дадатак А):</u>

- **Выяўленчае мастацтва** – 16
- **Творы мастацкай літаратуры** – 19
- **Тэатр** – 5
- **Кіно** – 1

<u>За 2023 год (Дадатак Б):</u>

- **Выяўленчае мастацтва** – 87
- **Творы мастацкай літаратуры** – 55
- **Тэатр** – 21
- **Кіно** – 6

<u>За 2022 год (Дадатак В):</u>

- **Выяўленчае мастацтва** – 95
- **Творы мастацкай літаратуры** – 101
- **Тэатр** –13
- **Кіно** – 12

<u>За 2021 год (Дадатак Г):</u>

- **Выяўленчае мастацтва** – 53
- **Творы мастацкай літаратуры** – 121
- **Тэатр** – 19
- **Кіно** – 10

<u>2020 год (Дадатак Д):</u>

- **Выяўленчае мастацтва** – 38
- **Мастацкая літаратура** – 146
- **Тэатр** – 21
- **Кіно –** 6
- **Музыка** – 13

Галоўнай асаблівасцю ўсіх матэрыялаў, адзначаных як рэцэнзія, з’яўляецца ўмоўнасць гэтага азначэння. У мастацкіх рэцэнзіях залішне аддаецца ўвага біяграфічным звесткам пра жыццё мастакоў, скульптараў і пад., апісанню і ўражанням ад пабачанага, а не аналізу твораў. Паказальным з’яўляецца ўрывак з рэцэнзіі на выставу Віктара Маркаўца («Агульначалавечае і рамантычнае. Асаблівасці творчага почырку» № 6 14 лютага 2020): «Работы Віктара Маркаўца дэманструюць прыгожыя, цікавыя краявіды, унікальныя беларускія мясціны, што дае шанс гледачу ўспомніць таксама і свой дом, гісторыю роднага краю, зірнуць інакш на звыклыя пейзажы

і натхніцца прыгажосцю». Аўтар матэрыялу Вікторыя Аскера выкарыстоўвае пафасныя і банальныя выразы, пры гэтым не ўнікае ў адметнасць і непаўторнасць творчасці мастака.

Сярод паўнавартасных рэцэнзій трэба адзначыць матэрыял Дар’і Смірновай «Манумэтры і мануметафары» (№ 25 25 чэрвеня 2021). Тут аўтар як апісвае свае эмоцыі, так і аналізуе экспазіцыю: гістарычны кантэкст стварэння твораў мастацтва для фестывалю, укладзены падтэкст і асабісты культурны пласт мастака. Дар’я Смірнова разглядае творы паасобку з погляду іх наватарства, дачынення да плыняў і напрамкаў жывапісу і скульптуры, спрабуе вызначыць аўтарскую задуму і кампазіцыйную логіку ўсёй выставы. У публікацыі «Рэчаіснасць прыроды» (№ 29 7 жніўня 2020) таксама прадстаўлены менавіта аналіз творчасці Уладзіміра Канцадайлава: тэхнік, стыляў, напрамкаў, сюжэтаў карцін, палітры і інш.

Рэцэнзіі на творы мастацкай літаратуры друкуюцца як з нагоды выхаду ў свет новых выданняў, так і з нагоды юбілеяў класікаў ці публікацый. Так, у публікацыі «Рамантык і бурапенны час» (№ 17 29 красавіка 2022) рэцэнзуюцца «Выбраныя творы» Міхася Зарэцкага. Рэцэнзіі выходзяць не толькі на творы беларускіх аўтараў, але і замежнікаў: на «Канец адзіноты» Януша Вішнеўскага («Каханне і самота» № 5 5 лютага 2021). Таксама аналізуюцца артыкулы ў часопісах (з «Роднага слова» – «Знаходкі і даляглядзы», № 41 14 кастрычніка 2022, з часопіса «Спадчына» № 37 16 верасня 2022), букіністычныя выданні («Вернасць братэрству і дружбе», № 29 22 ліпеня 2022). У 2021 і 2020 г.г. вялася практыка рэгулярнага рэцэнзавання твораў, якія выходзілі ў часопісах «Нёман», «Маладосць», «Полымя», напрыклад, на апавяданне Сяргея Календы «Джустус, вялікі і непакорны» («Нёман Сіла, воля і непакорнасць» № 52 31 снежня 2021), на падборку вершаў Міколы Маляўкі «У лепшы час» («Нізка лістоты з недапісанай восені» № 41 30 кастрычніка 2020).

Сярод крытычных работ можна адзначыць працы Дар’і Смірновай. У рэцэнзіі «Лабараторная чысціня і музычная дысцыпліна» (№ 45 27 лістапада 2020) аўтар аналізуе структуру і знешні выгляд зборніка, часткі паасобку, стылістыку, тропы вершаў. У публікацыі «Напярэдадні квітнення. Як трапіць у літаратуру новаму голасу» (№ 6 14 лютага 2020) яна праводзіць паралелі з іншымі мастацкімі творамі, разглядае сам тэкст: «У падборцы вершаў Аляксандра Бондарава ў першую чаргу заўважаецца своеасаблівая, у нечым нават архаічная лексіка першага тэксту. Магчыма, гэта і ёсць аўтарская спроба стварыць нейкую сярэбранавечную карціну. У астатніх тэкстах такая асаблівасць знікае, але застаецца фрагментарнасць апісанняў, фіксаванне погляду на канкрэтных элементах і прадметах».

Рэцэнзіі публікуюцца ў рубрыках «Кніжны свет», «Крытыка» і інш. У рубрыцы «ЛіМ»-прэзентацыя» друкуюцца матэрыялы, якія сапраўды можна

адзначыць як «прэзентацыя»: у іх расказваецца пра навінкі ў кніжным свеце, часта ёсць рэкламны падтэкст, перадаецца змест (анатацыя) і часам уражанні (як правіла, хвалебныя). У тым ліку робіцца «прэзентацыя» навінак Выдавецкага дома «Звязда» і іншых выдавецтваў, напрыклад, на новае выданне аповесці Аляксандра Чурылава «Мы влюбляемся в свое время. Журналистские хроники» («Што выйшла ў выдавецкім доме «Гомельская праўда»); «Выдавецкі дом «Звязда» працягвае радаваць кніжнымі навінкамі: Кірыл Руды «Непадобныя: погляд на Кітай і беларуска-кітайскія адносіны», Алесь Жук «Лаві зайца!», Вольга Нікольская «Свецік: падарожжа ў Сетцы» Падарожжы і не толькі ад Выдавецкага дома «Звязда» (№ 7 19 лютага 2021). У 2024 годзе было апублікавана 28 прэзентацый, у 2023 – 101, у 2022 – 60, у 2021 – 92, у 2020 – 96 (усяго 377). Важна адзначыць, што кантэнт рубрык «Крытыка» і «ЛіМ»-прэзентацыя» перамяжоўваецца, і вызначыць дакладна, ці то рэцэнзія, ці то «прэзентацыя» амаль немагчыма.

У раздзелах тэатральнай крытыкі і кінакрытыкі публікавалася значна менш рэцэнзій у параўнанні з крытыкай твораў візуальнага мастацтва і літаратуры. Тэатральныя рэцэнзіі друкаваліся з нагоды выхаду прэм’ер, напрыклад, спектакля «Браты Карамазавы» ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага («Сцэнічная інтэрпрэтацыя класікі» № 46 19 лістапада 2021), балета «Канёк-Гарбунок» на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі («Ода радасці ды каханню» № 44 5 лістапада 202), новай версіі оперы Уладзіміра Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха» (№ 28 16 ліпеня 2021), оперы «Фаўст» («Фаўст» — паміж ілюзіяй і рэальнасцю» № 46 4 снежня 2020). Пры гэтым часта сустракаліся матэрыялы, якія больш нагадвалі нататкі («Гісторыі пра каханне і міласэрнасць, Бацькі, дзеці, грошы» № 19 13 мая 2022) ці анатацыю («Навука бачыць сэрцам» № 5 5 лютага 2021; «Вяртанне ў святло рампы» № 35 18 верасня 2020), г.зн. у іх пераказваўся сюжэт, пералічаліся акцёры і пастаноўшчыкі, але не рэцэнзаваўся твор.

За перыяд, які даследаваўся, у газеце былі апублікаваны 3 матэрыялы выключнага жанру, які амаль не сустракаецца на старонках перыядычнага друку. Пад агульнай рэдакцыяй Таццяны Прановіч выйшлі калектыўныя рэцэнзіі: «Тэатральныя ўражанні першакурснікаў журфака – 2021» (№ 27 9 ліпеня 2021), дзе аўтарамі выступілі 19 чалавек, «Тэатральныя ўражанні першакурснікаў журфака — 2020» – 15 аўтараў (№ 11 20 сакавіка 2020), «Тэатральныя ўражанні першакурснікаў журфака» – 20 аўтараў (№ 28 15 ліпеня 2022). Гэтыя матэрыялы складаюцца з урыўкаў рэцэнзій першакурснікаў, якія разам складаюць паўнавартасную карціну, дзе ўражанні аднаго рэцэнзента дапаўняюцца эмоцыямі і назіраннямі іншага.

Кінарэцэнзіі за дадзены перыяд пісаліся на навінкі, што былі прадстаўлены на фестывалях ці стварылі шырокі грамадскі рэзананс з нагоды свайго выхаду («Ён перастаў чуць людзей» № 42 6 лістапада 2020, «Дау». Дэканструкцыя» № 39 16 кастрычніка 2020). У гэтым раздзеле таксама не ва ўсіх публікацыях прытрымліваліся канонаў напісання рэцэнзій, таму некаторыя з іх можна дакладна класіфікаваць як анатацыі, бо ўтрымліваюць толькі звесткі пра змест. Такіх было 7 ў 2021 годзе, напрыклад, пра 74-ты Канскі кінафестываль («Вялікае кінаспаборніцтва» № 29 23 ліпеня 2021), пра IX фестываль нямога кіно і жывой музыкі «Кінямо» («Мінск не спіць» № 27 9 ліпеня 2021); 5 у 2020-м, як пра фестываль кіно Паўночных і Балтыйскіх краін «Паўночнае ззянне» («Барацьба з дрэннымі звычкамі» № 42 6 лістапада 2020).

2020 год быў адзначаны працамі крытыка Цімура Вычужаніна, які публікаваў рэцэнзіі на музычныя творы. Ён аналізаваў як навінкі сучасных спевакоў, так і прэм’еры новага сезону ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі («Баланс паміж хаосам і гармоніяй, або Рака, што ўпадае ў мора, дзе бушуе шторм» № 38 9 кастрычніка 2020).

### 3.2 Жанрава-тэматычная адметнасць часопіса «Мастацтва»

Часопіс «Мастацтва» – штомесячнае грамадска-асветніцкае выданне, заснавальнікам якога з’яўляецца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Галоўны рэдактар – Вераніка Іванаўна Клютчэня.

У часопісе прысутнічае пастаяннае раздзяленне на рубрыкі суадносна с плынямі мастацтва – «Візуальныя мастацтвы», «Тэатр», «Музыка», «Кіно».

Падзейны пласт культурнага жыцця адлюстроўваецца ў двух жанрах. Па-першае, гэта нататкі, якія з’яўляюцца непапулярным жанрам у часопісе, за перыяд з 2020 па красавік 2024 года іх было 13 (3 у 2024, 1 у 2023, 9 у 2022). Тэмамі станавіліся культурныя падзеі як беларускія, так і замежныя, такія як фестывалі («Кінаўрокі гісторыі» № 7 ліпень 2022, «Канферэнцыі, фестывальныя прызы і “Казбек”» № 6 чэрвень 2022), кінапаказы, прэм’еры, здымкі новых фільмаў («Сіла адзінства» № 10 кастрычнік 2022) і пад. У 2020 годзе выхадзіла рубрыка «Арт-дайджэст», дзе прыводзілася падборка навін і анонсаў пра замежныя культурныя мерапрыемствы. Выйшла 9 нататак пра сферу выяўленчага мастацтва, 13 – пра музыку, 5 – пра тэатр 5, 14 – пра кіно. Усе нататкі даволі сціслыя, змяшчаюць асноўную інфармацыю. Таксама можна было знайсці пашыраныя нататкі – «Адказнасць за выбар» (№ 12 снежань 2023), «Толькі музыка і тэкст» (№ 3 сакавік 2024). У апошнім апавядаецца пра сцэнічнае чытанне паэмы «Сымон-музыка» ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. У такіх нататках ёсць асноўныя прыметы жанру – навізна, фактaлагічнае напаўненне (што адбылося,

дзе, звестак пра час няма), а таксама прысутнічаюць ацэначныя меркаванні аўтара, але яны недастаткова разгорнутыя і структураваныя для рэцэнзіі.

Больш прэзентатыўным з'яўляецца жанр агляду, у якім не проста адлюстроўваецца інфармацыя пра месца і час падзеі, а даецца даволі падрабязнае яе апісанне і нават вывучэнне, вызначаюцца вынікі і тэндэнцыі. Публікуюцца матэрыялы ў рубрыках «Гастролі», «Фестываль», «АРТ-факт», «Дыялог культур». Рэдакцыя больш за ўсе выпусціла аглядаў на тэатральныя падзеі , усяго за перыяд з 2020 года па красавік 2024 іх выйшла 48 (5 у 2024, 14 у 2023, 6 у 2022, 7 у 2021, 16 у 2020). Тэмамі аглядаў выступалі Міжнародны маладзёжны тэатральны форум «M.@rt.кантакт» («Тэатры ўсіх краін, кантактуйце!» № 4 красавік 2024), Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа» («Белая вежа – каляровыя прыступкі» № 10 кастрычнік 2023, «Белая Вежа: рэальнасць гістарычнай памяці» № 11 лістапад 2022), Міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ» («...І немагчыма паставіць на паўзу» № 11 кастрычнік 2020), Рэспубліканскі конкурс тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» («Спектаклі, пвытанні, тэндэнцыі» № 12 снежань 2023), Рэспубліканскі фестываль беларускай драматургіі («Бабруйск. Драматургія. Фестываль» № 12 снежань 2022).

Агляды на выставы з'яўляліся радзей – 23 разы (5 за 2023, 5 за 2022, 5 за 2021, 8 за 2020). Тэмамі былі Рэспубліканская выстава акварэлі («Краявід, нацюрморт, партрэт…» № 9 верасень 2023), выстава «Вогнепадобныя і агняпальныя… ікона веткі» ў Нацыянальным мастацкім музеі («Код агню» № 9 верасень 2021), юбілейная выстава Анатоля Арцімовіча («Манументальныя вобразы эпох» № 10 кастрычнік 2020), дзве выставы Ігара Саўчанкі ў Галерэі ДК («Як гучыць паўза» № 11 лістапад 2020), трыенале «Дэкарт-2022» («Традыцыі і наватарства» № 2 люты 2023, № 3 сакавік 2023).

Агляды на кінафестывалі і кінапрэміі таксама публікаваліся 23 разы (1 у 2023, 3 у 2022, 15 у 2021, 4 у 2020), увага аўтараў была звернута да Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» («Кіналісце залатое белым снегам замяло» № 12 снежань 2023, «За новым лісцем» № 12 снежань 2021), Міжнароднага фестывалю дакументальнага кіно «Visions du Reel» («Visions du Reel-2022: Планета людзей» № 5 май 2022, «Шчыры сусвет» № 5 май 2021), Міжнароднага кінафестывалю ў Ратэрдаме («Ратэрдам-2022: не ўбачыць такога больш нідзе» № 2 люты 2022), Кракаўскага міжнароднага кінафестывалю («Кракаў-2021: Чужога кіно не бывае» № 6 чэрвень 2021) Таксама сустракаліся агляды на групу твораў, падобныя да рэцэнзіі, дзе аналізаваліся працэсы ў мастацтве, выяўляліся заканамернасці і тэндэнцыі. Так, у матэрыяле «Стужка даўжынёю ў жыццё» (№ 7 ліпень 2021) разглядаліся беларускія серыялы, у аглядзе «Мама выйшла замуж» (№ 10 кастрычнік 2021)

– кіно 1970-х, у публікацыі «Плённы час на шляху да ўздыму» (№ 1 студзень 2021) – кіно 2010-х.

Агляды на падзеі ў свеце музыкі публікаваліся 18 разоў (4 у 2024, 2 у 2023, 6 у 2022, 7 у 2021, 5 у 2020) з нагоды буйных фестываляў, конкурсаў, як Вечар беларускіх прэм'ер («Беларускія сусветныя прэм'еры» № 3 сакавік 2024), Міжнародны конкурс піяністаў «Мінск-2021» («Чорна-белыя баталіі з фінальнай інтрыгай» № 1 студзень 2022), Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне («Ars longa, vita brevis» № 7 ліпень 2022), Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» («Сем адкрыццяў» № 6 чэрвень 2022), Міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі» («Яднаючы мінулае і будучыню» № 12 снежань 2020).

Візітнай карткай часопіса з'яўляюцца рэцэнзіі. Усяго за перыяд з 2020 па красавік 2024 было апублікавана 79 тэатральных рэцэнзій, 103 рэцэнзіі на візуальныя мастацтвы, 21 – на музычныя творы, 24 кінарэцэнзіі. Больш падрабязна можна прасачыць, на якія плыні мастацтва звяртала ўвагу рэдакцыя часопіса ў канкрэтныя перыяды:

<u>У 2024 годзе (у перыяд са студзеня па красавік) было апублікавана рэцэнзій на (Дадатак Е):</u>

- **Візуальныя мастацтвы – 5**
- **Тэатр – 6**
- **Музыка – 0**
- **Кіно – 0**

<u>За 2023 год (Дадатак Ж):</u>

- **Візуальныя мастацтвы – 22**
- **Тэатр – 19**
- **Музыка – 3**
- **Кіно – 0**

<u>За 2022 год (Дадатак І):</u>

- **Візуальныя мастацтвы – 23**
- **Тэатр – 14**
- **Музыка – 4**
- **Кіно – 4**

<u>За 2021 год (Дадатак К):</u>

- **Візуальныя мастацтвы – 27**
- **Тэатр – 15**
- **Музыка – 9**
- **Кіно – 6**

<u>2020 год (Дадатак Л):</u>

- **Візуальныя мастацтвы – 26**
- **Тэатр – 25**

- **Музыка – 5**
- **Кіно – 14**

У раздзеле «Візуальныя мастацтвы» для зручнасці абагульняюцца ў першую чаргу выяўленчае мастацтва і фатаграфія. У рубрыцы публікуюцца крытычныя матэрыялы аўтараў рэдакцыі на выставы сучасных мастакоў, напрыклад, на экспазіцыю «Designatum» у Галерэі Міхаіла Савіцкага («Узроўні скульптурнай прасторы» № 12 снежань 2021), экспазіцыю «Палова» Сямёна Маталянца ў НЦСМ («Вырываючыся з туману невызначанасці» № 10 кастрычнік 2021), выставу «Поп-арт» у галерэі LIBRA («Вэрхал ад Уорхала» № 4 красавік 2020), выставу «Доўгая дарога дамоў» у НЦСМ («Пластык забыцця» № 7 ліпень 2020), а таксама на фотавыставы, як у матэрыяле «Нябачныя героі сярод нас» (№ 2 люты 2024), фатаграфіі-пераможцы «Word press photo» 2021 года («Пра палёты, межы цела і самаабарону» №12 снежань 2021). Таксама ў 2022 годзе практыкавалася куратарская рэцэнзія ў аднайменнай рубрыцы, напрыклад, матэрыял «Факусіроўка, адлюстраванне, пераламленне» (№ 12 снежань 2021) куратара выставы Аляксандра Балдакова ў Палацы мастацтва Ірыны Варкулевіч.

Тэатральныя рэцэнзіі сустракаюцца вельмі часта, аўтары звяртаюць увагу як на прэм’еры сталічных тэатраў («Зацемкі юнага лекара» ў Дзяржаўным тэатры лялек («Непрамоўлены абавязак» № 5 май 2021), «Анфіса» ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры ім. М. Горкага («“Анфіса”: немеладрамны сімвалізм (і сімфанізм!)» № 3 сакавік 2024), «Мікалаша» ў Дзяржаўным тэатры лялек («Невыносная пошласць жыцця» № 1 студзень 2021)) і рэгіянальных («Соня» Магіёўскага абласнога драматычнага тэатра («Проста «Соня» і сусвет» № 9 верасень 2023), («Гомель – горад тэатральны» № 11 лістапад 2023)).

Музычныя рэцэнзіі з’яўляюцца на старонках «Мастацтва» рэдка, як правіла, гэта прэм’еры Беларускай дзяржаўнай філармоніі («Ладдзя Роспачы» ў моры радасці №3 сакавік 2023). Часта аўтарамі аналізуецца музыка і выкананне оперных выканаўцаў як частак тэатральнай пастаноўкі (оперы, мюзіклаў і пад.), напрыклад, матэрыял пра прэм’еру «Нявесты з Імерэтыі» («Падзяліць каханне ці маёмасць?» № 7 ліпень 2022). Такі аналіз можа з’яўляцца часткай тэатральнай рэцэнзіі, а можа быць і самастойнай музычнай рэцэнзіяй, калі акцэнтуецца ўвага на рабоце кампазітара, дырыжора, вакальных выкананых.

Кінарэцэнзіі з’яўляліся на старонках часопіса ў 2020-2022 гадах. У той час рэцэнзаваліся фільмы, што перамаглі ў замежных кінапрэміях, напрыклад у расійскай прэміі «Залаты арол» (рэцэнзія Алены Страхавай «Паглядзі і застанься» № 7 ліпень 2021 на польскі фільм «Забі і пакінь гэты горад»), прэм’еры Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» (рэцэнзія «Поўнае

вяртанне памяці» № 8 жнівень 2021 Канстанціна Грыкіна на анімацыйную стужку «263 ночы», Антона Сідарэнкі «Ключавое слова» № 3 сакавік 2020 на фільм «Абход» і інш.). Таксама існавала рубрыка «Пільнае вока Антона Сідарэнкі», дзе публікаваліся падборкі міні-рэцэнзій аўтара на фільмы «А хто там ідзе», «Тато» і інш.

Галоўнай асаблівасцю аўтарскага стылю Антона Сідарэнкі з’яўляецца тое, што самыя выбітныя свае думкі ён выражае з дапамогай параўнання: «Паслядоўна і, на першы погляд, нетаропка, праз прыпынкі і перашкоды, прыкрасць і расчараванне рэжысёр адкрывае чарговую «беларускую Атлантыду», гэтаксама, як участковы Клімята праз дождж і вецер паслядоўна і метадычна аб’язджае свой родны кут» («Ключавое слова» № 3 сакавік 2020). «На першы погляд, шматлікія персанажы «Нябачанага раю» нібы тыя запаведныя волаты, спакойныя ды індыферэнтныя да свайго шматгадовага становішча» («Нябачаны рай» № 5 май 2020). «Яны нібы сашлі са старонак прозы самога Уладзіміра Казлова — лапідарнай ды гранічна жорсткай і да персанажаў, і да рэчаіснасці, і да пачуццяў чытача» («Тры таварышы» № 5 май 2020).

Пры дапамозе параўнання Антон Сідарэнка ставарае зразумелыя і запамінальныя вобразы. Такім чынам, чытач хутчэй прыгадае, пра што пісаў крытык, і здолее праводзіць ужо свае паралелі (са сваім жыццём, жыццём блізкіх і родных і інш.).

Таксама аўтар даволі часта ўжывае антытэзу: «Фільм гучыць як эпітафія былому, у якім відаць будучыню» («Эпітафія» № 5 май 2020). «Разам з участковым Клімятам глядач на сорак хвілін зазірае па той бок дабра і зла, бачыць сітуацыі ды постаці, ад якіх законапаслухмяны абывацель у паўсядзённым жыцці звычайна адварочваецца» («Ключавое слова» № 3 сакавік 2020). «Большымі бюджэтамі і меншым сэнсам» («Тры таварышы» № 5 май 2020).

У 2022 годзе рэцэнзіі ў аўтарскім раздзеле Антона Сідарэнкі замянілі на матэрыялы Наталлі Сцяжко ў рубрыцы «Кіно незалежнай Беларусі» пра фільмы, што здымаліся ўжо ў незалежнай Рэспубліцы («Глыбокая плынь часу» № 1 студзень 2024, «Супрацьстаянне характараў» № 12 снежань 2023, «Зменлівасці кахання» № 11 лістапад 2023, «Першае каханне Дунечкі» №11 лістапад 2022). У 2022 годзе выйшлі 4 такія матэрыялы, у 2023 – 12, у 2024 (са студзеня па красавік) – 3. Матэрыялы Наталлі Сцяжко хутчэй з’яўляюцца аглядамі, але некаторыя з іх змяшчаюць у сабе меншую долю аналітыкі, і ў іх аўтар дае прадстаўленне аб форме і змесце кінакарціны з дапамогай сюжэтнай анатацыі, а таксама выражае сваё меркаванне наконт адметнасці тэмы фільма, раскрыцця персанажаў акцёрамі, а таксама «закадравай» працы аператураў, мантажораў, мастацкага кіраўніка і г.д. Так, большую частку матэрыялу

«Класіка на тэлеэкране: “Талаш”» (№ 3 сакавік 2024) складаюць пераказ сюжэта і аналіз саміх персанажаў, а таксама параўнанне з першакрыніцай – мастацкім творам Якуба Коласа «Дрыгва». Больш таго, аўтар пакінула свае ўражанні пра работу здымачнай групы: «Нельга не адзначыць выдатную працу мастацкага кіраўніка гэтага фільма Генадзя Палокі, які разам з унікальным мантажорам Ірынай Аксёненка спрыялі стварэнню гэтай карціны». Больш падрабязна сутнасць іх працы менавіта над гэтым фільмам, унікальнасці манатажу не раскрываецца, а аператарская работа была адзначана як «добрая», бо адцягвала ўвагу ад няўдалай масоўкі, чый знешні выгляд не адпавядаў эпохе, у якой адбываецца дзеянне ў карціне. Больш змястоўным і напоўненым крытычнымі адзнакамі і меркаваннямі з’яўляецца матэрыял «Прыгоды лекара Парацэльса» (№ 2 люты 2024), які можна ідэнтыфікаваць як рэцэнзію. Тут таксама ёсць інфармацыя пра сюжэт, але яна не з’яўляецца пераказам, а хутчэй анатацыяй, дзе апісваецца зачын гісторыі. Наталля Сцяжко адзначае заганы кінакарціны, у тым ліку аўтар звяртае ўвагу на недахоп ідэйнай змястоўнай, што само па сабе з’яўляецца вялікім мінусам для дзіцячага фільма, а яшчэ і негатыўна адбіваецца на сцэнарыі, яго маналітнасці і паслядоўнасці. Агульнае ўражанне крытык выражае менш абстрактна, хаця яно не пазбаўлена вобразнасці, што дапамагае раскрыццю аўтарскага стылю: «Фільм нагадвае прыгожую, элегантную, але пустую пасудзіну. Не завершана думка, што не камп’ютары павінны рабіць хатнія заданні, а самі вучні. Тым не менш фільм адбыўся. Гісторыя ёсць, нягледзячы на мноства стылёвых і драматургічных недахопаў».

Даволі распаўсюджаным жанрам у «Мастацтве» з’яўляецца інтэрв’ю. Часцей за ўсё гэта матэрыялы інфармацыйнага, а не праблемнага характару, у іх раскрываецца творчы шлях і асоба таго ці іншага дзеяча культуры. Таксама тэмамі інтэрв’ю маглі станавіцца ідэйнае напаўненне, гісторыя стварэння таго ці іншага артэфакта мастацтва.

Усяго за перыяд з 2020 па красавік 2024 было апублікавана 62 інтэрв’ю з асобамі, якія звязаны з выяўленчым мастацтвам, фатаграфіяй і дызайнам (4 за 2024, 7 за 2023, 17 за 2022, 16 за 2021, 18 за 2020). Так, героямі матэрыялаў станавіліся мастацтвазнаўца Станіслаў Чавус («Яскравая мастацкая з’ява» № 3 сакавік 2024), куратар выставы «Залаты век беларускага іканапісу. XVII стагоддзе» Любоў Сысоева («Малітва ў фарбах» № 6 чэрвень 2022), мастацтвазнаўца Кацярына Кенігсберг («У пошуках сэнсу» № 7 ліпень 2022), мастачка Ганна Скромная («Хто такая Ганна Скромная» № 2 люты 2022), мастацтвазнаўца Крысціна Стрыкелава («Дызайн: творчасць скіравана на канкрэтны вынік» № 4 красавік 2022), мастачка Таццяна Кандраценка («Малы фармат на (не)бяспечнай адлегласці» № 8 жнівень 2020) і інш.

Дзеячы, звязаныя з тэатральным мастацтвам, інтэрв'юіраваліся 49 раз (5 за 2024, 9 за 2023, 12 за 2022, 14 за 2021, 9 за 2020), напрыклад, Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Марына Вежнавец («Марына Вежнавец: я не адна, у мяне каманда!» № 3 сакавік 2024), балетмейстар Валянцін Елізар'еў («Павінна жыць надзея і існаваць гармонія» № 10 кастрычнік 2023), рэжысёр Аляксандр Бародка («Натхніць і зацікавіць» № 12 снежань 2023), сцэнограф Лідзія Малашэнка («Сцэнічная магія» № 1 студзень 2023), балерына Кацярына Алейнік («Не ілюзія, а выратаваная прыгажосць» № 2 люты 2021).

Інтэрв'ю з асобамі, што звязаны з музыкай, сустракаліся значна радзей – за перыяд з 2020 па красавік 2024 усяго 18 раз (1 за 2024, 3 за 2023, 7 за 2022, 2 за 2021, 5 за 2020). Так, пра сябе і сваю творчасць распавядалі мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі Яўген Бушкоў («Музычныя разважанні Яўгена Бушкова» № 12 снежань 2023), мастацкі кіраўнік Белдзярджфілармоніі Юрый Гільдзюк («Філарманічная прастора Юрыя Гільдзюка» № 9 верасень 2023), а таксама пра творчасць іншых дзеячаў, як харавы дырыжор Інэса Бадзяка пра дырыжора Віктара Роўда («Віктар Роўда. Музыка, што нараджаецца праз спевы» № 4 красавік 2022).

Самымі нешматлікімі з'яўляліся інтэрв'ю з дзеячамі са сферы кіно, за перыяд, які даследуецца, было апублікавана 3 інтэрв'ю (1 за 2022, 2 за 2021) з захавальнікам Музея гісторыі беларускага кіно Ігарам Аўдзеевым («Дом, у якім жыве кіно» № 12 снежань 2022), рэжысёрам Дар'яй Юркевіч («Дар'я Юркевіч. Паспрабаваць розныя палітры» № 5 май 2020), дакументалістам Дзмітрыем Мехметам («Дзмітрый Мехмет. Галоўная задача» № 1 студзень 2020).

Інтэрв'ю публікуюцца ў рубрыках «У майстэрні», «Гутаркі на выставе», «Гутаркі з куратарам», «У грымёрцы» і інш., звычайна ў форме пытання-адказу, сустракаюцца інтэрв'ю ў форме маналога, напрыклад, інтэрв'ю з мастацкай кіраўніцай Дзяржаўнага камернага хору Рэспублікі Беларусь Наталляй Міхайлавай («Наталля Міхайлава. Жыццё ў шматгалоссі» № 2 люты 2022), з Народным артыстам Беларусі Ігарам Артамонавым («Ігар Артамонаў. Вытачаны і мужны» № 5 май 2022), рэстаўратарам Аляксандрам Лагуновічам-Чарапко («Рэстаўрацыя сёння» № 11 лістапад 2021).

Больш падрабязна і ўсебакова раскрываецца творчы шлях дзеячаў матсацтва, аналізуюцца адметнасць і ўнікальнасць створаных імі артэфактаў у матэрыялах жанру творчы партрэт. Такія публікацыі змяшчаюцца ў рубрыках «Культурны пласт», «Асоба», «Творчы партрэт», «Спадчына», усяго за перыяд з 2020 па красавік 2024 года іх было 65 пра мастакоў, дызайнераў, фатографаў, мастацтвазнаўцаў і пад, ім у часопісе аддаецца перавага. Значна менш аналізавалася творчасць тэатральных дзеячаў у 8 матэрыялах, у 16 – асоб, звязаных з музыкай, толькі 3 – з кіно. У творчых партрэтаў у часопісе

раўназначна аддаецца ўвага і біяграфічным звесткам, і аналізу творчасці, рэдка сустракаецца ўхіл у бок чагосьці аднаго, таму можна сказаць, што жанр прадстаўлены ў традыцыйным варыянце.

У 2024 годзе мастацтвазнаўца Барыс Крэпак распачаў праект «Яны змагаліся за Радзіму», дзе знаёміць з творцамі, якія прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Такіх матэрыялаў ужо выйшла 4: пра Аляксандра Мазалёва («Калі раны не загойваюцца» № 3 сакавік 2024), Івана Стасевіча («Як юны партызан Ваня Стасевіч стаў сынам палка» № 2 люты 2024), Міхаіла Зялёнкіна («Паветраны ас з почыркам мастака» № 1 студзень 2024), Сяргея Раманава («Мастакоўскі нататнік на сасновых галінках» № 4 красавік 2024). У іх асобая ўвага аддаецца дзейнасці мастакоў у час Айчыннай вайны, а таксама артэфактам, створаным у гэты час, уплыву гэтага перыяду на далейшую творчасць. У 2023 годзе выхадзіла манументальнае даследаванне творчасці Аляксандра Кішчанкі «Палітра, узвінчаная ў космас» у 5 нумарах часопіса. У 2020 выйшла два матэрыялы пра творчасць Яна Дамеля («Рэшткі мастацкай спадчыны Яна Дамеля» № 7 ліпень 2020, «Забытае імя» № 6 чэрвень 2020). У часопісе публікаваліся творчыя партрэты як сучаснікаў, так і «класікаў». Так, на старонках былі змешчаны творчыя партрэты пра фатографа Уладзіміра Цярэнцьева («Апанаваны фатаграфіяй» № 5 май 2023), графіка Анатоля Тачыны («Чароўны Мінск» № 9 верасень 2022), мастака Юдаля Пэна («Віцебскія росшукі» № 8 жнівень 2022), мастака Бялыніцкага-Бірулі («Жывапіс пераходных станаў» № 4 красавік 2022), мастака і крытыка Арона Касцялянскага («Самы культурны мастак Менска» № 6 чэрвень 2021), мастака Міхаіла Станюты («Міхаіл Станюта – мастак, педагог, функцыянер» № 9 верасень 2021).

Творчыя партрэты тэатральных дзеячаў з’яўляліся на старонках у 2023 (2 матэрыялы), 2022 (3 матэрыялы), 2021 (2 матэрыялы), 2020 (1 матэрыял). Так, аўтары звярталіся да творчасці прафесара Дзмітрыя Арлова («Успаміны дзеля будучыні» № 9 верасень 2023), балетмайстара Валянціна Елізар’ева («Метад Елізар’ева» №11 лістапад 2023), Народнага артыста СССР Леаніда Рахленка («Гонар нашага тэатральнага мастацтва» № 10 кастрычнік 2022), Народнага артыста СССР Здзіслава Стомы («Яго называлі акцёрам ад Бога» № 8 жнівень 2022), крытыка Віталя Вольскага («Асоба шматграннага таленту» № 9 верасень 2021), Народнага артыста Беларусі Рыгора Белацаркоўскага («Сфармуляваць свой лёс» № 8 жнівень 2020).

Тэмамі творчых партрэтаў у раздзеле «Музыка» (у 2024 – 1, 2023 – 2, 2022 – 4, 2021 – 5, 2020 – 4) былі жыццё і творчасць артысткі Ларысы Александроўскай («Прымадонна» № 2 люты 2024), кампазітара Уладзіміра Тэраўскага («Паўзабыты гонар беларускай культуры» № 1 студзень 2022), дырыжора Барыса Пенчука («Легендарны дырыжор» № 7 ліпень 2021),

кампазітара Андрэя Мдывані («Постаць» № 8 жнівень 2021), дырыжора Яраслава Вашчака («Яраслаў Вашчак. Залатая эпоха» № 5 май 2021) і інш. Творчыя партрэты дзеячаў, звязаных з кіно, з'яўляліся ў часопісе ўсяго 3 разы (2 у 2023, 1 у 2020), у тым ліку ў непастаяннай рубрыцы «Хто стварае кіно» пра дакументаліста Віктара Асалюка («Віктар Аслюк. У краі нашых песень» № 3 сакавік 2023), мастака-пастаноўшчыка Уладзіміра Чарнышова «Сам-насам з усімі» № 7 ліпень 2023.

У часопісе публікуюцца артыкулы, якія можна падзяліць наступным чынам. Першая група – мастацтвазнаўчыя артыкулы, у якіх падрабязна разбіраецца з'ява ці прадмет мастацтва на прафесійным узроўні, напрыклад, у матэрыяле «Жамчужыны Усходу» (№ 3 сакавік 2024) разглядаюцца тэхнікі, стылі традыцыйнага кітайскага і карэйскага выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва на прыкладзе работ, прадстаўленых на выставе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. За даследаваны перыяд былі размешчаны падобныя артыкулы толькі пра выяўленчае мастацтва («Фрэскі Спаса-Праабражэнскага храма» № 10 кастрычнік 2022, «Чорны квадрат Малевіча і ўзорачча беларускага арнаменту» № 10 кастрычнік 2022): у 2024 – 2, 2023 – 4, 2022 – 2.

Другая група – гістарычныя артыкулы. У раздзеле «Візуальных мастацтваў», напрыклад, разглядаліся гісторыя напісання і далейшы лёс карцін («Партрэт Людвікі Караліны з Радзівілаў» № 2 люты 2024), («Рэпетыцыя ў павеці» № 7 ліпень 2023), («Незабыўны вобраз паэта» № 11 лістапад 2022), («Выратаваныя каштоўнасці» №11 лістапад 2021), гісторыя Беларускага саюза мастакоў («Сэнс жыцця мастака – не памерці пасля смерці» № 12 снежань 2023) і Палаца мастацтва («З юбілеем, любімы» № 11 лістапад 2023), жыццё і творчасць мастакоў («Вучні Фердынанда Рушчыца з Беларусі» № 2 люты 2021, № 1 студзень 2021), («Зямля зачараваная» № 12 снежань 2021) і інш. Усяго такіх артыкулаў было апублікавана 12 (у 2024 – 2, 2023 – 4, 2022 2 2021 4). А таксама 9 у спецвыпуску за люты 2020 года да 100-гадовага юбілею мастацкага аб'яднання «УНОВІС» – «Супрэматыя новага. Маладыя і чыстыя», «Цытадэль мадэрнізму», «Танцавальная геаметрыя» і інш.

Артыкулаў, прысвечаных тэатру, было 12 (1 у 2024, 1 у 2023, 4 у 2022, 3 у 2021, 3 у 2020). Аўтары артыкулаў распавядалі пра прыватныя тэатры 18 стагоддзя («Прыдворныя тэатры Беларусі» № 2 люты 2024), гісторыю Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі («Вялікі: 90 — 60 — 90» № 5 май 2023), гісторыю Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа («Коласаўцы адзначаць юбілей» № 1 студзень 2022, № 12 снежань 2021), гісторыю Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі («Беларуская драматургія ў сэрцы Мінска» № 2 сакавік 2022), гісторыю Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы («Як пачынаўся Купалаўскі» № 9 верасень 2020, № 12 снежань 2020, № 11 лістапад 2020). У

раздзеле «Музыка» было размешчана 9 артыкулаў (1 у 2023, 2 у 2022, 3 у 2021, 3 у 2020), як «Старонкі памяці» (№ 4 красавік 2022) пра гісторыю Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, а таксама цыкл артыкулаў Віктара Сямашкі пра беларускі музычны андэграўнд 1960-1970-х. («Пане-браце» № 4 красавік 2022, «Залатыя яблыкі сонца» № 2 люты 2022, «Беларускі андэграўнд 1960-1970-х.» № 9 верасень 2021, № 3 сакавік 2021, № 1 студзень 2021, № 9 верасень 2020, № 10 кастрычнік 2020). Кіно за даследаваны перыяд прысвяцілі толькі адзін артыкул у 2024 годзе –«Прысвячэнне мастацтву кіно» № 4 красавік 2024 – пра гісторыю беларускага кіно.

Больш таго, можна выдзеліць музейную тэматыку, у такіх матэрыялах змяшчаюцца звесткі пра гісторыю саміх музеяў і іх экспанатаў. Прапанаваная тэматыка асвятлялася ў 8 матэрыялах (у 3 у 2024, 1 у 2023, 2 у 2022, 1 у 2021, 4 у 2020), былі разгледжаны здабыткі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка («Музейны горад» № 9 верасень 2023), філіяла Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея («Выратаваныя каштоўнасці» № 8 жнівень 2022), Уздзенскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея («Уздзенскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей» № 12 снежань 2020), Мастацкага музея імя Вітольда Каэтанавіча Бялыніцкага-Бірулі ў горадзе Бялынічы («Музей у Бялынічах» № 10 кастрычнік 2020), Бабруйскага мастацкага музея («Бабруйскі мастацкі музей» № 9 верасень 2020).

Таксама да гэтай катэгорыі можна было аднесці рубрыку «In design» Алы Пігальскай, аднак у матэрыялах змешчаны не толькі гістарычныя, але мастацтвазнаўчыя звесткі, таму артыкулы хутчэй навукова-папулярныя. Аўтар разглядае беларускі графічны дызайн у кантэксце рэгіянальнага дызайну згодна з працэсамі, што адбываюцца пад уплывам каштоўнасцей таго ці іншага рэгіёна. Так, у 25 артыкулах (2 у 2022, 12 у 2021, 11 у 2020) разглядаліся тэмы беларускага шрыфту («Найлепшыя словы – нашы інтанацыі» № 7 ліпень 2021), ілюстрацый да паэмы «Пан Тадэвуш» Адама Міцкевіча («Дуга самавызначэння» № 8 жнівень 2021), спорту ў агітацыйных, рэкламных і сацыяльных плакатах («Вайна мінус забойства» № 6 чэрвень 2021), дызайну вырабаў завода «Нёман» у 1920-1930-я («Рысы на тле, зморшчыны на паверхні і плыні ў глыбіні» № 1 студзень 2022), інтэрнацыянальнага мадэрна і нацыянальныя матывы ў вырабах завода «Нёман» 1980-х («Гісторыя і яе знакі» № 2 люты 2022), дызайну выданняў у авангарднай эстэтыцы («Дуга самавызначэння» № 5 май 2021), а таксама агульнай гісторыі беларускага графічнага дызайну («Нацыянальная гісторыя графічнага дызайну» № 9 верасень 2020).

Трэцяя група – праблемныя артыкулы. У гэтай катэгорыі аўтарамі абмяркоўваліся праблемы ў сферы тэатра, мастацтва (5 матэрыялаў) і кіно (2 матэрыялы). Яўгенія Шыцька ў артыкуле «Новы-новы: год ці спектакль?» (№

2 люты 2024) ставіла пытанне якасці спектакляў для малодшага ўзросту, апісвала і аналізавала праграму дзённых спектакляў для школьнікаў на канікулах, а таксама былі прадстаўлены разважанні пра мастацкі ўзровень пастасянных і сезонных спектакляў, тэндэнцыі тэатральнага жыцця, гістарычныя звесткі, погляд у будучыню. У артыкуле «Выклікі новай рэальнасці» (№ 7 ліпень 2020) аўтар Жана Лашкевіч разважае пра наступствы пандэміі для тэатраў Беларусі, дзеліцца меркаваннем сваім, а таксама прадстаўнікоў абласных драматычных тэатраў.

У матэрыялах пра выяўленчае мастацтва аўтары прадстаўляюць экспертнае меркаванне наконт тэндэнцый і тэхналагічных распрацовак, што ўплываюць на сферу мастацтва. Дзмітрый Падбярэзскі ў сваім артыкуле «Таямніца NFT» (№ 6 чэрвень 2022) разглядае новую на той момант з’яву «NFT», яе магчымы ўплыў на куплю-продаж прадметаў мастацтва. Артыкул «Двайная прастора» (№ 2 люты 2022) – даследаванне праблемы духоўнага зместу ў сучасным мастацтве, аўтар Аляксандр Малей прасочвае сувязі і супярэчнасці паміж прасторай, формай аб’ектнага мастацтва і духоўнай свядомасцю. Пастаўленая аўтарам артыкула праблема разглядаецца ў дынаміцы, ён не проста прыводзіць факты з гісторыі мастацтва XX стагоддзя, а аналізуе іх, робіць высновы пра ўплыў рэвалюцыйных адкрыццяў і прадстаўленняў авангардыстаў, трансфармацыю новых поглядаў і іх сучасны выгляд. У артыкулах «Нэт-атр – агульны план» (№ 8 жнівень 2020), «Музеефікацыя лічбавага мастацтва: інстытуты, калекцыі, вопыт, кансервацыі» (№ 6 чэрвень 2020) Кацярына Калянкевіч усебакова разглядае становішча «лічбавага мастацтва» і робіць свой прысуд: «Сеткавае мастацтва музеефікуецца, рэстаўрыруецца і не выклікае спрэчак аб правамернасці яго існавання, яно звыклае нават для галерэйнай прасторы і не з’яўляецца «гурманскім». Ужо зразумелыя механізмы ўзаемадзеяння з такім мастацтвам messag. Дастатковае сведчанне гэтаму – постінтэрнет-мастацтва».

Толькі два артыкула пра кіно напісаў у 2020 годзе Антон Сідарэнка. У матэрыяле «А хто там ідзе?» (№ 9 верасень 2020) аўтар разглядаў беларускае кіно ў кантэксце нацыянальнага міфа, у публікацыі «Мы з мінулага» (№ 4 красавік 2020) – адметнасці і магчымасці беларускага гістарычнага кіно.

Для часопіса «Мастацтва» характэрна вядзенне рубрык асобнымі аўтарамі, дзе яны прапануюць свае эсэ і замалёўкі. Так, у раздзеле «Музыка» выходзіла аўтарская рубрыка «Асабісты кабінет Дзмітрыя Падбярэзскага», дзе публікаваліся невялікія нататкі на самыя розныя тэмы, іх было 23 у 2022 годзе, 27 у 2021, 22 у 2020. У раздзеле «Тэатр» змяшчаліся «Тэатральныя байкі ад Вергунова» – гумарыстычныя замалёўкі пра тэатр (17 у 2022, 83 у 2021, 72 у 2020).

У 2021 годзе выходзіла рубрыка «Слоўнік» Любові Гаўрылюк. Увесь год у кожным нумары (усяго 12) у матэрыялах накшталт «Словы снежня», «Словы чэрвеня» і пад. прыводзілася падборка слоў і паняццяў, напрыклад, «дотык», «брутaлізм», «гібрыды», «ядомае», «мужчына-муза», «апакаліптычнае». Самі словы даволі абстрактныя на першы погляд, але яны з’яўляюцца падставай да прыкладаў аўтара і яе разважанняў. Так, публіцыст можа прыгадаць былыя ці актуальныя выставы, буйныя здзелкі продажу прадметаў мастацтва, перфомансы, і г.д., што маюць дачыненне да абранага слова, а можа разважаць наконт спрэчных пытанняў. Напрыклад, у матэрыяле «Словы ліпеня» (№ 7 ліпень 2021) Любоў Гаўрылюк раскрывае сваё бачанне «вандалізму» ў мастацтве і па сутнасці прыраўноўвае акт вандалізму над «Данаяй» Рэмбрандта, калі карціну аблілі кіслатой, да феномену графіці і муралаў. Усе матэрыялы «Слоўніка» падмацаваны фактамі з гісторыі мастацтва і тэрмінамі, у іх ярка праяўлены аўтарскі стыль, па сутнасці аўтар выражае сваё меркаванне з дапамогай аргументаў і ацэначных суджэнняў, не абмінае выкарыстанне іроніі: «Усё больш незразумелага нас акружае, калі не думаць і не чытаць нічога складнейшага за меню ў піцэрыі» («Словы кастрычніка» № 10 кастрычнік 2021).

У рубрыцы «Згадалася» Уладзімір Сцяпан прыводзіць свае ўспаміны пра мастакоў, у якіх навучаўся ці з якімі працаваў. Усяго выйшла 15 эсэ (1 у 2023, 9 у 2022, 5 2021) пра мастакоў Зою Літвінаву, Алега Луцэвіча, Альгерда Малішэўскага, Святлану Каткову, Алега Хадыку і інш. Аўтар выкарыстоўвае вялікую колькасць сродкаў мастацкай выразнасці, маўленне вобразнае, праяўлены аўтарскі стыль, асабліва калі апісваюцца працы мастака. «На вокладцы – прывабны блакітна-зялёны краявід «Ільны беларускія», які напісаў Віктар Грамыка ў 1969 годзе. Гэтае ж палатно альбом і завяршала… Вось блакітна-зялёны краявід мяне ўразіў. Сёння я разумею, што менавіта ён зрабіў мастаку імя. У ім, у звычайным краявідзе, як у кроплі вады, адлюстроўваюцца ўсе будучыя, на той час яшчэ не створаныя краявіды і Карціны Віктара Грамыкі» («З вышыні птушынага палёту» № 1 студзень 2023). «Чорна-чырвоная карціна гарыць, як шкло вітража ў саборы. Зіхціць, пераліваецца, хвалюе і трывожыць. Поле. Макі. У кветках маладая жанчына. Яна плача, твар закрывае далонямі. Вакол палымнеюць чырвоныя кветкі. Фантастычны твор. Нерэальная выразнасць. Шэдэўр!» («Фантастычны сад» № 9 верасень 2022).

Таксама падобныя эсэ пра дзеячаў мастацтва пісалі Пётра Васілеўскі, Вячаслаў Іваноўскі ў рубрыках «Памяць», «In memoriam» з нагоды юбілеяў, гадавіны з даты нараджэння, смерці і пад., напрыклад, пра этнографа Міхася Раманюка («Асветніцкая мэта жыцця» № 1 студзень 2024), скульптара Уладзіміра Жбанава («У адным шэрагу з мэтрамі» № 3 сакавік 2024), мастака Уладзіміра Лукашыка («Не мяжа, а далягляд» № 11 лістапад 2023). Такіх

матэрыялаў было 5, таксама з'явіўся некралог Барыса Крэпака «Для мяне самае святое – Радзіма, сям'я, дома…» (№ 3 сакавік 2023) на смерць драматурга Аляксея Дударава.

У беларускага фатографа Юрыя Іванова ў рубрыцы «Стоп-кадр» выйшла 4 матэрыялы ў 2022 годзе пра гісторыю стварэння яго знакамітых здымкаў, напрыклад, фотаздымка ансамбля «Песняры» на тройках у Мсціслаўле. («Мулявін і «Песняры» на тройках» № 5 май 2022).

**ВЫВАДЫ ПА ГЛАВЕ 3**

Як паказала даследаванне, за перыяд з 1 студзеня 2020 года па 1 мая 2024 года жанравымі дамінантамі газеты «Літаратура і мастацтва» з'яўляюцца анонсы, нататкі, інтэрв'ю, артыкулы, мастацкія і літаратурныя рэцэнзіі. Можна адзначыць, што выданне добра інфармуе пра падзейны пласт культурнага жыцця грамадства, анансуе выхад новых артэфактаў, спрыяе захаванню і папулярызацыі культурнай спадчыны, але асваенне артэфактаў з дапамогай мастацкай крытыкі адбываецца няякасна. Можна сцвярджаць, што тэматычнымі дамінантамі ў газеце «Літаратура і мастацтва» з'яўляюцца культурныя падзеі (пленумы, фестывалі, канферэнцыі, святкаванні, канцэрты, творчыя сустрэчы і пад.), а таксама прэзентацыі непасрэдна твораў мастацтва – арыгінальных твораў (больш за ўсё паэтычных), выдадзеных кніг, спектаклей, выстаў і г.д. Трэба азначыць, што ўдзяляецца ўвага як сучаснаму мастацкаму працэсу, так і здабыткам мінуўшчыны, культурнай спадчыне.

Па выніках даследавання, у часопісе «Мастацтва» аддаецца перавага аналітычным матэрыялам – рэцэнзіям, творчым партрэтам, артыкулам. Нават падзейны пласт жыцця грамадства асэнсоўваецца з дапамогай агляду. У часопісе не закранаецца літаратура як від мастацтва, затое дамінуюць такія плыні, як выяўленчае мастацтва і тэатр. За апошнія 4 гады аўтары сталі радзей звяртацца да аналізу кінастужак, як беларускіх, так і замежных. У выданні публікуюцца творчыя партрэты як сучасных, так і гістарычных дзеячаў мастацтва; вялікая колькасць рэцэнзій на выставы мінскіх галерэй і спектаклі сталічных і рэгіянальных тэатраў, а таксама гістарычныя артыкулы, у якіх у роўнай ступені згадваюцца ўсе віды мастацтва.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У выніку даследавання было ўстаноўлена, што тэма культуры заўсёды была важнай часткай зместу перыядычных выданняў, а ў XX стагоддзі адбыўся даволі стабільны падзел друкаваных перыядычных выданняў на грамадска-палітычныя (грамадскія) і спецыялізаваныя.

Першым спецыялізаваным выданнем для літаратараў стаў часопіс «Полымя», які пачаў выдавацца ў 1922 годзе, пазней з’явіліся часопісы, «Маладняк», «Узвышша», «Нёман», «Маладосць». Газета «Літаратура і мастацтва» была заснавана ў 1932 годзе для паслядоўнага і сістэмнага асвятлення працэсу развіцця культуры, кансалідацыі творчай моцы краіны, прасоўвання беларускай мовы, здабыткаў культуры. З 1990-х гадоў назіраецца крызіснае становішча культурна–асветніцкіх выданняў, а літаратурна-мастацкай крытыкі ў прыватнасці (яшчэ з 1980-х).

Даследаванне паказала, што на сучасным этапе развіццё культурнай журналістыкі ідзе па вектары мабільнай «арт-журналістыкі», якая вызначаецца асвятленнем у СМІ падзей, фактаў мастацкага жыцця, дзе матэрыял падаецца ў любых жанрах і формах. Пры гэтым аналіз зведзены да мінімуму, мае месца камерцыйны падыход і моцная пазіцыя аўтарскага «я». Ужо ў гэтай парадыгме развіваюцца «Культура» і часопіс «Мастацтва», якія з’явіліся значна пазней, чым «Літаратура і мастацтва» і «Полымя».

Было высветлена, што тэатр, музыка, кіно, мастацтва і літаратура з’яўляюцца дамінантнымі плынямі сучаснай беларускай арт-журналістыкі. Артэфакт – твор мастацтва, які мае духоўнае значэнне. Ён разам з культурнай падзеяй з’яўляецца тэмай публікацый у арт-журналістыцы. А тэматычнымі дамінантамі выданняў становяцца тыя, што маюць найбольшую грамадскую значнасць і часцей за ўсё ўзнаўляюцца на старонках СМІ.

Было вызначана, што жанравая дыферэнцыяцыя ўнутры арт-журналістыкі абумоўлена пяццю напрамкамі культурнай праблематыкі:

1. Падрыхтоўка і прэзентацыя артэфакта грамадству, у гэтым выпадку разглядаюцца два жанры – анонс і анатацыя.
2. Раскрыццё падзеі як часткі культурнага жыцця грамадства ажыццяўляецца ў інфармацыйных жанрах, такіх як нататка, інтэрв’ю, рэпартаж, некралог.
3. Асваенне артэфакта грамадствам, для гэтага прызначана літаратурна–мастацкая крытыка. У гэтай плыні вылучаюць тэатральную, мастацкую, літаратурную, музычную крытыку, кінакрытыку. Крытыка існуе ў асноўным у такіх жанравых формах, як рэцэнзія, агляд, артыкул, творчы партрэт.

4. Актуалізаванне неабходнасці выкарыстання артэфакта, базавым жанрам у дадзенай плыні з’яўляецца культурна-гістарычны нарыс.

5. Непасрэднае знаёмства (без меркаванняў і ацэнак літаратурных крытыкаў) з сучасным літаратурным працэсам у поўнай меры адбываецца з дапамогай публікацыі арыгінальных твораў мастацкай літаратуры.

Як паказала даследаванне, тэксты арт-публікацый пішуцца ў публіцыстычным стылі, якому ўласцівы шырокае выкарыстанне грамадска-палітычнай лексікі, эмацыянальна-ацэначнай лексікі; аўтарскіх неалагізмаў інш.;функцыянаванне ўсіх тыпаў сказаў; вялікай колькасці экспрэсіўных канструкцый. Таксама прысутнічаюць элементы навуковага стылю (тэрміны і кніжная лексіка). Кожнаму жанру будзе ўласціва розная ступень праяўлення аўтарскага «я». Было ўстаноўлена, што літаратурна-мастацкая крытыка як важная частка культурнай журналістыкі на сучасным этапе развіцця мае свае асаблівасці, якія лепш за ўсё прасочваецца ў стылі рэцэнзіі. Як паказала даследаванне, за перыяд з 1 студзеня 2020 года па 1 мая 2024 года самымі папулярнымі жанрамі ў газеце «Літаратура і мастацтва», з’яўляюцца анонсы, нататкі, інтэрв’ю, артыкулы, мастацкія і літаратурныя рэцэнзіі, таксама ў газеце друкуецца вялікая колькасць вершаваных і празаічных твораў беларускіх пісьменнікаў, перакладаў замежных твораў на беларускую мову. Тэматычнымі дамінантамі з’яўляюцца культурныя падзеі, анонсы выхаду новых артэфактаў. Асваенне артэфактаў з дапамогай літаратурна-мастацкай крытыкі адбываецца няякасна: рэцэнзію ў большасці замяняе «прэзентацыя» твораў мастацтва – пераказ зместу твора, часам з уражаннямі (як правіла, хвалебнымі) і часта з рэкламным падтэкстам. Нязначная колькасць крытычных матэрыялаў на творы музыкі, тэатра і кіно можа сведчыць пра неактыўнасць, г.зн. адсутнасць новых артэфактаў, у гэтых плынях мастацтва. З іншага боку, можна дапусціць, што менавіта ў дадзеных плынях слаба развіта крытычная школа: няма вопытных рэцэнзентаў, у якіх можна вучыцца, ці няма каму вучыцца і г.д.

У часопісе «Мастацтва» часцей за ўсё звяртаюцца да аналітычных жанраў, такіх, як рэцэнзія, творчы партрэт, артыкул і агляд. Дамінантнымі тэмамі з’яўляюцца выяўленчае мастацтва і тэатр, літаратура не закранаецца ўвогуле.

Так, у выданні пераважваюць тэмы жыцця і творчасці мастакоў, акцёраў, аналізу выстаў членаў Беларускага саюза мастакоў, прэм’ерных спектакляў сталічных і абласных тэатраў. Таксама на старонках выдання часта публікуюцца гістарычныя артыкулы, у якіх у часта не проста прадстаўляюцца хранікальныя звесткі, а асэнсоўваюцца падзеі і тэндэнцыі мінуўшчыны, іх уплыў на сучаснасць

Сёння ў арт-журналістыцы назіраецца адыход у бок інфармацыйнасці, галоўны метад такой журналістыкі – назіранне. Многія публікацыі, якія друкуюцца ў раздзеле «крытыка», складана аднесці да гэтага напрамку, яны адносяцца да маскультавай журналістыкі. Сучасны крытык не заўсёды ўлічвае, што напісаць рэцэнзію ці артыкул, не выкарыстоўваючы адпаведны функцыянальна-сэнсавы тып маўлення, немагчыма, паколькі стылістыка тэксту цесна звязана з жанралогіяй.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Багамолава, А.М. Стылістыка і культура беларускага маўлення: вучэбны дапаможнік /А.М. Пісарэнка, Г.К. Семянькова. – Мінск: 2011. – 316 с.
2. Багданава Г.Б. Вобразы ўспрымання і асэнсавання ў сучаснай арт-журналістыцы. В: Дубовик С.В., рэдактар. Журналістыка-2008: стан, праблемы і перспектывы. Матэрыялы X Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі; 11–12 снежня 2008 г.; Мінск, Беларусь. Мінск: БДУ; 2008. с. 361–363.Бекасов, Д.Г. Корреспонденция, статья – жанры публицистики / Д.Г. Бекасов. – М., 1972. – 76 с.
3. Багданава Г.Б. З гісторыі мастацкай крытыкі / Г.Б. Багданава // Виды литературно-художественной критики: опыт историко-теоретического обзора : сб. науч. ст. / под. общ. ред. Л.П. Саенковой. – Мн.: БГУ, 2005. – 138 с.
4. Бекасов, Д.Г. Корреспонденция, статья – жанры публицистики / Д.Г. Бекасов. – М., 1972. – 76 с.
5. Бондарева, Е.Л. Белорусская кинокритика: зарождение и становление (20-90-е гг.) / Е.Л. Бондарева // Виды литературно-художественной критики: опыт историко-теоретического обзора : сб. науч. ст. / под. общ. ред. Л.П. Саенковой. – Мн.: БГУ, 2005. – 138 с.
6. Бондарева, Е.Л. Освещение литературы и искусства в СМИ/ Е.Л. Бондарева, Минск: БГУ, 2004, - 117 с.
7. Выровцева, Е.В. Культура и журналистика: эволюция взаимоотношений / Е. В. Выровцева // Время. Искусство. Критика : сб. науч. тр. Вып. 2 / Белорус. гос. ун-т ; редкол. : Л. П. Саенкова [и др.]. – М. : БГУ, 2010. – С. 36–41
8. Гаранина, Н.С. О стиле литературно-художественной критики / Н. С. Гаранина // Стилистика газетных жанров : сб. науч. ст. / под. общ. ред. Д. Э. Розенталя. – М. : Изд-во МГУ, 1981. – 229 с.
9. Гуревич, С.М. Репортаж в газете : лекция для студентов вечернего и заоч. отд-ний Фак. журналистики / Моск. ордена Ленина и ордена Трудового Красного Знамени гос. ун-т им. М. В. Ломоносова. Фак. журналистики. – М., 1963. – 33 с.
10. Дубровский, А.В. Современная литературная рецензия как результат жанрово-стилистических трансформаций (на материале публикаций в еженедельнике «Літаратура і мастацтва») // Медиалингвистика. 2017. № 2 (17). С. 55–64.

11. Жданова, Е.Ю. Рекламный текст как объект лингвистического исследования / Е.Ю. Жданова // Вектор науки ТГУ. 2015. – № 2. – С. 82 – 85
12. Зданович, Т.В. Прямая речь и диалог в газетном репортаже / Т. В. Зданович // Культура мовы журналіста: зб. навук. артыкулаў / пад рэд. М. Я. Цікоцкага, А. І. Наркевіча. – Мінск : Універсітэцкае, 1986. – 97 с.
13. Іўчанкаў, В.І. Медыярыторыка : рытарычныя асновы журналістыкі, лінгвістыка публіцыстычнага тэксту, дыскурсны аналіз сродкаў масавай інфармацыі : курс лекцый / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 280 с.
14. Карпилова, А.А. Из истории музыкальной критики / А.А. Карпилова // Виды литературно-художественной критики: опыт историко-теоретического обзора : сб. науч. ст. / под. общ. ред. Л.П. Саенковой. – Мн.: БГУ, 2005. – 138 с.
15. Карпилова, А.А. Музыкальная критика в пространстве культуры / А.А. Карпилова // Сучасныя тэндэнцыі літаратурна-мастацкай крытыкі: тэорыя, практычны вопыт / Е. Л. Бондарава, Т. Д. Арлова, Л. П. Саянкова і інш. - Мн.: БДУ, 2002. – 114 с.
16. Колядич, Т.М., Капица, Ф.С. Русская проза XXI века в критике: рефлексия, оценки, методика описания : учебное пособие / Т. М. Колядич, Ф. С. Капица. – Москва : Флинта : Наука, 2010. – 357 с.
17. Красней, В.П. Тэміны на старонках газет / В. П. Красней // Культура мовы журналіста: зб. навук. артыкулаў / пад рэд. М. Я. Цікоцкага, А. І. Наркевіча. – Мінск : Універсітэцкае, 1986. – 97 с.
18. Крикунов, Ю. Рецензия в газете / Ю. Крикунов. – М., 1975. С. 3–5.
19. Крылов, В.Н. Русская литературная критика: прблемы, теории, истории и методики изучения: монография / В.Н. Крылов. – М.: Флинта: Наука, 2016. – 240 с.
20. Кузьміч, Н.В. Прафесійная беларуская крытыка: этапы станаўлення і развіцця / Н.В. Кузьміч // Виды литературно-художественной критики: опыт историко-теоретического обзора : сб. науч. ст. / под. общ. ред. Л.П. Саенковой. – Мн.: БГУ, 2005. – 138 с.
21. Кусянкоў, М.С. Нататкі пра стыль інтэрв'ю / М. С. Кусянкоў // Культура мовы журналіста: зб. навук. артыкулаў / пад рэд. М. Я. Цікоцкага, А. І. Наркевіча. – Мінск : Універсітэцкае, 1986. – 97 с.
22. Лазутина, ГВ. Жанры журналистского творчества: Учеб. пособие для студентов вузов: учеб. пособие / Г.В. Лазутина, С.С. Распопова. — Электрон. дан. — Москва : Аспект Пресс, 2012. — 320 с.
23. Лебедева, М.Л. Культурная проблематика в региональных СМИ Рэгіянальныя СМІ Рэспублікі Беларусь у лічбавую эпоху: ад лакальнай

праблематыкі да інфармацыйнай бяспекі дзяржавы: матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 24 чэрв. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. М. Самусевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2021. – С. 144-147.
24. Мороз, Л.Е. Интервью: стилистика вопросов и ответов / Л. Е. Мороз // Культура мовы журналіста: зб. навук. артыкулаў / пад рэд. М. Я. Цікоцкага, А. І. Наркевіча. – Мінск : Універсітэцкае, 1986. – 97 с.
25. Новикова, А.А. Арт-журналистика в современной медиасреде: между пиаром и перформансом/А.А. Новикова, Век информации. 2018. № 2 С. 85–86.
26. Орлова, Т.Д. Из истории театральной критики / Т. Д. Орлова // Виды литературно-художественной критики: опыт историко-теоретического обзора: сб. науч. ст. / под. общ. ред. Л.П. Саенковой. – Мн.: БГУ, 2005. – 138с.
27. Орлова, Т.Д. Принципы рецензирования произведений искусства в СМИ / Т. Д. Орлова // Произведение искусства – предмет анализа критика : сб. науч. тр. Вып. 1 / под. ред. Т.Д. Орловой. – Минск : БГУ, 2009. – 116 с.
28. Орлова, Т.Д. Театральная журналистика. Часть I. Минск: БГУ; 2001. 145 с.
29. Орлова, Т.Д. Театральная критика на современном этапе. Белорусский вариант / Т. Д. Орлова // Сучасныя тэндэнцыі літаратурна-мастацкай крытыкі: тэорыя, практычны вопыт / Е. Л. Бондарава, Т. Д. Арлова, Л. П. Саянкова і інш. - Мн.: БДУ, 2002. – 114 с.
30. Петрова, С.С. Тематические доминанты регионального медиаполя / С.С. Петрова // Вестн. Новг. гос. ун-та, 2013. – 155 с. – (Серия «Гуманитарные науки» ; № 73).
31. Саенкова, Л.П. Особенности жанра интервью в литературно-художественной критике / Л.П. Саенкова // Сучасныя тэндэнцыі літаратурна-мастацкай крытыкі: тэорыя, практычны вопыт / Е. Л. Бондарава, Т. Д. Арлова, Л. П. Саянкова і інш. - Мн.: БДУ, 2002. – 114 с.
32. Саенкова, Л.П., Сидоренко А.В. Из истории кинокритики / Л.П. Саенкова, А.В. Сидоренко // Виды литературно-художественной критики: опыт историко-теоретического обзора : сб. науч. ст. / под. общ. ред. Л.П. Саенковой. – Мн.: БГУ, 2005. – 138 с.
33. Сальникова, О.А. Риторические основы создания газетных жанров (жанры: рецензия, обзор) / О.А. Сальникова // Риторические основы журналистики. Работа над жанрами газеты: учеб. пособие / Смелкова З.С., Ассуирова Л.В., Савова М.Р., Сальникова О.А. – М.: Флинта: Наука, 2003.
34. Самусевіч, В.М. Культурная журналістыка ў прасторы нацыянальнай культуры / В. М. Самусевіч // Журналистика. Искусство. Критика. Материалы научно-практической конференции, посвященной 85-летию со дня рождения доктора филологических наук, профессора, заслуженного

деятеля науки Республики Беларусь Е. Л. Бондаревой. – Минск: БГУ, 2008. – 91 с. – С. 23–25.
35. Сергеева, Т.С. Арт-журналистика и современная российская культура / Т.С. Сергеева // Вестник Челябинского государственного университета. Выпуск № 22 (313). - 2013.
36. Слука, А.Г. Беларуская журналістыка : падручнік / А. Г. Слука. – Мінск : БДУ, 2011. – 447 с.
37. Слука, А.Г. Беларуская журналістыка (1918–1941 гг.) : вучэб. метад. комплекс / А. Г. Слука, Н. А. Зубчонак. – Мінск : БДУ, 2015. – 191 с.
38. Солганик, Г.Я. Лексика газеты / Г. Я. Солганик. – М.: Высш. школа, 1981. – 112 с.
39. Солганик, Г.Я. О языке газеты: Учеб.-метод. пособие для студентов-заочников фак. и отд-ний журналистики гос. ун-тов / Г. Я. Солганик. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1968. – 48 с.
40. Солганик, Г.Я. Стилистика текста: учеб. пособие / Г. Я. Солганик. – М.: Флинта, Наука, 2013.-256 с.
41. Стилистика и литературное редактирование: учебник для студентов вузов, обучающихся по гуманитарным специальностям / В. И. Максимов [и др.]; под ред. В. И. Максимова. - 3-е изд., перераб. и доп. – М.: Гардарики, 2007. – 653 с.
42. Тачыцкая, Н.А. Арт-журналістыка як паняцце і від творчай дзейнасці / Н. А. Тачыцкая. – Минск : Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика = Journal of the Belarusian State University. Journalism and pedagogics. - 2019. - № 2. - С. 57-63
43. Тертычный, А.А. Жанры периодической печати: учебное пособие. — М.: Аспект Пресс, 2000
44. Тычко, Г.К. Літаратурна-мастацкая крытыка на старонках часопіса «Полымя»: жанрава-тэматычнае абнаўленне / Г. К. Тычко // Журналістыка – 2019: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 21-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 15–16 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т : рэдкал.: В. М. Самусевіч [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 206 – 211.
45. Ушакова, С.В. Культурная проблематика в сетевых районных изданиях Белгородской области / С. В. Ушакова, И. Ю. Боганчикова. // Молодой ученый. — 2020. — № 5 (295). — С. 353-355.
46. Фролова И.В. Мастерство литературного критика: учеб. пособие / И.В. Фролова. Улан-Удэ: Издательство Бурятского госуниверситета, 2010. – 86 с.
47. Цікоцкі, А.М. Стылістыка газетных жанраў. Вучэбны дапаможнік / Склад. А. М. Цікоцкі - Мн.: БДУ, 2002. – 24 с.

48. Цікоцкі, М.Я. Стылістыка публіцыстычных жанраў: вучэбны дапаможнік для спецыяльнасці «Журналістыка» вышэйшых навучальных устаноў / М. Я. Цікоцкі. — Мінск : Вышэйшая школа, 1971. — 288 с.
49. Цікоцкі, М.Я. Стылістычныя асаблівасці газетных жанраў. Заметка і рэпартаж / М. Я. Цікоцкі // Культура мовы журналіста: зб. навук. артыкулаў / пад рэд. А. І. Наркевіча, М. Я. Цікоцкага. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 120 с.
50. Шмелёва, Т.В. Дискурс и исследовательский инструментарий медиалингвистики / Т.В. Шмелёва // Научные ведомости Белгородского гос. университета, 2012. – 231 с. – (Серия «Гуманитарные науки» ; № 18)